Сяргей Ёрш

# Вяртаньне БНП

## Асобы і дакумэнты Беларускай Незалежніцкай Партыі

KAMUNIKAT.org

Менск-Слонім
Архіў Найноўшае Гісторыі
1998

## П О Ў Н А Я  К А Р Ц І Н А

Дасьледчыкі, якія вывучаюць гісторыю паваеннага антысавецкага Супраціву ў Беларусі, сутыкаюцца са складанаю задачай, бо яны пазбаўленыя магчымасьці працы зь вельмі важным корпусам крыніц — архівамі КГБ, якія з 1995 году ў Беларусі зноў вярнуліся да свайго нармальнага прыроднага стану — абсалютнай закрытасьці для грамадзкасьці. Праўда, часам асобныя факты і сэнсацыйныя зьвесткі са сховішчаў КГБ прасочваюцца на старонкі афіцыйнай (так называюць у Беларусі дзяржаўныя мэдыі, якія ўсе зноў сталі падлягаць вельмі жорсткай цэнзуры) прэсы. Але перад гэтымі публікацыямі (некаторыя зь іх названыя ў гэтай кніжцы) стаяць вельмі простыя прапагандысцкія задачы — вдпаведна адбываецца падбор фактаў і даюцца прадказальныя інтэрпрэтацыі. Праўда, аднойчы я спаймаў сябе на дуіцы, што праз свае відавочныя ідэалагічныя задачы гэтыя публікацыі ў выніку працуюць супраць сябе — бо агучваюць для шырокай публікі саму тэму антысавецкага беларускага Супраціву і выцягваюць з патаемных сховішчаў цікавую фактуру.

Гісторыкі, якія паводле ідэалагічных прычынаў ня маюць доступу да архіваў КГБ, больш увагі надаюць іншым крыніцам — прыватным успамінам і эміграцыйным друкаваным крыніцам. Мэтадалягічна гэта вельмі цікава, бо часам вусныя крыніцы могуць даць больш за пісьмовы дакумэнт: вусныя крыніцы пазбаўленыя фармалізацыі пісьмовых і перадаюць міжасабовыя адносіны.

Аўтар кнігі пра Беларускую Незалежніцкую Партыю Сяргей Ёрш ужо ня першы год зьбірае ўспаміны пра антысавецкі Супраціў. Праз сыстэматызацыю і публікацыю ўспамінаў аўтар уводзіць ва ўжытак новыя крыніцы. Больш шырока, чым іншыя гісторыкі, якія публікуюць свае працы, Сяргей Ёрш карыстаецца эміграцыйнымі пэрыёдыкамі.

Улічым, што эміграцыйныя крыніцы могуць перадаваць інфармацыю таксама суб’ектыўна, зважаючы на палітычны падзел у беларускай эміграцыі. Апроч таго, для беларусаў у выгнаньні была патрэба прыцягнуць большую ўвагу Захаду да падзей у Беларусі. Часам удакладненьня патрабуюць ня самі факты падзеяў, а іх маштабы. Яшчэ адзін фактар закрытасьці інфармацыі — канспірацыя.

Такім чынам, поўную карціну гістарычных падзеяў мы можам атрымаць у выніку вэрыфікацыяў трох відаў крыніцаў — архіўных, вусных, эміграцыйных. Таксама ёсьць патрэба працы з дакумэнтамі заходніх спэцслужбаў. Сяргей Ёрш праводзіць параўнаўчы аналіз сьведчаньняў, адкідае зусім сумніўныя. Але голад на дакумэнты мы ўсё яшчэ доўга будзем адчуваць.

Тэма паваеннага Супраціву ставіць і іншыя праблемныя пытаньні — калябарацыі, каляніяльнай палітыкі савецкіх уладаў, беларускага Рэзыстансу ў шырокім кантэксьце (ад 20-х гадоў да 50-х).

Трымаючы ў руках том пад назваю Вяртаньне БНП, мы маем перад сабою кнігу, дзе ўпершыню ў Беларусі сабраная ды сыстэматызаваная інфармацыя пра Беларускую Незалежніцкую Партыю, уведзеныя ва ўжытак новыя крыніцы пра гэтую арганізацыю-лідэра антысавецкага Супраціву. Ведаючы настойлівасьць аўтара не сумняюся, што Архіў Найноўшае Гісторыі зможа надалей прапанаваць грамадзкасьці новыя зьвесткі і дасьледаваньні па гісторыі беларускага Рэзыстансу.

**Алег Дзярновіч,**
дырэктар Архіву Найноўшае Гісторыі

## А Д А Ў Т А Р А

Заканчваецца стагодзьдзе, ужо ідзе восьмы год пасьля аднаўленьня незалежнасьці Беларусі, але да гэтага часу застаецца забароненай тэма Беларускага Супраціву бальшавіцкім акупантам у 1940-50-я гады. Камусьці вельмі ня хочацца, каб маладыя пакаленьні беларусаў-патрыётаў ведалі пра сваіх папярэднікаў і іх гераічнае змаганьне за волю й незалежнасьць...

Пра Беларускую Незалежніцкую Партыю, якая стаяла ў той час на чале беларускага вызвольнага руху, сёньня вядома вельмі мала. Шмат якія эпізоды яе дзейнасьці супярэчліва апісваюцца гісторыкамі, а некаторыя назаўсёды застануцца таямніцай. Напрыклад, дзейнасьць генэрала Вітушкі, праўдападобна, нам прыйдзецца вывучаць больш па легендах ды ўспамінах людзей, чымсьці па дакумэнтах, якія маглі не захавацца... А між іншым, БНП заслугоўвае таго, каб пра яе пісалі дасьледаваньні. Адных толькі партыйных дакумэнтаў хопіць на некалькі тамоў!
БНП пакінула значны сьлед у найноўшай гісторыі Беларусі. На працягу яе дзейнасьці на Бацькаўшчыне і ў эміграцыі ў шэрагах партыі налічвалася шмат тысяч беларусаў, многія зь якіх паклалі свае жыцьці на аўтар Бацькаўшчыны...
Пры падрыхтоўцы гэтай кнігі аўтар атрымаў дапамогу ад сяброў БНП Кастуся Шышэі, Мікалая Рулінскага, Барыса Рагулі, Андрэя Вайтовіча, Паўла Гуза, Віктара Сікоры, Янкі Жамойціна, сьв. пам. Міхася Зуя. Аўтар удзячны і сп. Юрыю Туронку за копіі “Бюлетэняў Беларускай Незалежніцкай Партыі”.

## ПРЫСЯГА БЕЛАРУСКАЙ НЕЗАЛЕЖНІЦКАЙ ПАРТЫІ

Прысягаю на Бога, што буду верным да сьмерці свайму Народу і Бацькаўшчыне, буду аддана і самаахвярна змагацца за незалежнасьць Беларусі і за шчасьце і волю Беларускага Народу. Уступаючы ў рады БНП, прысягаю ня здрадзіць яе спраў і тайнаў ані словам, ані чынам, хоць бы мяне чакалі найбольшыя спакусы і мукі. За справу БНП прысягаю аддаць у кожную хвіліну жыцьцё, бо ведаю, што яе справа — гэта справа волі і шчасьця Беларускага Народу і Бацькаўшчыны, і што сяньня толькі ў шчыльных радох БНП мы здабудзем незалежнасьць Беларусі і дамо адпор нашым ворагам. Ведаю, што за здраду спраў і тайнаў партыі кожны яе сябра караецца сьмерцю. Ад сяньняшняга дня — я актыўны змагар і працаўнік БНП.

## КАРОТКІ НАРЫС ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ НЕЗАЛЕЖНІЦКАЙ ПАРТЫІ

Гісторыя Беларускай Незалежніцкай Партыі доўгі час вывучалася толькі “спэцамі” з КГБ. Але іх “дасьледаваньні”

пакуль недаступныя беларускім гісторыкам. І тут няма нічога дзіўнага, бо больш за дзесяцігодзьдзе БНП і КГБ зь пераменным посьпехам вялі паміж сабою збройную барацьбу. Беларуская Незалежніцкая Партыя змагалася за вольную й незалежную Беларусь, а КГБ быў карным органам акупацыйнай бальшавіцкай улады. БНП знаходзілася ў глыбокім падпольлі, дзейнічала ў антысавецкіх партызанскіх аддзелах, разьлічваючы толькі на свае сілы. За КГБ стаяла ўся бязьмежная чырвоная імпэрыя...

Дык што гэта была за партыя, што за людзі яе стварылі? І сёньня пра гэта вядома вельмі мала. Афіцыйная беларуская гістарыяграфія ў асноўным абмінала гэтую тэму. Упершыню БНП на Беларусі згадвалася ў “Всенародной партизанской войне в Белоруссии против фашистских захватчиков” (Менск, 1951.Ч. 2) Л. Цанавы, які непасрэдна дапытваў арыштаваных кіраўнікоў і шараговых сяброў партыі. Васіль Раманоўскі ў кнізе “Саўдзельнікі ў злачынствах” (Менск, 1964) надаў БНП больш увагі: была пададзена ягоная трактоўка паўстаньня партыі, скажона апісана яе дзейнасьць. Беларускую Незалежніцкую Партыю згадвалі й іншыя савецкія выданьні, якія кляймілі яе, аблівалі брудам, абвінавачвалі сяброў БНП ва ўсіх сьмяротных грахох...

Беларускія эміграцыйныя гісторыкі пісалі пра Беларускую Незалежніцкую Партыю няшмат. Па-першае, многія сябры партыі, якія апынуліся за мяжой, з розных прычынаў не хацелі падаваць у друк свае ўспаміны. Па-другое, вельмі цяжка было знайсьці дакумэнтальныя крыніцы па гісторыі партыі, асабліва па першых гадох яе дзейнасьці. Па-трэцяе, многія кіраўнікі БНП загінулі або знаходзіліся ў бальшавіцкіх канцлягерох ці антысавецкай партызанцы. Ну й самая галоўная прычына — надзвычайная сакрэтнасьць, якая існавала вакол дзейнасьці партыі на Бацькаўшчыне й на эміграцыі. Бо чэкісты вельмі ўважліва чыталі эміграцыйныя выданьні ды шмат пра што пісаць у масавых газэтах нельга было. Толькі Вацлаў Пануцэвіч і Іван Касяк спрабавалі асьвятліць гісторыю Беларускай Незалежніцкай Партыі, але й яны сутыкнуліся шмат зь якімі цяжкасьцямі. Напрыклад, І. Касяк амаль у кожнай сваёй публікацыі блытаў БНП і “Арганізацыю (Партыю) беларускіх нацыяналістаў”.

Да гэтага часу яшчэ канчаткова ня вызначана дата заснаваньня БНП. Савецкія гісторыкі, некаторыя сябры БНП цьвердзяць, што Беларуская Незалежніцкая Партыя была

створана ў 1942 годзе. Толькі эміграцыйны гісторык Вацлаў Пануцэвіч трымаўся іншай думкі. Ён лічыў, што БНП арганізавалася напрыканцы 1939 году ў Вільні, і сярод яе заснавальнікаў былі а. Вінцэнт Гадлеўскі, Мікола Шкялёнак, Станіслаў Грынкевіч (старшы), Часлаў Ханяўка ды іншыя.* Вэрсыю Пануцэвіча падтрымоўваюць і архіўныя дакумэнты, якія гавораць пра існаваньне праграмы партыі ўжо ў 1940 годзе й што яна была надрукавана ў першым нумары бюлетэню беларускіх эмігрантаў.**
З чэрвеня 1940 году В. Гадлеўскі разам з сваёй групай знаходзіўся ў Варшаве, дзе арганізоўвае падпольныя структуры, для прыкрыцьця якіх стварае легальны "Беларускі Нацыянальны Фронт" (БНФ). Менавіта як кіраўнік Фронту ён выступае перад нямецкімі ўладамі. У 1940 г. Гадлеўскі піша праграму Беларускай Незалежніцкай Партыі "дзеля дэтальнага зьвязаньня пад прысягай сяброў у вернасьці яе ідэалёгіі й кіраўніцтву". У гэты час у БНП уваходзіць шмат маладых патрыётаў, якія пазьней адыграюць вялікую ролю ў Беларускім Рэзыстансе.
З пачаткам нямецка-савецкай вайны Беларуская Незалежніцкая Партыя пераносіць сваю дзейнасьць на Бацькаўшчыну. У шмат якіх акругах стварыліся падпольныя групы БНП. Напрыканцы жніўня 1941 года ў Варшаве адбылася нарада кіраўніцтва партыі. В. Гадлеўскі прапанаваў актыву праект праграмы падпольнай дзейнасьці, які амаль цалкам быў прыняты. *** Пачаўся пошук сувязі з заходнімі хаўрусьнікамі.
У 1942 годзе адбылася рэарганізацыя беларускай кансьпірацыі. На лідара БНП высоўваецца Ўсевалад Родзька, які працягвае дзейнічаць пад палітычным кіраўніцтвам а. Гадлеўскага. Сам Гадлеўскі прыступае да стварэньня нелегальнага "Беларускага Цэнтральнага (Народнага) Фронту" — масавай арганізацыі, якая "аб'ядноўвала вялікі круг беларускай інтэлігенцыі і шляхам вуснай прапаганды выясьняла ўсю шкоднасьць нямецкай палітыкі". **** Увосень 1942 г. В. Гадлеўскі спрабаваў залажыць кіруючы цэнтар Беларускага Рэзыстансу, але не пасьпеў...
Тым часам, улетку 1942 г. у Менску прайшоў зьезд БНП. Многія яго ўдзельнікі ўспрымалі зьезд, як заснавальніцкі. Праўдападобна, так абставіў справу Родзька на даручэньне а. Гадлеўскага. Аднак партыя ўжо існавала й дзейнічала, несла першыя ахвяры... У той час паўстала неабходнасьць

пашырыць актыў БНП і ейныя ўплывы на беларускае грамадзтва, сфармаваць дзейны Цэнтральны Камітэт, зацьвердзіць партыйныя праграму й статут. Тут Ус. Родзьку давялося сутыкнуцца зь немалымі цяжкасьцямі, бо вельмі ж розныя людзі трапілі на зьезд... Не раскрываючы кіраўніцтва а. Гадлеўскага, Родзька падаваў сябе як галоўнага арганізатара партыі.
Да восені 1942 г. быў сфармаваны ЦК БНП, які ачоліў Родзька, а таксама пяць акруговых камітэтаў партыі. Вядома, што менскі акруговы камітэт ачоліў Юльян Саковіч, а віленскі — Францішак Аляхновіч. Распачаўся выхад падпольнага "Бюлетэню БНП". Рабіліся спробы арганізацыі нацыянальнага партызанскага руху.
У сьнежні 1942 году гэстапа арыштавала й закатавала а. Вінцэнта Гадлеўскага, кіраўніка й ідэоляга Беларускага Рэзыстансу. Гэтая цяжкая ахвяра дорага каштавала падпольнаму руху. Шмат якія сувязі абарваліся, бо іх трымаў асабіста Гадлеўскі. Фактычна, 22-гадовы Усевалад Родзька мусіў ачоліць Беларускі Рэзыстанс на Беларусі.
Структуры БНП паўсталі й на Браншчыне і Смаленшчыне, дзе ў 1942-43 гг. дзеялі сябры ЦК БНП Міхал Вітушка й Дзьмітры Касмовіч. Нават некаторыя "змагары з нацыяналізмам" прызнаюць гэты факт. Анатоль Бадулін і Ігар Карпаў пісалі, што Касмовіч стварыў "Белорусскую националистическую партию" на Смоленщине и Брянщине".***** Менавіта маёр Дз. Касмовіч, ад імя ЦК БНП, у лістападзе 1943 года выслаў двух дэлегатаў-вайскоўцаў на Ўкраіну, дзе бандэраўская АУН праводзіла канферэнцыю паняволеных народаў.
Ус. Родзька ўвесь час нямецкай акупацыі цесна супрацоўнічаў з абвэрам ды выкарыстоўваў гэтую супрацу ў партыйных мэтах. Менавіта за гэты момант ягонай дзейнасьці і "ўхапіліся" савецкія гісторыкі, якія сьцьвярджалі, што БНП была нібыта інсьпіравана нямецкай вайсковай разьведкай. Аднак гэта пакуль ня спраўджана фактамі. Адзін з сябраў БНП пісаў на эміграцыі, што "перад абвэрам Родзька не выступаў як праваднік БНП, але як камандзер спэцыяльнай беларускай групы, накіраванай на змаганьне з савецкім ворагам".******
Напэўна ўжо ў 1943 годзе Родзька, пры дапамозе абвэру, пачаў рыхтаваць дывэрсыйныя групы, складзеныя з сябраў БНП, для антыбальшавіцкай барацьбы. Асабліва гэтая дзейнасьць ажывілася зімой-вясной 1944 года. Аднак, наўрад

ці атрыманая ад немцаў колькасьць зброі й боепрыпасаў была значнай. Фактычна, БНП назапашвала зброю ўласнымі сіламі.
У 1943 годзе ў Вільні Родзька меркаваў правесьці “беларускі зьезд”, сабраўшы на яго найбольш дзейных прадстаўнікоў існуючых беларускіх легальных і нелегальных арганізацый. Зьезд праводзіўся з дазволу абвэру й быў пакліканы абмеркаваць існуючую сытуацыю ды магчымасьці антыбальшавіцкай барацьбы. Усевалад Родзька плянаваў у рамках зьезду правесьці й нейкую нелегальную нараду. Аднак цывільныя нямецкія ўлады й гестапа Генэральнага камісарыяту “Беларусь” перашкодзілі выезду ў Вільню большасьці дэлегатаў. Таму пляны Родзькі былі сарваныя й прайшла толькі ня вельмі прадстаўнічая нарада.*******
Восеньню 1943 году ЦК БНП запрасіў на Беларусь з Бэрліну старшыню Рады БНР Міколу Абрамчыка. Магчыма, плянавалася стварэньне цэнтральнага органу Беларускага Рэзыстансу. Аднак Абрамчык пасьля вяртаньня зь Беларусі быў арыштаваны гестапа й дэпартаваны ў Парыж, дзе ўтрымоўваўся пад хатнім арыштам.
Напрыканцы чэрвеня 1944 году, напярэдадні Другога Ўсебеларускага кангрэсу ў Менску, сабраўся ЦК БНП, які меркаваў падрыхтаваць антынямецкае паўстаньне. Аднак з розных прычынаў яно не адбылося, бо запанавала думка, што гэта будзе самагубствам. Тым больш, што да Менску ўжо падыходзіла Чырвоная Армія. Кіраўніцтва незалежнікаў вырашыла частку сябраў партыі —вайскоўцаў — перакінуць ва Ўсходнюю Прусію, дзе фармаваўся беларускі дэсантны батальён “Дальвіц”. На Беларусі, апрача падпольных групаў, было пакінута й некалькі ўзброеных аддзелаў, якія павінны былі стаць асноваю беларускага паўстанчага руху.
Пачынаючы з верасня 1944 г. парашутысты БНП перакідваліся на Бацькаўшчыну. На нарадзе Цэнтральнага камітэту Беларускай Незалежніцкай Партыі, якая адбылася 25 верасьня 1944 году ў Бэрліне, было прынята рашэньне, у адпаведнасьці зь якім на Беларусь павінны былі вярнуцца й два сябры ЦК БНП Міхал Вітушка й Усевалад Родзька. Дзьмітры Касмовіч быў прызначаны кіраўніком Замежнага сэктару БНП. На пачатку 1945 году Касмовіч ды іншыя сябры партыі былі пасланыя на Захад дзеля ўсталяваньня сувязі з аліянтамі.********
Яшчэ ў 1944 годзе паўстаў праект Беларускай Вайсковай Арганізацыі (БВА), у якую меркаваў рэарганізаваць БНП Ус.

Родзька. Усе дэсантнікі "Дальвіцу" лічыліся яе сябрамі. Аднак невядома, ці сапраўды яна паўстала, ці засталася толькі праектам. Напрыклад, у красавіку 1945 году ў Бэрліне на канферэнцыі БНП у чарговы раз абмяркоўвалася справа БВА. Аднак, магчыма, у сувязі з арыштам ды гібельлю Родзькі рэарганізацыі БНП у БВА так і не адбылося. Бо ў пасьляваенны час на эміграцыі дзейнічаў Замежны сэктар БНП. Дзейнічала БНП і на Беларусі.

Пасьля капітуляцыі Нямеччыны атрад Ус. Родзькі прабіваўся з Чэхіі на Беларусь. Частка яго дайшла да Бацькаўшчыны і ўлілася ў беларускі партызанскі рух, але сам Родзька быў арыштаваны чэкістамі ў Беластоку. На допытах ён выдаў частку актыўных дзеячоў БНП, якія засталіся на Бацькаўшчыне. Многія сябры БНП былі арыштаваны, у рукі НКВД трапіла шмат і дэсантнікаў "Дальвіцу". Аднак разьбіць цалкам партыйныя структуры бальшавіцкія карныя органы ня здолелі. БНП на Бацькаўшчыне ўзначаліў генэрал Міхал Вітушка, які здолеў арганізаваць і падпольны, і партызанскі антыбальшавіцкі рух. На Беларусі БНП актыўна змагалася з акупантамі да 1956 году.*********

На эміграцыі Замежны сэктар БНП пад кіраўніцтвам Дз. Касмовіча сьпярша праводзіў актыўную работу. Была ўсталявана сувязь з партыйнымі структурамі на Бацькаўшчыне, якія дзейнічалі падпольна. Аднак, у сярэдзіне 50-х гадоў сытуацыя зьмянілася. БНП на эміграцыі фактычна ўлілася ў Беларускі Вызвольны Фронт, арганізаваны ўсё тым жа Касмовічам. Пры гэтым ніякіх заяваў пра ліквідацыю партыі не было. І сёньня многія сябры БНП на эміграцыі й на Бацькаўшчыне застаюцца вернымі сваёй партыі, яе ідэалёгіі, яе дэвізу "Беларусь перадусім!".

*Пануцэвіч В. Кс. Вінцэсь Гадлеўскі // Спадчына, 1993, № 5. Б. 85.
** НАРБ, ф. 4, воп. 33а, спр. 524, а. 185.
*** Кс. Вінцэсь Гадлеўскі // Спадчына, 1993, № 6. Б. 70; Кс. Вінцэнты Гадлеўскі, аснавапаложнік беларускага рэзістансу // Беларускія навіны (Парыж). 1945. 25 сьнежня. № 1.
**** Каранеўскі Я. Пад гнётам нямецкага фашызму // Рух (Зах. Нямеччына, у выходных дадзеных адмыслова, у мэтах кансьпірацыі, пастаўлена "Італія"), 1946. № 1. Б. 15.
***** Бадулин А., Карпов И. Господа рвутся к власти // Белорусская нива, 1998. 12 сакавіка.

****** Сакольскі. Некаторыя нясьціпласьці // Беларускі голас (Таронта), 1966. Красавік.
******* Тамсама.
********Kasiak I. Byelorussia. Historical outline, London, 1989 г.
*********Сьв. памяці Дзімітры Касмовіч // Беларуская думка (ЗША), 1992, № 37.

# А С О Б Ы

## ПА МЯНУШЦЫ “ВОЎК”

Гісторык Анатоль Бадулін у сваім пасквілі “Националист — это человек, сделавший уверенный шаг к фашизму” *(Советская Белоруссия, 1996. 20 чэрвеня)* сьцьвярджаў, што “ўзьнікненьне ідэалёгіі беларускага нацыяналізму адносіцца да 1940 году, калі на тэрыторыі Польшчы (акупаванай немцамі) у колах беларускіх нацыяналістаў... узьнікла думка пра стварэньне нелегальнай арганізацыі...”. Сапраўды, менавіта ў акупаванай гітляроўцамі Варшаве ў 1940-41 гадох стварыўся арганізацыйны цэнтар Беларускага нацыянальнага Супраціву. Адным зь яго лідараў стаў 20-гадовы Ўсевалад Родзька. Малады патрыёт, таленавіты чалавек, самаахвярны змагар за вызваленьне Бацькаўшчыны, ён яркай зьнічкай бліснуў, асьвяціўшы шлях беларускага вызвольнага руху, і загінуў у акупацыйных катоўнях...

Ус. Родзька нарадзіўся ў 1920 годзе ў вёсцы Чучавічы Лунінецкага павету ў сям'і Філярэта і Веры Родзькаў. Яго бацька — настаўнік, які паходзіў зь вёскі Вераскава на Наваградчыне, у першую сусьветную вайну быў мабілізаваны ў расейскую армію, стаў афіцэрам. З 1918 году Філярэт Родзька настаўнічаў на Мазыршчыне, дзе й ажаніўся з таксама настаўніцай Верай Гулевіч. У 1920 годзе, магчыма, з войскамі генэрала Булак-Балаховіча, яны ўцякаюць ад бальшавікоў на Наваградчыну, у Вераскава. Відаць, па дарозе дахаты, на Лунінеччыне, і нарадзіўся ў сям'і Родзькаў хлопчык, якому бацькі далі імя Ўсевалад.

У 1934 годзе ў Наваградку польскімі ўладамі была закрытая беларуская гімназія. Яе навучэнцаў залічылі ў мясцовую польскую гімназію ймя А. Міцкевіча. Сярод беларусаў, якія туды трапілі, былі й будучыя вядомыя дзеячы беларускай эміграцыі: Барыс Рагуля, Язэп Сажыч і Уладзімер Набагез. Успамінае Б. Рагуля:

“Нас, беларусаў, у гімназіі было пяцёх. У пятай клясе ўжо вучыўся Родзька, які быў запісаны расейцам. Але не яго гэта была віна, а бацькоў... У шостай клясе беларусамі сябе лічыла ўжо восем чалавек, у тым ліку і Ўсевалад Родзька. А гімназію скончыла 13 беларусаў...
Родзька належаў да гарцэрства г. зн. скаўтаў. Гэта была вельмі шавіністычная польская арганізацыя... Усевалад быў вельмі здольным і выбіраўся на камандзіра скаўцкай дружыны. Страшэнна здольны ён быў у мовах, гісторыі, а ў матэматыцы крыху слабейшы.
У 1935 годзе быў нейкі “дзень калёніі” (Польшча дамагалася калёній). Выступае Родзька на сцэне: “Нам трэба калёніі!” Пасьля гэтага мы, Набагез і я, падыходзім да яго: “Каму патрэбны калёніі, табе? Хіба ты ў калёніі не сядзіш?!” Далі яму мы тады перцу так, што ён пайшоў і на беларуса перапісаўся: “Я ваш, я з вамі! — кажа, — хачу пераймаць мэтоду Макіявэлі (тады мы вельмі захапляліся гэтым Макіявэлі). Я мушу ўбіцца ўверх, каб зьверху зрабіць беларускую справу”. Я кажу: “Браток, гэта сьлізкая дарога. Можаш так узьлезьці, што й ня вылезеш пасьля. Мы калёніяў не патрабуем...”
Нялёгка прыходзілася беларускім хлопцам бараніць свае нацыянальныя правы ў польскай гімназіі, але яны выстаялі. Пры гэтым ім удалося пазьбегчы і камуністычнага ўплыву, захаваць свой нацыянальны кірунак. Б. Рагуля ўспамінае, што шмат беларускім гімназістам дапамог сэнатар Васіль Рагуля, які казаў: “Сацыялізм — гэта мост да камунізму. І паколькі ты ня хочаш пераходзіць на той бок рэчкі, дык ня лезь на мост!”. Так беларускія хлопцы саматугам захавалі сваю нацыянальную арыентацыю, яшчэ ня ведаючы, якую ролю ім давядзецца адыграць у беларускім руху праз некалькі гадоў...
У 1938 годзе, пасьля матуры, Родзька, Рагуля і Янка Гутар зьбіраліся паступаць ува ўнівэрсытэт на мэдыцыну, але ў апошні момант іх мабілізавалі ў польскае войска. Рагуля і Родзька трапілі ў падафіцэрскую школу ў Замброў. Там, паводле словаў Барыса Рагулі, Ус. Родзька, хоць і запісаўся беларусам, зноў “разыгрываў свой прапольскі кірунак”. Аднойчы ў часопісе школы ён надрукаваў прапольскі патрыятычны верш “12 лістапада”... Хацеў Усевалад атрымаць першую лекату (стаць першым курсантам школы) і атрымаў бы яе, каб ня быў запісаны беларусам. Яму ж далі толькі трэцюю...

Трапіўшы ўвосень 1939 г. у нямецкі палон, Усевалад Родзька выйшаў на волю вясной 1940 году. Ён наладжвае кантакты з Беларускім камітэтам у Варшаве, узначальвае яго кракаўскую філію. Менавіта ў гэты час праяўляецца ягоны талент арганізатара, самаахвярнасьць стойкага беларускага патрыёта. Яго заўважылі. Айцец Вінцэнт Гадлеўскі паверыў маладому хлопцу й прыцягнуў Усевалада да падпольнай працы. Цяпер Родзька з "унутранага", яшчэ юнацкага "падпольля" ўваходзіць у сапраўдную нелегальную дзейнасьць. Ужо не было патрэбы "гуляць" з палякамі, бо пачыналася вялікая гульня зь немцамі, стаўкі каторай былі вельмі вялікія — незалежнасьць Беларусі...

Да сёньняшняга дня застаецца не высьветленым да канца час узьнікненьня Беларускай Незалежніцкай Партыі (БНП). Эміграцыйны гісторык Вацлаў Пануцэвіч лічыў, што яна ўзьнікла ў 1939 г. у Вільні й аформілася ў 1940-41 гг. у Варшаве. У большасьці іншых крыніц, у тым ліку і савецкіх, паведамляецца, што БНП арганізавалася ў 1942 годзе ў акупаваным немцамі Менску. Як бы там ні было, а ў 1940-41 гадах у Польшчы а. Гадлеўскі сфармаваў арганізацыйны цэнтар Беларускага нацыянальнага Супраціву.

У найноўшай гісторыі хапае прыкладаў, калі сьвятары ачольвалі вызвольныя рухі паняволеных народаў. Напрыклад, у міжваенны час каталіцкі сьвятар Андрэй Глінка ачоліў славацкую нацыяналістычную партыю, якая выступала за стварэньне незалежнае славацкае дзяржавы (а. В. Гадлеўскі ў 1936-39 гг. у Заходняй Беларусі кіраваў нацыяналістычным "Беларускім фронтам"). Падчас Другой сусьветнай вайны пасьлядоўнікі а. Глінкі ўтварылі шэраг патрыятычных ваенізаваных арганізацый, як "Глінкаўская моладзь", "Глінкаўская гвардыя" ды інш., якія складалі галоўную сілу вызвольнага руху.

У ліпені 1941 г. Усевалад Родзька, пры падтрымцы абвэру, зь якім супрацоўнічаў (гэта быў тактычны крок а. Гадлеўскага), стаў бурмістрам Віцебску. Ён паступова праводзіць беларусізацыю гораду, з 1942 г. арганізоўвае выхад газэты "Беларуская Старонка", у якой часта выступае з публіцыстыкай і фэльетонамі. Адначасова Родзька праводзіць актыўную падпольную працу — выконвае інструкцыі а. В. Гадлеўскага.

У жніўні 1941 году пры непасрэдным удзеле Ўс. Родзькі была падрыхтавана і праведзена беларуска-украінская

антыбальшавіцкая вайсковая апэрацыя на Палесьсі. І сёньня ўкраінскія гісторыкі з захапленьнем пішуць пра гэтую вайсковую акцыю, у якой удзельнічала 10 тысяч жаўнераў Палескай Сечы Ўкраінскай Паўстанчай Арміі і 5 тысяч беларусаў — удзельнікаў Беларускай самаабароны, якая стыхійна ўзьнікла на пачатку вайны на Берасьцейшчыне і Піншчыне. У выніку апэрацыі пад беларуска-ўкраінскі кантроль была ўзята вялікая тэрыторыя: ад Пінску да Мазыра і ад Слуцку да Сарнаў. Пазьней злачынная нямецкая палітыка змусіла гэтыя аддзелы йсьці ў лес і арганізоўваць нацыянальны партызанскі рух (Беларуская народная партызанка і УПА). Аднак Родзька застаўся працаваць на становішчы бурмістра, якое давала шмат магчымасьцяў у падпольнай працы. Праўда, ілюзіі наконт нямецкіх “вызваляльнікаў”, якіх і так было няшмат, хутка зьніклі.
Пасьля гібелі Гадлеўскага ў катоўнях гестапа, Ўсевалад Родзька фактычна становіцца кіраўніком нацыянальнага антынямецкага падпольля ў Беларусі, а перадусім яго найбольш актыўнай часткі. і гэта ў 22 гады! Бузумоўна, не хапала досьведу, верных сяброў і саюзьнікаў. Але Родзька знаходзіў выйсьце нават у самых безнадзейных сытуацыях. Патрэбна была зброя й ён — дзеля барацьбы з бальшавікамі — браў яе ў абверу. А хто яшчэ даў бы яе беларусам? Заходнія саюзьнікі? Усе спробы наладзіць зь імі кантакты ні да чаго не прывялі...
У студзені 1944 году Ўсевалад Родзька ўваходзіць у Беларускую Цэнтральную Раду, дзе адказвае за працу з моладзю. Менавіта моладзь складала асноўную частку сяброў БНП. А калі ў сакавіку 1944-га пачалася мабілізацыя ў Беларускую Краёвую Абарону, Родзька ачольвае 15-ты батальён БКА. Ён, праз свой вайсковы партыйны актыў, быў фактычным кіраўніком БКА, у той час калі маёр Кушаль камандуючым быў толькі наміналньна. Кіраўніцтва БНП у гэты час рыхтуецца да збройнай барацьбы з бальшавікамі: ствараюцца ня толькі легальныя вайсковыя структуры, але й партызанскія аддзелы, пашыраецца падпольная сетка.
Сябра ЦК БНП Б. Рагуля ўспамінае: “Быў у Родзькі плян путчу ў Менску падчас Другога Усебеларускага кангрэсу. Асноўнай сілай мусіў стаць мой батальён, які знаходзіўся пад Докшыцамі. Нам павінны былі падаць цягнік, каб мы пераехалі ў Менск. Там мы бы сталі галоўнай сілай аховы кангрэсу і заплянаванага путчу, мэтай якога было б

абвяшчэньне незалежнае Беларускае Народнае Рэспублікі. Але эшалёну немцы нам не далі, бо, магчыма, нешта пранюхалі...”
Плян антынямецкага паўстаньня ў Менску, які распрацаваў Родзька, быў, ведама, фантастычны. Сілаў у БНП было вельмі мала! Значна менш, чымсьці ў польскай Арміі Краёвай падчас варшаўскага паўстаньня. Тым больш, што пачалася апэрацыя “Баграціён” і савецкія танкі імкліва набліжаліся да Менску. Таму частка сяброў ЦК БНП выступіла супраць самагубчага пляну. Неабходна было захаваць людзей дзеля будучай партызанскай і падпольнай барацьбы з новымі акупантамі.
Летам 1944 года ўва Ўсходняй Прусіі, у мястэчку “Дальвіц”, быў арганізаваны беларускі дэсантны батальён, які павінен быў стаць найбольш баяздольнай адзінкай антыбальшавіцкага партызанскага руху. Немцы забясьпечвалі беларусаў зброяй, амуніцыяй, і самалётамі перакідвалі на Беларусь. Палітычным кіраўніком быў маёр Ус. Родзька, а камандзірам батальёну — маёр Іван Гелда, сябра БНП, які толькі вызваліўся з беластоцкай турмы гестапа. Родзька верыў у паўстанцаў на Бацькаўшчыне й хацеў забясьпечыць ім вайсковае й палітычнае кіраўніцтва. Да пачатку 1945 г. было выпраўлена некалькі вялікіх дэсантных групаў, а таксама асобныя дэсантнікі. Усе яны лічыліся жаўнерамі Беларускага Краёвага Войска (БКВ) і сябрамі Беларускай Вайсковай Арганізацыі (БВА). БВА была ўтворана яшчэ ў 1944 годзе, як адзін з варыянтаў БНП, але толькі ў красавіку 1945-га ў Бэрліне прайшла першая нелегальная канферэнцыя вайскоўцаў БВА. Большасьць яе ўдзельнікаў выказаліся за ўдзел у партызанцы на Бацькаўшчыне. Прысутны на канферэнцыі праваднік СБМ Міхась Ганько пакаяўся ў сваіх памылках ды заявіў, што далучыцца да дэсантаў, як шараговы партызан...
Нягледзячы на ўсе намаганьні, Усевалад Родзька ня здолеў перакінуць свой батальён на Беларусь. Вясной 1945-га ў немцаў ужо не было лішніх самалётаў... Але ён не губляе аптымізму. Нават пасьля капітуляцыі Нямеччыны й раззбраеньня батальёну “Дальвіц” у Чэхіі мясцовымі партызанамі Родзька з групай сваіх хлопцаў пешым маршам прабіваецца на Беларусь. На Беласточчыне яны затрымаліся, тут і адбыўся правал — Родзьку і яшчэ некаторых арыштавалі гэбісты. Выратаваліся нямногія. Напрыклад, Юрка Сянькоўскі ўцёк на Захад. Іншыя працягвалі пешы марш на ўсход і ўліліся ў партызанскую армію генэрала Вітушкі.

Арыштаванага кіраўніка БНП Родзьку (партыйная мянушка “Воўк”) прывезьлі ў Менск, у “амэрыканку”. Там у яго патрабавалі раскрыць падпольныя структуры, партызанскія базы й групы сувязі. Магчыма, каталі… У 1995 годзе ў Менску выйшла кніга Аляксея Салаўёва “Белорусская центральная рада: создание, деятельность, крах”, дзе аўтар выкарыстоўвае ўрыўкі з паказаньняў Ус. Родзькі. Толькі ня піша ён, якімі мэтадамі выбіваліся паказаньні ў гэтага маладога хлопца, і што зь ім зрабілі чэкісты.
У ліпені 1997 года я быў у гасьцёх у Лявона Луцкевіча, апошняга з тых, хто праходзіў па “справе шасьцёх” (Родзька, Гелда, Луцкевічы, Усевалад Кароль, Янка Гінько). Паводле словаў Луцкевіча, Родзька расказаў на сьледзтве “нават тое, што мог не гаварыць”. Аднак Лявон Луцкевіч ня верыў, што такая вялікая асоба, як Родзька, мог “проста так здаваць сваіх паплечнікаў. Відаць, спрабаваў арганізаваць нейкую гульню й перайграць Цанаву. Але дзе-ж ты яго перайграеш?!..” Сябра БНП Янка Жамойцін тлумачыць напісаньне Родзькам падрабязных успамінаў у турме тым, што ён хацеў захаваць для гісторыі сьведчаньні пра дзейнасьць Беларускага Супраціву. А што да “гульні”, дык ёсьць фактам, што некаторым арыштаваным дэсантнікам БНП чэкісты прапаноўвалі магчымасьць дэсанту ў Грэцыю(!). Ці не на баку камуністычных партызанаў яны там павінны былі ваяваць?! Але гэтая справа толькі словамі й скончылася...
Дзесьці ў траўні 1946 года адбыўся суд. Родзька і Гелда былі засуджаныя на сьмерць. Было Усеваладу, як і Кастусю Каліноўскаму, толькі 26 гадоў... Адныя крыніцы паведамляюць, што яго павесілі, другія — што расстралялі. Ходзяць нават чуткі, што яму захавалі жыцьцё і жыў ён у Сібіру. А Юрка Віцьбіч на фотакопіі паказаньняў Родзькі, якую зьмясьціў у кнізе “Саўдзельнікі ў злачынствах” В. Раманоўскі, не пазнаў яго почырку. Загадка?..
“Для мяне Родзька застаўся героем, — гаворыць Б. Рагуля, — ён і загінуў як герой, як Каліноўскі. І я схіляю галаву перад гэтым чалавекам. Усё ж такі ён заплаціў жыцьцём за ідэю. Ні за грошы, ні за што іншае, а за ідэю...”
Была ўва Ўс. Родзькі прыёмная дачка. Пасьля вайны жыла з маці ў Парыжы. Эмігранты кажуць, што яна выйшла замуж за гішпанца і цяпер беларускай мовы, напэўна, ня памятае. Магчыма, ня памятае яна і свайго бацьку, беларускага героя, што паклаў сваё жыцьцё на аўтар Бацькаўшчыны...

## ІНТЭРВІЮ З КАМАНДЗІРАМ “ЛЯСНЫХ БРАТОЎ”

На Віцебшчыну мы з сябрам паехалі на машыне на пачатку кастрычніка. Чатырыста кілямэтраў ад Слоніму да Шаркаўшчыны адолелі за шэсьць гадзін. З дапамогай мапы, нарэшце, знайшлі вёску Малыя Алашкі. Пад праліўным дажджом, па невялікім мастку, не бязь цяжкасьцяў, фарсавалі рэчку і распачалі пошукі хаты Віктара Сікоры. Ён нас ужо чакаў. Ці не адразу я ўключыў дыктафон.

*ДАВЕДКА: Віктар СІКОРА нарадзіўся ў 1925 годзе ў вёсцы Малыя Алашкі ў сям’і Івана Сікоры, вядомага садавода, які на пачатку стагодзьдзя вёў перапіску з Коласам, Купалам, Львом Талстым. Віктар Сікора скончыў 6 клясаў польскай школы, а падчас нямецкай акупацыі — шасьцімесячныя курсы, пасьля якіх у 1942 годзе паступіў у Пастаўскую настаўніцкую сэмінарыю. У 1943 годзе, калі арганізаваўся Саюз Беларускай Моладзі, Віктар Сікора стаў адным з яго кіраўнікоў у Паставах. З красавіка 1944 года — сябра падпольнай Беларускай Незалежніцкай Партыі (БНП). Вясною-летам 1945 года — камандзір аддзелу беларускіх “лясных братоў” на Шаркаўшчыне. Арыштаваны 5 сьнежня 1945 году. Сядзеў у менскай “амэрыканцы”. З бальшавіцкіх канцлягероў на Бацькаўшчыну вярнуўся ў 1955 годзе.*

**— Сп. Віктар, што ўяўляў сабой Пастаўскі СБМ?**

— У нашай мясцовасьці СБМ пачаўся ўвосень 1943 году, калі ён арганізаваўся пры настаўніцкай сэмінарыі. Амаль усе навучэнцы адразу запісаліся ў Саюз, а тыя, што пажадалі стаць малодшымі кіраўнікамі, паехалі на адмысловыя курсы СБМ у Альберцін. Быў там месяц і я. Вярнуліся адтуль мы ўжо дружыновымі.

Я ачольваў СБМ у настаўніцкай сэмінарыі, а ў Пастаўскім раёне — Аўген Занкавіч. Пастаўскі раён уваходзіў тады ў Глыбоцкую акругу. Акруговым кіраўніком СБМ у хлопцаў быў Аўген Мацюшонак, а пасьля яго — Мечыслаў Рачыцкі. У дзяўчат акруговай кіраўнічкай была Ульяна Куштэлян. Тое, што СБМ зрабіў за няпоўны год, бальшавікі за 70 гадоў не зрабілі ў камсамоле...

Пасьля Мацюшонак накіраваў мяне і Рачыцкага ў Менск на 40-дзённыя курсы.

**— У якім гэта было годзе?**

— У 1944-ым. З усёй Беларусі зьехаліся хлопцы. Лейтэнант Язэп Сажыч вёў ваенную справу, нас муштраваў. На гэтых курсах найбольшую ролю адыгрываў Родзька. Ён часта

прыходзіў. Сымпатычны, малады, яму было 23-24 гады. Родзька быў выдатным аратарам. Такіх прамоўцаў трэба было пашукаць! Гэта быў адзін з самых разумных людзей, каторых я ведаў. Быў яшчэ Барыс Рагуля, камандзір коннага эскадрону. Ён прыяжджаў некалькі разоў і вельмі сябраваў з Родзькам. А вось Міхась Ганько, праваднік Галоўнага Штабу СБМ з Родзькам штосьці не сябраваў. І ня ведаю нават, чаму.

У нас на курсах выкладаў Аўген Калубовіч. Вельмі прыгожа гаварыў ён па-беларуску. Зь Міколам Шкялёнкам, першым намесьнікам прэзыдэнта Беларускай Цэнтральнай Рады, пазнаёміўся. Як ішоў па Менску, мяне ўсё браў, як ахову. Бо Менск разбураны быў, ляжаў у руінах. У мяне былі два пісталеты, якія Родзька выдаў...

**— Калі Вы ўпершыню пачулі пра Беларускую Незалежніцкую Партыю?**

— Было так. Спачатку ніхто нічога не гаварыў. Кожны з выкладчыкаў выказваў свае погляды, слухалі нас, прыглядаліся, як хто сябе паводзіць. Бо розныя людзі трапілі на курсы... Ну, а пасьля я пазнаёміўся з Родзькам. Сталі неяк зьбірацца на тайныя сходы. Родзька нам казаў: “Трэба гуртавацца, трэба ўмацоўваць свае становішчы, зьбіраць сілы... Для нас аднолькавыя ворагі — фашызм і камунізм. Але нам няма дзе падзецца. Пападземся паміж імі й нас зьнішчаць, наогул, сатруць... Немцы, хоць і ворагі — паляць вёскі, забіваюць людзей, і мы гэта бачым, але ж хоць даюць “людзьмі звацца”, хоць можна на роднай мове гаварыць, вучыцца...

Цяпер самы адказны час. Яшчэ раз мы павінны выбраць меншае ліха. Два злы, ліхі ёсьць. Мы мусім выбраць меншае ліха і павінны зь ім ісьці. Тым больш, немцы абяцалі нас узброіць. Нам трэба атрымаць ад іх зброю... Камунізм для нас больш вораг, бо немцам ужо прыходзіць канец. А бальшавікі, як прыйдуць, так і пойдуць...

У нас ёсьць партыя падпольная, тайная. Наперадзе нас чакае змаганьне за вольную Беларусь. Пасьля мы павінны будзем змагацца з бальшавікамі. Калі ўдасца перайсьці ў падпольле, будзем на нелегальным становішчы. І сыстэма ў нас будзе такая, што адзін ведае толькі трох чалавек і больш нікога. Кансьпірацыя такая”.

Былі вялікія спадзяваньні на Захад, на Англію і Амэрыку. Мы верылі, і Родзька на іх спадзяваўся. “Нам трэба ўзяць у іх

[немцаў] зброю, каб мы маглі пасьля ўтрымаць Беларусь", — казаў ён.
На гэтай першай сустрэчы, якая праходзіла ў гасьцініцы на цяперашняй Камсамольскай вуліцы, было 12 чалавек з эсбээмаўскіх курсаў. Усіх нас Родзька прыняў у падпольную Беларускую Незалежніцкую Партыю. Неўзабаве ён адвёз мяне й іншых хлопцаў у Вільню на вуліцу Коленштрасэ, гэта Вугальная, а па-летувіску — Англю. Там знаходзілася адна нямецкая сакрэтная ўстанова.

**— Родзька вам патлумачыў, дзеля чаго вы туды едзеце?**

— Не. Там нам далі запоўніць анкеты па-нямецку і па-беларуску, што "я, Сікора Віктар, абязуюся дапамагаць нямецкаму вэрмахту". Зразу далі мне польскі пісталет "Радам". Родзька сказаў мне: "Стварай сваю групу і прывозь яе сюды". Я адказваю: "Мы ж вэрбуемся! Каб я гэта ведаў, не паехаў бы! Я зь немцамі нічога ня маю, зь імі не супрацоўнічаю. Вы ж упіхнулі мяне не туды!.."
Родзька ж гаворыць: "Не зьвяртай на гэта ўвагі. Трэба выконваць заданьне. Раз мы стварылі сваю Незалежніцкую Партыю... У нас зброі няма, а дзе мы возьмем? У нас яе няма. Мы хутка пераходзім на нелегальнае становішча. Ты што, ня бачыш, што вось-вось прыйдуць бальшавікі? І што, уцякаць? Трэба ж некаму застацца! Нам трэба сваю справу рабіць!". Ну і ўсё. Я вярнуўся ў Паставы і ўцягнуў чалавек сорак, амаль усіх сваіх хлопцаў.

**— Вы іх прымалі ў БНП?**

— Так, Занкавіча прыняў. Хоць ён быў маім кіраўніком у СБМ, у БНП было наадварот. Я быў прызначаны партыйным кіраўніком на Пастаўскі раён, а Аўген Занкавіч — маім намесьнікам. Былі яшчэ Лапіцкі Алег, Прыстаўка Вячаслаў, Латышонак Аляксандар, Жыхар Аўген, Грыгор'еў...
Пасьля, калі мяне арыштавалі чэкісты, я сказаў, што завэрбаваў з сэмінарыі толькі 10 чалавек. Тых, каго ў красавіку 1944 году завёз у Вільню. Тут ужо нікуды ня дзенесься. Ды яны ўсе пасьля трапілі ў батальён "Дальвіц"... У Вільні я атрымаў дакумэнт, што зьяўляюся кіраўніком узброенай групы абвэра, і каб усе нямецкія органы мне аказвалі дапамогу. Некалькі разоў мяне правяралі немцы і кожны раз гэты дакумэнт дзейнічаў — зразу адпускалі.

**— Якое апошняе заданьне Вы атрымалі ад Усевалада Родзькі?**

— Трэба было на Кангрэс прыехаць, які праходзіў у Менску напрыканцы чэрвеня 1944 году. Сабраць сваіх людзей і прыехаць. Родзька сказаў, што “там усё вырашыцца”. Са мной было 12 чалавек, мы ехалі ўзброеныя вінтоўкамі і пісталетамі на цягніку. За Лынтупамі паравоз быў падарваны. Відаць, акоўцы зрабілі дывэрсію. Цягнік пачалі абстрэльваць зь лесу. Дзявацца не было куды, мы адстрэльваліся, аж пакуль бронецягнік не падышоў. Прыйшлося нам вярнуцца ў Паставы. На Кангрэс мы ня трапілі.

А апошні раз я сустракаўся з Родзькам дзесьці ў траўні 1944-га ў Вільні, на сьвяткаваньні 25-х угодкаў Беларускай гімназіі. Астроўскі там быў. Забэйда-Суміцкі выступаў, Родзька. Ён ужо быў у вайсковай форме беларускага афіцэра, старшага лейтэнанта. На мундзіры былі бел-чырвона-белыя пятліцы й Ярылавы крыжыкі. Я стаяў там на варце, ахоўваў мерапрыемства...

**— Як сталася, што Вы ня трапілі ў дэсантны батальён “Дальвіц”?**

— Быў пачатак ліпеня. У беспарадку адступалі немцы. Хацеў адступаць і я. Але тут прыехалі людзі ад Родзькі й кажуць: “Мы ад Родзькі. Ты павінен застацца. Вось табе даведка, што ты — партызанскі сувязны. Гэта загад!”. Ведаеце, загад ёсьць загад. Я застаўся, а хлопцы мае пайшлі на захад, ува Усходнюю Прусію. Там трапілі ў дэсантны беларускі батальён “Дальвіц”. Расказваў мне Латышонак, што не ўдалося ім перайсьці да заходніх хаўрусьнікаў. Паабяцалі ім дапамагчы й падвялі... Тады яны з Родзькам пайшлі пешым маршам праз Польшчу. І недзе там Родзька, па сваёй неасьцярожнасьці, быў арыштаваны. А яны далей пайшлі групай. Прыйшлі сюды, а тут “істрабкі”, палявое НКВД...

**— Арганізавалі яны тут што-небудзь?**

— Многіх хутка паарыштоўвалі. Некаторых нават з Чырвонай Арміі пабралі. Ведаеце, сама структура, канспірацыя была яшчэ неадпрацаваная... Адзін толькі Жыхар дзейнічаў.

**— Калі Вы пайшлі ў лес?**

— Я баяўся, што мяне арыштуюць, даведаюцца пра маю дзейнасьць у СБМ. Пайшоў у Чырвоную Армію. Трапіў аж на Ўкраіну, пад Белую Царкву, быў пісарам у роце. А калі даведаўся, што на 1-шы Прыбалтыйскі фронт накіроўваецца эшалён, запісаўся добраахвотнікам. Недаяжджаючы да Дзьвінску, з цягніка ўцёк. Гэта быў канец лістапада. Ужо пачыналіся маразы. А мае аднавяскоўцы напісалі з войска

дахаты, што я ўцёк. Пачалі шукаць. Бацька тады выкапаў яму пад бульбай і я там хаваўся чатыры месяцы — да вясны. А як сьнег сышоў, падаўся ў лес. Там сустрэў шмат такіх як я. Былі мы добра ўзброеныя, мелі нават “дзегцяры” — кулямёты.
У нас тут лясы. Аж да Браслава адзін толькі лес — ніводнай жывой душы. Разьбіліся на атрады па 20-40 чалавек, бо разам было цяжка. У цяжкадаступным месцы пабудавалі сабе ў лесе дамкі, самыя пяклі хлеб — была свая пякарня, гаспадарка.
**— Колькі чалавек было ў Вашым атрадзе?**
— Каля трыццаці.
**— Вы былі ў іх камандзірам?**
— Так, слухаліся мяне. Праўда, у нас была “дэмакратыя”...
А пасьля капітуляцыі Нямеччыны саветы абвесьцілі амністыю дэзэрцірам і многія хлопцы павыходзілі зь лесу, паверылі. Шмат хто меў у вёсках сем’і...
**— Як Вы трапілі ў рукі чэкістаў?**
— Да мяне прыйшоў сувязны зь Вільні — “Каліноўшчык”, які аказаўся агентам НКВД. Малады хлопец, добра абазнаны ў справах БНП. Ён прыйшоў у Малыя Алашкі і ашукаў бацьку. Сказаў яму, што “пойдзем за мяжу, тут нічога не робіцца, а ўжо скончылася вайна і абвешчана амністыя. У лесе засталося мала людзей. Тых, хто застаўся, перакідваем за мяжу”. Папрасіў, каб бацька зьвёў яго са мною. З “Каліноўшчыкам” я сустракаўся некалькі разоў. Ён прапанаваў, каб я прывёў на сустрэчу ўсіх сваіх хлопцаў. А ў той час (пачатак жніўня 1945 году) са мной заставалася пятнаццаць чалавек, узброеных аўтаматамі ППШ...
Мяне не арыштавалі. Чэкісты мяне ўзялі й сказалі: “Выведзі гэтую групу зь лесу, тады цябе не зачэпім”. Я кажу: “Ну дык я ўжо выйшаў...” “Ну, нічога, ужо як-небудзь дапамажы”. Мяне нібыта амніставалі, уладкавалі на працу на пошту, памочнікам начальніка аддзяленьня. Жыў дома, але пад наглядам...
Я ўжо ведаў, што мяне пасадзяць. Мог уцячы, але тады чэкісты арыштавалі б маю сям’ю... Перадаў у лес хлопцам вестку, каб яны ішлі адсюль. І вось яны кажуць: “Адыходзім, пойдзем на Польшчу”. І пайшлі. Гэта ўсе мясцовыя хлопцы былі, беларусы. Зь іх памятаю Міцкевіча. Хата ягоная стаяла ў лесе недалёка ад Алашак.
Мяне узялі 5 сьнежня 1945 году. Прышлі два лейтэнанты, сяржант і сем аўтаматчыкаў. Акружылі хату... Пешшу прывялі мяне ў Варапаева, а пасьля на цягніку прывезьлі ў Вялейку.

Пакуль ехаў у таварным вагоне, рукі і ногі былі зьвязаныя калючым дротам... Пасьля Вялейкі завезьлі ў менскую "амэрыканку", дзе мяне жудасна каталі... Ніхто ў сьвеце так ня зьдзекваўся над людзьмі, як рабілі бальшавікі. У Воршы ў перасыльнай турме ў камэры, якая разьлічана на 20 чалавек, сядзела 240. Каленкі ў каленкі, сьпіна да сьпіны...

**— Што пыталіся ў Вас сьледчыя?**

— Яны ўжо ўсё ведалі. На мяне далі паказаньні Родзька і Марцінкевіч. Марцінкевіч выкладаў фізкультуру ў Віленскай Беларускай гімназіі й кіраваў Віленскім камітэтам БНП. Мне зразу далі паперу: "Знаеш почырк Родзькі?" Родзька пісаў, што я быў па Пастаўскім павеце кіраўніком БНП і была мной створана ўзброеная група...

**— Які Вам быў прысуд?**

— Дзесяць гадоў лягероў і 5 гадоў паражэньня правоў. Трапіў я на золатаздабыўчыя шахты ў Бадайбо, гэта Якуція. А пасьля быў у Тайшэцкім "Озерлагу". Там давялося мне ўадзіночку хаваць ксяндза Адама Станкевіча, але гэта асобная гісторыя...

**— Вы ўспаміналі Аўгена Жыхара, які апошні змагаўся з бальшавікамі...**

— Гэта быў таленавіты хлопец, пісаў прыгожыя вершы. Родам ён з вёскі Новадруцк. Быў у СБМ, вучыўся ў Паставах у настаўніцкай сэмінарыі. Я яго прымаў у Беларускую Незалежніцкую Партыю. А пасьля Аўген трапіў у "Дальвіц" і вярнуўся сюды з дэсантам. У яго была партызанская група, "бандай" яе называлі. Дзейнічала яна ў Пастаўскім раёне, каля Варапаева. Тэрарызавала камуністаў, савецкіх актывістаў, даносчыкаў і гэбістаў. Я вярнуўся зь лягероў, а Жыхар яшчэ быў у лесе. Ён загінуў напрыканцы лета 1955 году. Яго абкружылі на хутары ў сямёх кілямэтрах ад Паставаў. Прыйшлося Аўгену пусьціць сабе кулю ў лоб...

## "ЗАСТАЮСЯ ВЕРНЫ БЕЛАРУСКАЙ НЕЗАЛЕЖНІЦКАЙ ПАРТЫІ !.."

З сябрам БНП Андрэем Вайтовічам я пазнаёміўся выпадкова зімой 1996 году. Стары беларускі нацыяналіст, які прайшоў бальшавіцкія канцлягеры й турмы, тайны нагляд КГБ, ён ня стаў кідацца да мяне з абдымкамі. Вайтовіч трымаўся насьцярожана і, мусіць, не выключаў чарговай правакацыі з боку органаў дзяржбясьпекі. Распружыла гэтую насьцярожанасьць фотакартка Вітушкі, якую я выпадкова

захапіў з сабою й цяпер паказаў спадару Андрэю... Пасьля таго, як я даў Вайтовічу пачытаць свае артыкулы пра БНП (дзе, дарэчы, успамінаўся й ён), давер да маёй асобы быў здабыты.

— У Беларускую Незалежніцкую Партыю мяне прымаў Барыс Рагуля ў клясе настаўніцкай сэмінарыі ў Наваградку, — успамінае Андрэй Вайтовіч. — Пасьля свайго ўроку нямецкай мовы на матуральным курсе Барыс адпусьціў дзяўчат, пакінуўшы у клясе толькі хлопцаў — каля дваццаці чалавек. “Я з вамі трошкі пагавару”, — сказаў ён і пачаў шчырую размову з намі. Рагуля гаварыў, што ня трэба спадзявацца на немцаў, бо яны нам таксама нічога добрага не жадаюць. Таму мы павінны арганізавацца, і ў нас будзе свая партыя — падпольная. Барыс Рагуля казаў, што нашая мэта — захаваць моладзь. Дзеля гэтага створана БНП, ствараецца Наваградзкі беларускі эскадрон. Нельга было дапусьціць, каб беларуская моладзь ішла да савецкіх партызанаў або вывозілася на прымусовыя працы ў Нямеччыну. Гэта была праграма-мінімум. Галоўнай мэтай БНП было змаганьне за незалежнасьць Беларусі. Усё сказанае Барысам мы ўспрынялі вельмі прыхільна. Усе ўсталі й паўтарылі за Барысам словы прысягі...

Андрэй Вайтовіч шмат мне расказваў пра сваіх сяброў па партыі, але зусім мала пра сябе. Ён нарадзіўся ў 1920 годзе ў вёсцы Залоскі, што каля Любчы (Наваградчына) ў шматдзетнай сялянскай сям’і. З маленства працаваў — дапамагаў бацьку. У школе паказваў сябе здольным вучнем, але, каб працягваць навуку, патрэбныя былі грошы, якіх ня мелі ягоныя бацькі... Ратавала дапамога старэйшага брата, знаёмых. Паехаў вучыцца ў Вільню ў электрамэханічную гімназію, паступіў. Зноў не было грошай, але дырэкцыя адзначыла яго здольнасьці й старannасьць — атрымаў стыпэндыю. Вайна ня дала скончыць гімназію — паміж Вільняй і Любчай зьявілася мяжа... Падчас нямецкае акупацыі закончыў матуральныя курсы й вучыўся ў настаўніцкай сэмінарыі ў Наваградку. Тут ён уступіў у Беларускую Незалежніцкую Партыю, спаткаў сваё першае каханьне...

— Тамара Чарамшагіна была маёй сымпатыяй, маім плятанічным каханьнем, — успамінае А. Вайтовіч. — Яна паходзіла зь Любчы й жыла там да 1942 году. Пазнаёміліся мы яшчэ пры “першых саветах”, калі разам вучыліся ў Любчанскай сярэдняй школе. Калі ў вайну ў Наваградку

арганізавалася сэмінарыя, прыехала вучыцца й Тамара. Спачатку яна жыла ў інтэрнаце, але калі я ўбачыў тыя непарадкі, уладкаваў яе і Веру Краскоўскую на прыватную кватэру... Напрыканцы 1943-га я запісаўся ў эскадрон Барыса Рагулі, а Тамара працягвала вучыцца.
Улетку 1944 году Барыс Рагуля прывёў свой батальён у Наваградак. Ужо ўцяклі немцы й недалёка былі бальшавікі. Ён пастроіў сваіх хлопцаў на Замкавай гары й сказаў наступнае:
— Сябры! Я вас адсюль узяў, сюды й прывёў. Немцы ўжо адступілі, а заўтра адступім і мы. Я не прымушаю, каб вы ўсе адыходзілі на захад. Хто хоча з намі, калі ласка, хто ня хоча, заставайцеся...
Вайтовіч вырашыў ісьці з Барысам. Не захацела заставацца й Тамара Чарамшагіна.
— Ты добра падумала, што робіш? — пытаўся ён у Тамары.
— Падумала...
— А можа нам прыйдзецца ўсё жыцьцё там быць? Ты на гэта згодная?
— Я згодная.
І яны адступалі разам. Трапіўшы ў Варшаву, вырашылі паехаць у чэскую Прагу — хацелі вучыцца. Атрымалі ад Рагулі паперы, паехалі туды, а там эвакуацыя. Пра працяг навукі не магло быць і гаворкі. Вярнуліся. А тут сябры ўжо ад’яжджалі ў Дальвіц. Паехалі й яны...
— Дзяўчат у батальёне было мала, і яны праходзілі курсы радыстак. Зразумела, што да іх была павышаная ўвага хлопцаў, асабліва да Тамары. Я быў, мусі, самы непрыгожы. А было шмат добрых, “языкастых” хлопцаў... Мяне хутка адправілі на Беларусь, і мы разлучыліся назаўсёды...
Андрэй Вайтовіч дэсантаваўся ў верасьні 1944 г. на Дзятлаўшчыне, куды яго скінулі памылкова. Перад адпраўкаю Б. Рагуля загадаў яму забыцца пра нямецкія заданьні, а выконваць толькі даручэньні партыйнага кіраўніцтва. Ён павінен быў вэрбаваць сябраў БНП, зьбіраць зьвесткі пра сытуацыю на Бацькаўшчыне й падрыхтаваць лясную пляцоўку для прыёму самалёта.
Усё пачалося добра. Вайтовіч прыйшоў у родныя мясьціны, знайшоў сваіх былых сяброў, сабраў інфармацыю пра дзейнасьць бальшавіцкіх уладаў. Ня ведаў ён, што за ім ужо пільна сочаць агенты дзяржбясьпекі і што выдаў яго Павал Турайкевіч. Той самы Павал, зь якога ў настаўніцкай сэмінарыі ня браў ніякай платы за вучэньне (Вайтовіч быў

гаспадарнікам і зьбіраў харчы, якімі аплочвалася навучаньне), зь якім разам уступалі ў Беларускую Незалежніцкую Партыю, служылі ў эскадроне Рагулі...

— *Сьледчы ў мяне неяк запытаўся: — А как вы относитесь к Турейкевичу?*

Я гавару, што добра. На гэта ён сказаў тады яшчэ не зразумелыя мне словы:

— *Бывают случаи, когда люди могут ошибаться...*

Пасьля, калі знаёміўся са сваёй справаю, убачыў, што першай паперкай быў ордэр на мой арышт, а другой — паказаньні Паўла ў той самы дзень, калі я зь ім сустрэўся...

На допытах мяне пачалі абвінавачваць у прыналежнасьці да СБМ. Я кажу:

— Не! Я быў у самай аўтарытэтнай партыі!

— *В какой?*

— У Беларускай Незалежніцкай Партыі!

Гэбісты патрабавалі ад Вайтовіча раскрыцьця ЦК БНП, складу якога ён ня мог ведаць. Каталі... Шэсьцьдзесят чатыры дні правёў спадар Андрэй у адзіночцы, сядзеў у карцэры, амаль шэсьць дзён трымаў галадоўку, якую гвалтоўна спынілі чэкісты. Нарэшце яго прывялі да міністра дзяржбясьпекі Цанавы. Той пачаў здалёк: “Мы знаем, что ты не советский человек, но вот что тебя заставило вести борьбу с советской властью?..” Пасьля Цанава ня вытрымаў й запытаўся пра галоўнае:

— *Так ты всё-таки скажешь ЦК своей партии?!..*

— Гражданін начальнік, што знаў, я вам сказаў.

— *Нет, нет! Ты пойдёшь в камеру, подумаешь. Мы с тобой ещё встретимся.*

Больш яны не сустрэліся. Неўзабаве Андрэя Вайтовіча адправілі на этапе. Ён атрымаў 8 гадоў лягероў, а пасьля яшчэ адбываў высылку. Толькі ў 1958 годзе Вайтовіч вярнуўся на Беларусь.

Ён нічога ня ведаў пра Тамару. Пытаўся пра яе ў сваіх сяброў, якія дэсантаваліся пазьней, але ад іх ён нічога не даведаўся — маўчалі ўсе, хоць і мелі пэўную інфармацыю. Толькі ад мяне спадар Андрэй даведаўся пра лёс Чэрамшагінай. Сямнаццатага лістапада 1944 году яна дэсантавалася на Віленшчыне. Многія дэсантнікі трапілі ў рукі НКГБ, але Чарамшагіну чэкісты злавіць ня здолелі. Магчыма, Тамара й сёньня жыве на Беларусі ці за яе межамі, але пад іншым прозьвішчам.

— Цяпер існуе шмат розных партый, арганізацый, але яны мне ня вельмі імпануюць, — кажа Вайтовіч. — Ніколі ў мяне не ўзьнікала жаданьня кудысьці ўступіць. Бо ў мяне была й ёсьць толькі адна партыя. Я й цяпер застаюся сябрам БЕЛАРУСКАЙ НЕЗАЛЕЖНІЦКАЙ ПАРТЫІ !

## БЕЛАРУСКІ ГЕНЭРАЛ — АНТЫКАМУНІСТ

Сярод кіраўнікоў БНП было шмат таленавітых вайскоўцаў, якія прысьвяцілі ўсё сваё жыцьцё збройнай барацьбе за незалежнасьць Бацькаўшчыны. Адзін зь іх — генэрал Дзьмітры Касмовіч, кіраўнік Замежнага сэктару Цэнтральнага Камітэту Беларускай Незалежніцкай Партыі. Гэта ён падчас Другое сусьветнае вайны са зброяй у руках абараняў усходнія рубяжы нашай Бацькаўшчыны ад акупацыйнай навалы.

Дзьмітры Касмовіч нарадзіўся 21 верасьня 1909 году ў Нясьвіжы. Вучыўся ў беларускіх гімназіях у Нясьвіжы, Клецку й Радашкавічах, якую скончыў у 1927 годзе. Дз. Касмовіч хацеў атрымаць вышэйшую адукацыю і таму на працягу двух гадоў зарабляў грошы.

У 1929 г. Касмовіч едзе ў Бэльгію й паступае ў Брусэльскі політэхнічны інстытут, арганізуе там Беларускі студэнцкі гурток. Ён уваходзіць у кіраўніцтва Аб'яднаньня Беларускіх Студэнцкіх Арганізацый (АБСА), штаб-кватэра якога знаходзілася ў Празе.

У жніўні 1930 году Дзьмітры Касмовіч разам з Алесем Вітушкам з Прагі рэпрэзэнтаваў АБСА на XII кангрэсе CIE (Міжнароднай Студэнцкай Канфэдэрацыі). У АБСА ў 1930 годзе налічвалася 540 сяброў — беларускіх студэнтаў, якія вучыліся ў Празе, Брусэлі, Бэрліне, Варшаве, Вільні, Рызе. На кангрэсе беларускія дэлегаты выкрывалі палітычны, культурны, рэлігійны й нацыянальны гнёт Масквы й Варшавы над беларускім народам.

У 1931 годзе Дзьмітры Касмовіч вяртаецца ў Польшчу й на працягу трох гадоў праходзіць вайсковую службу. Звольніўшыся з польскага войска, у 1934 г. ён зноў вяртаецца ў Бэльгію й працягвае студыі. Для таго, каб зарабіць грошы на вышэйшую асьвету, ён быў вымушаны працаваць у бэльгійскіх вугальных капальнях. Аднак, і на гэты раз ён недавучыўся. Касмовіч, зь няведамай нам прычыны, выяжджае ў Югаславію й заканчвае студыі ў Бялградзкім

унівэрсытэце. Арганізоўвае тут беларускі студэнцкі гурток і стаецца яго старшынём.
Францішак Кушаль ужо на эміграцыі пісаў пра Касмовіча як пра чалавека з духоўнай асьветай, які нібыта скончыў духоўную праваслаўную сэмінарыю.* Але пацьверджаньня гэтага факту пакуль не ўдалося знайсьці.
Пачатак Другой сусьветнай вайны засьпеў Касмовіча ў Бялградзе. Калі ў Польшчы была абвешчана мабілізацыя, ён вяртаецца на Бацькаўшчыну. Праўдападобна, у польскае войска Дз. Касмовіча прызваць ужо не пасьпелі. Ужо 17 верасьня 1939 году бальшавіцкія танкі ўвайшлі ў Нясьвіж...
Дзьмітры Касмовіч, як адукаваны чалавек, быў прапанаваны мясцовымі жыхарамі на пасаду "бурмістра" і начальніка сацыяльнага забесьпячэньня Нясьвіскага раёну. Ён быў зацьверджаны на гэтай пасадзе ваенным камісарам, які быў беларускім патрыётам. Пазьней Касмовіч працуе гаспадарчым інспэктарам у Нясьвіжы.
У кастрычніку 1939 г. яго выбіраюць дэпутатам на Народны Сход Заходняй Беларусі, які праходзіў у Беластоку. У складзе дэлегацыі Сходу Касмовіч выяжджаў на 5-ю нечарговую сэсію Вярхоўнага Савету СССР і на 3-ю сэсію Вярхоўнага Савету БССР. У Маскве беларуская дэлегацыя сустракалася зь Іосіфам Сталіным. Ведаў бы "правадыр", што сярод тых, хто сфатаграфаваўся зь ім на памяць, быў і будучы генэрал-антыкамуніст, актыўны дзеяч беларускай палітычнай эміграцыі!..
Аднак неўзабаве ўдзельнікам "беларускіх нацыяналістычных студэнцкіх арганізацый" зацікавіліся "органы". Але, папярэджаны адказным урадоўцам-беларусам пра хуткі арышт, ён з дапамогай апошняга выехаў у Менск, дзе паступіў у 1940 годзе ў Беларускі політэхнічны інстытут.
З пачаткам нямецка-савецкай вайны Дзьмітры Касмовіч вяртаецца ў Нясьвіж, але ненадоўга. Хутка ён, Міхал Вітушка й Ігар Шчорс едуць у Менск, каб працаваць дзеля Бацькаўшчыны ва ўмовах новай акупацыі. Па некаторых зьвесткаў, у ліпені-жніўні 1941 году Касмовіч працаваў перакладчыкам нямецкай палявой камэндатуры. Іншыя крыніцы паведамляюць, што ўжо ў ліпені бурмістар Менску Вітаўт Тумаш прызначае яго начальнікам гарадзкой паліцыі. Адначасова Касмовіч кіруе транспартным, прамысловым і гандлёвым аддзеламі Менскае гарадзкое ўправы. Дзякуючы яму, у хуткім часе горад быў забясьпечаны харчаваньнем,

пачалі працаваць гарадзкія хлебапякарні, некалькі сталовак, з Чэрвеню пастаўлялася сьвежая рыба, былі арганізаваныя гарадзкія рынкі для гандлю прадуктамі, якія сяляне прывозілі зь вёскі.
Асабліва цяжка было арганізаваць паліцыю. Сьведамага беларускага элемэнту было мала, у выніку чаго ў яе пайшло шмат крымінальнікаў, п’яніцаў, былых савецкіх вайскоўцаў, супрацоўнікаў НКВД, пакінутых бальшавікамі адмыслова для дывэрсійна-разьведвальнай дзейнасьці. Вацлаў Іваноўскі, які ў кастрычніку  1941 г. наведаў Менск, назваў гарадзкую паліцыю “бандай Касмовіча”. Тым ня менш, ішла “чыстка” шэрагаў паліцыі: у яе ўступалі маладыя беларускія патрыёты (у тым ліку і з дывэрсійнага Першага Штурмовага Зьвязу) ды звальняліся тыя, хто скампрамэтаваў сябе перад насельніцтвам. Шмат у гэтым дапамагаў Касмовічу былы савецкі капітан Міхал Пугачоў, як прафэсійны вайсковец.
Дзесьці на пачатку лістапада 1941 году Дз. Касмовіч, М. Вітушка й Р. Астроўскі выехалі ў Бранск, дзе яны арганізоўвалі беларускую паліцыю й адміністрацыю. Там былі значна большыя свабоды й магчымасьці для дапамогі беларускай нацыянальнай справе, чым у зоне цывільнай адміністрацыі.
Надзеі на адраджэньне незалежнае беларускае дзяржаўнасьці з дапамогай Нямеччыны зьніклі ў многіх патрыётаў ужо ўлетку 1941 г. Немцы не дазвалялі нават фармаваньне беларускіх вайсковых аддзелаў, чаго дабіваўся Уладзімер Шавель. Расчараваўшыся ў нямецкай палітыцы, некаторыя беларускія патрыёты ішлі ў лес і стваралі нацыянальныя партызанскія аддзелы. Іншыя, як і Касмовіч, выяжджалі ўва ўсходнюю Беларусь, якая была пад кіраўніцтвам нямецкага ваеннага камандаваньня.
На пачатку 1942 году разам з Радаславам Астроўскім Касмовіч і Вітушка пераяжджаюць у Смаленск, дзе прыступаюць да арганізацыі паліцыйных аддзелаў. Беластоцкая газэта “Новая дарога” пісала 1 красавіка 1943 г.:
“Нядаўна адбылося ў Смаленску вялікае сьвята Самааховы ўсяе Смаленшчыны. У сувязі з гэтым варта прыпомніць, у якіх абставінах яна зарганізавалася, варта глянуць на яе баявы шлях.
1942 год — вясна. Па ўсёй Смаленшчыне пераліваюцца хваля за хваляй бандыцкія аддзелы, засіляныя рэгулярнымі часткамі Чырвонай Арміі. Паляць вёскі, рабуюць насельніцтва,

забіваюць тых, хто ня хоча да іх прылучыцца. Нямецкія войскі, занятыя барацьбой на фронце і абаронай важных стратэгічных пунктаў, ня мелі часу займацца бандамі. Насельніцтва было кінута на лёс шчасьця. У гэты сумны для Смаленшчыны час зарганізавалася ў Смаленску Акруговая Ўправа пад кіраўніцтвам беларуса Радаслава Астроўскага. Яго супрацоўнік Касмовіч адразу-ж прыняўся за арганізацыю Самаахвоы. З усіх старон пасыпаліся заявы. З усіх старон сьпяшыў народ на барацьбу з чырвонымі бандамі.
Незадоўга маладыя байцы пайшлі ў наступ. Яны неспадзяваным ударам разьбілі моцныя групы бандытаў, вызвалілі ад іх вялікія абшары.
Чуючы небясьпеку, бандыты рабілі контрнаступ. Яны моцнымі сіламі з артылерыяй напалі на Цырыльніцкі апорны пункт. Аднак маладыя байцы вытрымалі асаду, пакуль не падасьпела помач. Бандыты былі разьбіты.
Пад умелым кіраўніцтвам Д.Касмовіча і Вітушкі хутка растуць аддзелы Самаахвоы, вызваляючы штораз то новыя сёлы і раёны. Цяпер Самаахова лічыць шмат тысячаў байцоў, добра ўзброеных аўтаматычным аружжам, гарматамі і танкамі. Небясьпека бандытызму зьліквідавана...
Баявыя вычыны афіцэраў і байцоў Самаахвоы не забыты таксама нямецкімі ўладамі. Нямецкае камандаваньне адзначыла многіх ардэнамі з мячамі “За адвагу”. Сярод іх, як першыя беларусы, атрымаўшыя гэтыя ардэны, выступаюць Касмовіч і Вітушка...”
Дз. Касмовіч камандуе ўсімі фармаваньнямі беларускае паліцыі й Самаахвоы Смаленскае акругі. Адначасна з гэтым падтрымлівае адраджэньне царкоўнага жыцьця на Смаленшчыне, спрыяе адбудове праваслаўных цэркваў. Ён быў дэлегатам ад Смаленшчыны на Ўсебеларускі Праваслаўны Царкоўны Сабор, які распачаў сваю работу 30 жніўня 1942 г. у Менску.
Сабор гэты прыняў шэраг пастановаў, сярод якіх былі наступныя: 1) Аб заснаваньні Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы (БАПЦ); 2) Аб статуце БАПЦ; 3) Тэксты лістоў да Канстанцінопальскага Патрыярха і да іншых аўтакефальных цэркваў з прозьбай прыняць БАПЦ у склад існуючых самастойных цэркваў.
Адначасна з легальнаю ды пры яе дапамозе, Дз. Касмовічам праводзілася й падпольная дзейнасьць. Ён і Міхал Вітушка зьяўляліся сябрамі ЦК падпольнай антыкамуністычнай і

антыфашысцкай Беларускай Незалежніцкай Партыі (БНП). На Смаленшчыне й Браншчыне яны арганізоўвалі падпольныя структуры партыі, а таксама спрыялі пашырэньню нацыянальнага партызанскага руху.
У 1943 годзе на даручэньне ЦК БНП Касмовіч высылае двух дэлегатаў на Ўкраіну на тайную нараду "паняволеных народаў для ўзгадненьня ўтварэньня адзінага супольнага фронту супраць акупантаў і панявольнікаў іхніх народаў і аднаўленьня вольных і незалежных дзяржаваў гэтых народаў". На гэтай нарадзе, арганізаванай бандэраўскай АУН, быў заснаваны Антыбальшавіцкі Блёк Народаў (АБН). Сябра БНП капітан "Дружны" ад імя партыі падпісаў гэтае пагадненьне.
У гэтым жа годзе Дз. Касмовіч скончыў франтавыя курсы штабных афіцэраў і быў прызначаны інспэктарам усіх беларускіх узброеных сілаў прыфрантавой зоны групы арміі "Цэнтар". З набліжэньнем фронту да Смаленску, ён пераяжджае ў Магілёў і ўжо тут стварае беларускія паліцыйныя фармаваньні. Неўзабаве Касмовіча выклікае ў Менск Астроўскі, які ў сьнежні 1943 году стаў прэзыдэнтам Беларускае Цэнтральнае Рады (БЦР).
Дз. Касмовіч быў дэлегатам Другога Ўсебеларускага кангрэсу, які праходзіў у Менску 27 чэрвеня 1944 году. На кангрэсе зачытвалася прывітаньне беларускіх вайскоўцаў, якія падначальваліся Касмовічу і Вітушку: "Другому Ўсебеларускаму Кангрэсу ў Менску, вельмі паважанаму Гаспадару Прэзідэнту Прафэсару Радаславу Астроўскаму.
Жаўнеры Парадкавай Службы — першай беларускай збройнай арганізацыі прысылаюць з усходняга фронту Другому Усебеларускаму Кангрэсу гарачае прывітаньне і жадаюць Яму поўнага посьпеху ў ягонай працы над адбудовай Вольнай і Незалежнай Беларусі. Прыракаем Усебеларускаму Кангрэсу поўную салідарнасьць у ягонай дзейнасьці і пастановах. Прыракаем сваю зброю ня выпусьціць з рук, пакуль не застанецца ніводнага ворага на нашай беларускай зямлі. Жыве Беларусь!
26.06.1944. Жаўнеры і афіцэры Парадкавай Службы, Усходні Фронт".
Зь лета 1944-га Дз. Касмовіч знаходзіцца ва Ўсходняй Прусіі ў мястэчку Дальвіц, дзе праходзілі падрыхтоўку для партызанскай дзейнасьці на Бацькаўшчыне сябры БНП. Сотні маладых беларускіх патрыётаў на заклік БНП

“Здабудзем Беларускую Дзяржаву, альбо загінем у барацьбе за яе!”, былі гатовыя да змаганьня з бальшавіцкім акупантам.
Маёр Дз. Касмовіч атрымоўвае спэцыяльнае заданьне ад старшыні ЦК БНП Усевалада Родзькі й у студзені 1945 г. прыяжджае ў Бэрлін. Загадам генэрала Езавітава ён быў залічаны ў Асобную групу рэзэрву беларускіх вайскоўцаў пры Галоўным Кіраўніцтве Вайсковых Спраў БЦР. Касмовіч падтрымлівае шчыльныя кантакты з кіраўніцтвам латыскіх нацыяналістычных арганізацыяў, вядзе перамовы аб сумеснай барацьбе з бальшавікамі на Бацькаўшчыне. Але галоўная задача Дзьмітрыя Касмовіча была іншая.
У сакавіку 1945-га ён зноў уваходзіць у батальён “Дальвіц” ды рыхтуецца да пераходу на бок саюзьнікаў. Касмовіч яшчэ на верасьнёўскай 1944 году нарадзе ЦК БНП атрымоўвае паўнамоцтвы ўпаўнаважанага прадстаўніка БНП на “Заходняе паўшар’е”, з заданьнем навязаць лучнасьць з заходнімі дзяржавамі для далейшай барацьбы супраць акупантаў за вольную і незалежную Беларускую Народную Рэспубліку. Місія яго была важнай, і таму сьледчыя НКВД неаднаразова распытвалі пра яе ў арыштаванага Ўс. Родзькі. Вось што ён расказваў на допыце ў менскай турме напрыканцы 1945 году:
“Маёра Касмовіча я накіраваў у Парыж з заданьнем, акрамя арганізацыйнай работы па лініі БНП, устанавіць сувязь асабіста або праз іншых нацыяналістаў, ужо ведамых на Захадзе, з ангельскімі ўрадавымі коламі. У гэтых мэтах ён павінен быў скарыстацца падтрымкай інжынэра Абрамчыка — лідэра беларускай нацыяналістычнай эміграцыі ў Парыжы й высьніць праз яго магчымасьць устанаўленьня сувязі з ангельцамі. У выпадку наяўнасьці гэтых магчымасьцяў, у мэтах узмацненьня сваіх пазыцыяў, устанавіць сувязь таксама з украінскімі і рускімі нацыяналістычнымі цэнтрамі ў Францыі.
Па ўстанаўленьню сувязі з ангельцамі давесьці да ведама іх ураду, што беларускія нацыяналісты імкнуцца стварыць незалежную беларускую дзяржаву і што кіруючым цэнтрам палітычнай барацьбы за гэтую дзяржаву на міжнароднай арэне зьяўляецца Беларуская цэнтральная рада, а асноўным чыньнікам барацьбы ў падпольлі на тэрыторыі Беларусі — Беларуская незалежніцкая партыя.
Я даручыў таксама Касмовічу праінфармаваць ангельскае камандаваньне пра сутнасьць спэцыяльнага батальёну

“Дальвіц”, у выпадку канфлікту з Савецкім Саюзам выкарыстаць яго для арганізацыі дывэрсіяў, тэрору і шпіянажу на карысьць ангельцаў. У гэтым выпадку я меў на ўвазе ўстанавіць кантакт з ангельскімі разьведвальнымі органамі й перайсьці на бок ангельцаў усім складам разьведшколы.
...лічу, што Касмовіч сувязь з ангельцамі ўстанавіў, бо з Бэрліну ён накіраваўся на пачатку красавіка 1945 году ў горад Штрасбург і больш адтуль не вяртаўся. Яго паездка супала з прасоўваньнем ангельскіх і францускіх частак у гэтым раёне на ўсход”.**
Касмовічу было цяжка выканаць заданьне цалкам. Ён патрапіў у палон да заходніх саюзьнікаў, праходзіў праверку, і таму пэўны час быў пад арыштам. Пасьля была небясьпека, што яго могуць выдаць бальшавікам, як адбылося з сябрам БНП і падпалкоўнікам БКА Антонам Сокал-Кутылоўскім. Але гэтага ўдалося пазьбегчы. Пачалося жыцьцё у лягерох для перамешчаных асобаў (ДП).
Дзьмітры Касмовіч аднаўляе дзейнасьць БНП у Заходняй Нямеччыне й стварае Замежны сэктар ЦК БНП, які і ўзначальвае. Замежны сэктар меў сувязь з кіраўніцтвам партыі на Бацькаўшчыне. Дзеля гэтага ў асноўным выкарыстоўваліся кур’еры й групы сувязі.
Замежны сэктар ЦК БНП разгортвае сваю працу ў Заходняй Нямеччыне, Бэльгіі, Англіі, Аўстрыі. Выдаваліся нелегальныя ратататарныя часопісы “Праца і Воля”, “За Волю”, шматлікія ўлёткі. Практычна ўсе былі ўпэўнены, што неўзабаве пачнецца вайна Захаду з СССР, і рыхтаваліся да яе. Але палітычны раскол беларускай эміграцыі падарваў сілы Замежнага сэктару. Сам Дз. Касмовіч (мянушка “Каршун”) быў прыхільнікам Р. Астроўскага й БЦР. Сябры ЦК БНП Барыс Рагуля, Міхась Рагуля і Ўладзімер Набагез былі на баку Рады БНР і М. Абрамчыка. У сьнежні 1948 г. Касмовіч здолеў правесьці рашэньне аб выключэньні Рагуляў і Набагеза з сумнеўнай прычыны з шэрагаў партыі. Такім чынам, ён сьвядома адкалоў ад партыі сяброў-прыхільнікаў Рады БНР. Падзел Замежнага сэктару стаў непазьбежны. Толькі новы кіраўнік — незалежны і ад БЦР, і ад Рады БНР ды будучы вялікім аўтарытэтам — мог выправіць становішча. Але Дзьмітры Касмовіч прыняў тое рашэньне, якое палічыў адзіна правільным і якое падтрымалі яго прыхільнікі. Дарэчы, раскол Замежнага сэктару БНП адбыўся яшчэ й па рэлігійных

прычынах: Раду БНР падтрымоўвалі, у асноўным, каталікі ды вуніяты, а БЦР — праваслаўным. Як бы там ні было, а БНП на эміграцыі пасьля гэтага расколу згубіла былую сілу і аўтарытэт...

На эміграцыі існавала вайсковая арганізацыя "Беларускі Вызвольны Рух", якая фармальна падначальвалася Беларускай Цэнтральнай Радзе. БВР дзейнічаў у Нямеччыне й Ангельшчыне, супрацоўнічаў з ангельскай выведкай ды высылаў наземным ды паветраным шляхам разьведвальныя групы на Беларусь (амаль усе групы вярнуліся, выканаўшы заданьне). У 1954 годзе прэзыдэнт БЦР Р. Астроўскі захацеў цалкам падначаліць сабе БВР, але яго кіраўнік палкоўнік Л. Галубовіч-Зарэчны стаяў за незалежнасьць арганізацыі. У выніку, Астроўскі выдаў загад аб прызначэньні новага кіраўніка Руху, якому Зарэчны не падпарадкаваўся. Тады Р. Астроўскі загадаў кіраўніку аддзелу вайсковых справаў і вызвольнай барацьбы БЦР Дзьмітрыю Касмовічу стварыць новую арганізацыю пад назовам "Беларускі Вызвольны Фронт", у які павінны былі ўвайсьці прыхільнікі БЦР зь Беларускага Вызвольнага Руху. Вось так ішла гэтая бессэнсоўная й шкодная беларускай нацыянальнай справе барацьба сярод беларускіх эмігрантаў. У выніку, БВР страціў сваю сілу, а БВФ сілы й уплыву Руху набраць ужо ня здолеў...

БНП (Замежны сэктар) фактычна ўлілася ў БВФронт. Дз. Касмовіч узначаліў Галоўны Штаб БВФ і распачаў выданьне часопісу "Барацьба", які выходзіў пад дэвізам БНП "Беларусь Перадусім!". У 1950-я гады наклад часопіса складаў 1000 паасобнікаў. Аддзелы БВФ стварыліся ў Зах. Нямеччыне, Англіі, ЗША, Аўстраліі й іншых краінах, дзе жылі беларускія эмігранты. Міжнародная сытуацыя зьмянілася й ужо не выпадала спадзявацца на хуткую вайну ЗША з СССР. Таму Фронт зьмяняе тактыку ў барацьбе з бальшавізмам. Тым больш, што ў 1956 годзе было канчаткова разьбітае падпольле Беларускай Незалежніцкай Партыі на Бацькаўшчыне.

Дз. Касмовіч выконваў абавязкі старшыні Дэлегатуры Беларускай Цэнтральнай Рады ў Зах. Нямеччыне і ў Эўропе. Ён прадстаўляў Раду ў Цэнтральным Камітэце Антыбальшавіцкага Блёку Народаў, утворанага яшчэ ў 1943 годзе. З 1954 году Дз. Касмовіч актыўна ўдзельнічае ў Арганізацыі Сусьветнай Антыкамуністычнай Лігі (ВАКЛ), дзе рэпрэзэнтуе Беларусь.

Сябрам якіх бы міжнародных арганізацыяў ня быў Касмовіч, ён выкарыстоўвае любую магчымасьць для пашырэньня інфармацыі пра Беларусь, пра яе гісторыю, пра змаганьне Беларускага Народу за незалежнасьць, пра становішча Беларусі пад бальшавіцкай акупацыяй. Сотні зваротаў, мэмарандумаў, лістовак было выдадзена Беларускім Вызвольным Фронтам за 40 гадоў свайго існаваньня. За актыўны ўдзел у змаганьні за незалежнасьць Беларусі ў гады вайны й на эміграцыі Дзьмітры Касмовіч атрымаў ад прэзыдэнта БЦР Н. Мядзейкі рангу генэрала. Атрымаў ён гэтую рангу заслужана. Рэшту жыцьця Дз. Касмовіч правёў у няспыннай палітычнай дзейнасьці, аж да самай сваёй сьмерці. Памёр генэрал-антыкамуніст 23 красавіка 1991 году ў Нямеччыне, у Штутгарце.

"Дарагія Сябры і ўсе суродзічы! У 66-я Угодкі Патрыятычнага Уздыму Герояў Случчакоў, іх ахвярнасьці для вольнасьці Беларускага Народу, шчыра вітаю ўсіх Вас.

...Прыйдзе той час, калі, паднятыя патрыятычным духам сваіх папярэднікаў, падымуцца маладыя беларускія сілы і здабудуць Вольнасьць і Незалежнасьць Беларускай Дзяржаве. Слава палеглым за вольнасьць Бацькаўшчыны Змагарам! Жыве Беларусь!" (са звароту Галоўнага Штабу БВФ ад лістапада 1986 г.).

---

* Беларускі Гістарычны Агляд, т.1, кн.1, лістапад 1994 г., б. 122.

** Белорусская Нива, 1994, 20 студзеня.

## ЁН БЫЎ НАМЕСЬНІКАМ ВІТУШКІ

З Міколам Рулінскім я пазнаёміўся ў Вільні летам 1997 г. падчас сэсіі Эўрапейскага Сэктару Рады БНР. Ён там прысутнічаў у якасьці ганаровага госьця. У перапынках паміж паседжаньнямі я ўключаў дыктафон і запісваў успаміны сябра Беларускай Незалежніцкай Партыі, дэсантніка "Дальвіцу", намесьніка маёра М. Вітушкі падчас дэсанту 17 лістапада 1944 году.

*ДАВЕДКА: Мікола РУЛІНСКІ нарадзіўся ў 1923 годзе. Падчас нямецкай акупацыі вучыўся ў Наваградзкай настаўніцкай сэмінарыі, а пасьля ўступіў у беларускі эскадрон Барыса Рагулі. Улетку 1944 г. трапіў у дэсантны батальён "Дальвіц",*

*атрымаў рангу лейтэнанта, стаў сябрам БНП. 17 лістапада 1944 г. , як намесьнік маёра Вітушкі, павінен быў дэсантавацца на Беларусі. Удзельнічаў у ратаваньні з акружанай бальшавікамі Рыгі архіву генэрала К. Езавітава. У траўні 1945 году з Чэхіі перабіраецца ў Польшчу, дзе хаваўся. У 1949 годзе быў арыштаваны дзяржбясьпекай, сядзеў у маскоўскіх і менскіх турмах, атрымаў 25 гадоў канцлягераў. На Бацькаўшчыну вярнуўся ў 1957 г. Жыве ў Летуве.*

**— Раскажыце, як Вы трапілі ў “Дальвіц”?**

— У “Дальвіц” я трапіў пасьля таго, як наш эскадрон эвакуяваўся з Наваградку. Я ехаў на адной машыне з Б. Рагулем, на “Татры”. Акрамя нас, у ёй яшчэ была яго будучая жонка й Васіль Рагуля, былы сэнатар польскага Сойму. З Наваградку я выехаў на матацыкле, але пасьля мяне заўважыў Барыс: “Садзіся, — кажа, — у мяне месца ёсьць”. Так мы прыехалі ў Горадню, перайшлі мост, і там нас спаткаў Родзька. Ён быў адзін. Накіравалі нас у Варшаву, дзе мы былі 3-4 дні, і за тры дні перад пачаткам паўстаньня мы паехалі ў Дальвіц. Вось так я туды трапіў.

**— Сп. Мікола, якія інструктары былі ў батальёне?**

— Інструктары былі беларусы. І я сам быў інструктарам, бо быў ужо афіцэр, лейтэнант. Вучылі разьведцы, мінаваньню, радыёсправе й шмат іншаму. Кожны, хто дэсантаваўся, мог быць радыстам. Там былі адмысловыя групы, якія школіліся на радыстаў. Наогул, нас усіх шыкавалі там даволі грунтоўна.

**— Калі Вы ўпершыню спаткаліся зь Вітушкам?**

— Вітушка прыехаў да нас у Дальвіц трохі пазьней. Ён быў невысокага росту, меў прыгожы твар. У скуранцы быў з пагонамі маёра. У адрозьненьне ад Родзькі, Вітушка ня меў “Жалезнага крыжа”. Аж да дэсанту ён быў сярод старшага афіцэрства. А я тады быў афіцэр “новасьпечаны”. Толькі далі мне гэтую рангу. Вось я больш і сябраваў з сваімі сяржантамі. Але да мяне падышлі й сказалі: “Тваё тут ня месца. Ты ідзі ў афіцэрскі корпус”. Вось так.

**— Хто сфармаваў атрад Вітушкі?**

— Наша кіраўніцтва. Геруліс толькі ўсё падтрымоўваў. Ён быў начальнікам зь нямецкага боку. А ўсё рабіў Родзька і Рагуля.

**— Каго Вы памятаеце з дэсантнікаў Вітушкі?**

— Памятаю Мішу Шунько, бо зь ім вучыўся. Прапаў ён недзе. Былі ў нас, у асноўным, наваградзкія хлопцы. Яшчэ былі з “поўначы”, г. зн. з Глыбокага. Бо ў нас у “Дальвіцы” было дзьве групы: “Паўднёвая” і “Паўночная”. Першая — гэта

наваградчане й іншыя з тых мейсц, а другая — хлопцы з Глыбокага, Полацку, Віцебску.

**— Што было перад адпраўкай? Калі Вам сказалі, што Вы ляціце на Беларусь?**

— Калі падабралі групу, нас аддзялілі ад усіх астатніх і рыхтавалі. Тлумачылі, якое мы маем заданьне на Беларусі. І ўсё было арыентавана на тое, што вайна сьпярша скончыцца, а тады распачнецца зноў. І мы павінны былі падрыхтаваць народ, каб пасьля было на што абапірацца...

Узбраеньне было ў нашай групы надта добрае. Кожны меў пісталет, аўтамат, гранаты.

**— Раскажэце, як дэсантаваўся аддзел Вітушкі?**

— У самалёце мы стаялі адзін за адным. Вітушка быў першы, а я — у канцы. Ён нічога не казаў — маўчаў, як, дарэчы, і перад адлётам. Быў спакойны. А я быў яго намесьнікам, мусіў даглядаць, каб усё было ў парадку.

Вітушка скокнуў з парашутам першы. Пасьля за ім — маёр Багдановіч, Янка Гінько, Давідчык, Краскоўская... А ў мяне парашут выляцеў з упакоўкі. Гавару немцу, што парашут сапсаваны, а той бярэ нож і абразае шнур — прыйдзецца вяртацца... Я другому хлопцу, што скакаў, аддаў дакумэнты, грошы (а іх я меў шмат), пячаткі савецкія (сельсаветаў і іншых установаў). Усё аддаў яму.

Выкінулі ўсіх, а я вярнуўся назад. Прыходжу, а Родзька ахнуў: “Што такое?!” Ну я расказваю яму, што нас тры чалавекі вярнуліся, і чаму. Ён кажа: “Ну вось цяпер я табе дам камандзіроўку, паедзеш у Бэрлін да Барыса Рагулі”...

**— Дзе быў раззброены батальён “Дальвіц”?**

— Вясной 1945 году, калі ўжо заканчвалася вайна, мы арганізаваным парадкам адступалі на Захад, усе разам. Камандаваў намі Ўсевалад Родзька. А было гэта ў Чэхаславакіі. І трэба было нам прайсьці адзін гарадок. Родзька гаворыць: “Я пайду ў разьведку ў гэтае мястэчка”. А там ужо чэскія партызаны занялі ўсю тэрыторыю. Ну, ён пайшоў, а мы яго чакаем. У той момант у нас было поўна зброі — “па зубы” былі ўзброеныя. Каб мы ведалі, што нас там гэта чакае, так мы бы пайшлі боем. Ён, як вярнуўся, кажа: “Прапусьцяць нас”. Ён нібыта ўмовіўся зь імі.

Мы заходзім у горад, на нейкі вялікі рынак трапілі. А тут нас абкружылі і кажуць: “Злажыць зброю! А не, дык мы вас усіх тут інтэрнуем! Афіцэры могуць пакінуць сабе пісталеты”. Я памятаю, што ў мяне былі два пісталеты. Але нас ашукалі. Калі

ўсё мы аддалі, яны кажуць: “Гэта таксама выкідай”. Я кінуў адзін пісталет, а адзін у мяне яшчэ быў. Вось так нас прымусілі скласьці зброю... Выйшлі мы з гораду, бяззбройныя, прайшлі кілямэтры два ў лес і затрымаліся. Родзька кажа: “Сытуацыя такая, браткі, што гіблая справа нам. Хто куды хоча і як хоча, разьбягайцеся. Хто знае польскую мову, можа сабе прыкінуцца за паляка. Падбірайце сабе групу”. Ну, сабралося нас тры чалавекі: Мілюць, я і Фарботка. Мы ўсе добра ведалі польскую мову.

Ну й пайшлі мы на захад. Вырашылі як-небудзь праз Эльбу прайсьці. Тры кілямэтры не дайшлі да Эльбы, тут савецкія жаўнеры нас затрымалі: “Куды ідзяце?” А мы ўжо былі ў цывільнай вопратцы, пераапрануліся. Мы кажам: “Мы тут у баўэра працавалі і хочам пайсьці забраць нашы рэчы, якія ў яго засталіся”. “Не! Спачатку ідзіце ў гэты лягер”. А ў тым лягеры сядзелі прадстаўнікі розных нацый, нават французы.

Загналі нас у гэты лягер. З нашага батальёна мы там нікога не спаткалі. Было нас толькі трох. Праз нейкі час пачалі нас правяраць. А нас палякі папярэдзілі, каб не казалі, што мы зь Віленшчыны, як хацелі падаць бальшавікам. Пытаюцца ў нас саветы: “Адкуль?” Я кажу: “З Седлеца (гэта каля Варшавы)”. Ну, і так прапусьцілі. Знайшлі мы паляка, які ехаў ад баўэра й меў двое коней і вялікую павозку. Мы яму кажам: “Ідзем разам”. Ён гаворыць: “Сядайце, паехалі”. І так мы дабраліся да Кракава, як “палякі”. А там быў аддзел рэпатрыяцыі й ён накіроўваў на “землі адзысканыя” на захад Польшчы. І вось паехалі мы ў Ліпніцу. Там я ўладкаваўся працаваць у міністэрства нованабытых земляў. Там мне было добра. Жыў я так да 1949 году, калі на мяне выйшла дзяржбясьпека й арыштавала...

**— Што сталася з Вашымі сябрамі?**

— Маіх сяброў таксама арыштавалі, хоць і жылі яны ў розных месцах. Фарботка ўтапіўся ў Нёмане каля Любчы, ужо пасьля вяртаньня з лягероў. Быў арыштаваны ў Польшчы й мой добры сябра Ігар Будахоўскі, афіцэр “Дальвіцу”. Магчыма, што ён яшчэ жыве на Беларусі. Можа адгукнецца?..

## “ТАДЫ МЫ ПАЧАЛІ ДЗЕЙНІЧАЦЬ...”

Трэцяга ліпеня 1997 году ў Віленскім аэрапорце мы сустракалі Барыса Рагулю. Чакаючы свайго былога камандзіра, пастроілася невялікая група ветэранаў — вайскоўцаў

Наваградзкага беларускага эскадрону, батальёну “Дальвіц”, сяброў Беларускай Незалежніцкай Партыі. Яны прыехалі з Любчы, Слоніму, Баранавіч, Вільні... Рапартаваў і чытаў адмыслова напісаны верш “Швадрон, зважай!” былы афіцэр Уладзімер Сіўко, абдымаў свайго былога партыйнага кіраўніка Андрэй Вайтовіч...
А пасьля, на кватэры Кастуся Шышэі, адбылася сяброўская бяседа “рагулеўцаў”. Ім было што ўспомніць, абмеркаваць, расказаць... Шмат гаварылі пра Незалежніцкую Партыю і яе кіраўніка Ўсевалада Родзьку, які загінуў на бальшавіцкай шыбеніцы. Задаў некалькі пытаньняў Барысу Рагулі і я.
**— Сп. Барыс, калі Вы ўпершыню пачулі пра БНП?**
— Фактычна, дзесьці ўжо ў красавіку 1942 году... Пачалося ўсё з таго, што немцы запрапанавалі мне паехаць у Нямеччыну. Яны ня ведалі, што я быў у іх у палоне. Між іншым, ніхто ў Навагрудку ня выдаў немцам, што я ўцёк з палону. А калі б хто выдаў — вярнулі б у лягер...
Я добра ведаў нямецкую мову, працаваў перакладчыкам у камісарыяце. Здабыў іх досыць добрую апінію. Гэта дало мне магчымасьць дапамагчы многім беларусам, якім пагражалі расстрэлы праз даносы палякаў-перакладчыкаў. Нам удалося пераняць у свае рукі адміністрацыю. Апанавалі мы сваімі людзьмі й камісарыят. А вось паліцыя засталася ў польскіх руках і яна перакупіла польскімі прастытуткамі жандармэрыю. Яны мелі такую сыстэму, якую і мы пасьля выкарысталі ў адносінах да Наваградзкага СД.
У Нямеччыне мне было важна паглядзець, як маюцца тыя людзі, якія паехалі туды на работу. Я зайшоў у гэтыя лягеры ўсходніх работнікаў, называных “ОСТ”. Я пабачыў, што гэта ўпрост канцлягер цяжкай фізычнай працы, дзе людзі галадалі. Беларусы насілі знак “ОСТ”, як жыды насілі “Зорку Давіда”. Аб’ехаў некалькі лягероў і ўжо дасьпяваў у мяне плян, што калі вярнуся дадому, забаронім усякі “дабраахвотны” выезд у Нямеччыну. Калі я вярнуўся ў Навагрaдак, сабраў у сэмінарыі хлопцаў і кажу: — Хлопцы, вы едзеце на канікулы. Перадавайце, каб ніхто зь вёсак на работы ня ехаў...
Тады й паўстала вострa гэтае пытаньне. Немцы абсалютна не апраўдалі нашага даверу. Павінна была быць Самаахова, але яны не далі зброі. Трэба было шукаць нейкага іншага выхаду. Я спаткаўся тады зь Мішкаю Рагуляй... Але тут немцы даведаліся пра вынік маёй паездкі й звольнілі мяне з працы

перакладчыка, і я ўжо ня меў больш кантактаў з наваградзкім камісарам...
Тады мы пачалі дзейнічаць. Да мяне прыехаў Мішка Рагуля й кажа: "Барыс, нам трэба арганізаваць нелегальную партыю". Ці Родзька быў пачынальнікам, ці Гадлеўскі, мы ня ведалі. Фактычна, мяне ўцягнулі ў гэта Родзька й Рагуля. Яны сказалі, што арганізацыйны зьезд будзе ў пачатку чэрвеня 1942 году ў Менску, у кватэры шэфа паліцыі Саковіча. Я ведаў яго, як пазытыўнага беларуса. Я спатыкаўся зь ім пару разоў у Менску.
**— Хто быў на той нарадзе?**
— На кватэры Саковіча быў я, Мішка Рагуля, Родзька, Адамовіч, Шкялёнак (у пазьнейшы час першы заступнік Астроўскага)... Адамовіч, як дазнаўся пра што гутарка, выйшаў. Кажа: "Я ўжо адседзеў у савецкай турме досыць і больш там не хачу быць". Нас там было сем чалавек. Родзька меў гатовую праграму беларускай нелегальнай партыі. Мэтай яе было паказаць, што беларусы ня ёсьць ані прасавецкія, ані пранямецкія, а прабеларускія. Вырашылі выдаваць падпольны бюлетэнь...
— **Шкялёнак увайшоў у Цэнтральны Камітэт БНП?**
— Так. Ён фактычна вёў аддзел вонкавай палітыкі. Шкялёнак быў адным з найлепшых ідэолягаў партыі. Акрамя таго, ён быў таксама вельмі добрым палітыкам, які прадбачыў у перадапошнім "Бюлетэні БНП" падзел Нямеччыны на ўсходнюю й заходнюю часткі. І ён заклікаў, калі хто выяжджае, каб выяжджалі як надалей на захад, каб ня трапіць пад савецкую акупацыю. Была думка, што аліянты, пасьля перамогі над Нямеччынай, павернуць на ўсход. Ён кажа: "Тыя, хто так думае, ня ведаюць дэмакрацыі. У дэмакрацыі, каб зьмяніць прыяцеля на ворага, трэба шмат часу, гадоў, каб зьмяніць публічную апінію. Бо публічная апінія вырашае палітыку дзяржавы". Ён меў рацыю. Амэрыканцы не маглі сказаць, што саветы ўжо не прыяцелі, а ворагі Амэрыкі. Яны не маглі павярнуць зброі, калі б нават і хацелі... Ён прадбачыў правільна. Прадбачыў, што трэба рыхтавацца на доўгае выгнаньне. У той час, калі ўсе мы думалі, што вось год-два і вернемся назад...
**— Хто яшчэ ўвайшоў у ЦК?**
— Я быў у ЦК (мянушка "Менскі"), Мішка Рагуля, Родзька, Саковіч. Магчыма былі й іншыя сябры ЦК, але гэтага я ня ведаю. Магчыма, што Родзька меў і другую групу людзей. Бо

ведаеце, зьлавілі аднаго, другога і ўсё... Была ў нас сыстэма “пяцёрак”. Іх ствараў кожны з сяброў ЦК, а завэрбаваныя сябры арганізоўвалі свае “пяцёркі”.
Фактычна, нашая акцыя заключалася ў тым, каб падрыхтаваць і захаваць гэтую падпольную сетку, нават на той выпадак, калі вернецца савецкая акупацыя. Родзька мала ведаў савецкую сыстэму, але спадзяваўся, што падпольная сетка пад саветамі ўтрымаецца. Ён пакінуў людзей ва ўсходняй Беларусі: у Віцебску, на Магілёўшчыне. Родзька пакінуў там сетку. Але я ня думаю, што гэтая сетка ўтрымалася. Пасьля перамогі Савецкага Саюзу многа людзей засталося там, а што зь імі сталася пасьля, мы ня ведаем...
**— У адным зь інтэрвію Вы ўспаміналі пра паўстаньне, якое рыхтаваў Родзька ў Менску напрыканцы чэрвеня 1944 году...**
— Сапраўды, у Родзькі быў плян путчу ў Менску падчас Другога Ўсебеларускага кангрэсу. Асноўнай сілай мяркуемага паўстаньня мусіў стаць мой батальён, што знаходзіўся пад Докшыцамі. Нам павінны былі падаць эшалён, каб мы пераехалі ў Менск. Там сталі б галоўнай сілай аховы кангрэсу. Плянавалі абвясьціць незалежную Беларускую Народную Рэспубліку.
Але эшалёну немцы не далі. Магчыма, яны нешта пранюхалі. Калі цягнік ужо падалі, дык у Менск ехаць было запозна і мы паехалі ў Наваградак. Ці не была гэта мая памылка? Ці трэба было весьці батальён дахаты? Бо там ён моцна парадзеў... Канечне, хлопцы хацелі вярнуцца ў родныя мясьціны, да сваіх сем’яў. Так я й зрабіў. Бог рассудзіць, ці правільна я паступіў.
У Наваградак мне Родзька праз нямецкую тайную пошту даслаў тэлеграму. У ёй ён намякаў, што будзе створаны беларускі батальён (“Дальвіц”). Паведаміў, што будзе чакаць мяне ў Горадні.
У Горадні мы спаткаліся. Родзька прапанаваў мне працаваць у батальёне. Я паставіў умову, што дам згоду толькі ў тым выпадку, калі гэты батальён будзе выкарыстаны толькі тады, калі фронт (немцы) ізноў пойдзе на ўсход або калі пачнецца амэрыканска-савецкі канфлікт. Але толькі не скарыстоўваць яго ў існуючай сытуацыі.
Родзька пагадзіўся з гэтым. Магчыма, ён ужо тады думаў зрабіць інакш — Родзька вельмі хацеў арганізаваць партызанку й падпольле пад саветамі. Але ён ня ведаў гэтых саветаў. Ён хацеў, каб калі б пачаліся нейкія падзеі, на

Беларусі ўжо былі б гатовыя людзі, структуры. Ён яшчэ мне сказаў, што “займайся вайсковай падрыхтоўкай, а я буду — палітычнай”.
Аднак усё атрымалася трохі інакш. Каб разьведаць сытуацыю на Бацькаўшчыне, паслаў я Андрэя Вайтовіча... А пасьля мне давялося ўцякаць у Бэрлін. Справа ў тым, што я заўсёды “лез на ражон”, у адкрытую змагаўся зь немцамі, казаў праўду. А Родзька быў больш лагодны, паказваў “лаяльнасьць”. Ён хацеў усіх перахітрыць... У Бэрліне я спрабаваў дабіцца, каб “Дальвіц” перакінулі на захад, але было ўжо запозна...

## ЗАГІНУЎ НА БАЛЬШАВІЦКАЙ ШЫБЕНІЦЫ...

Іван Антонавіч Гелда быў адным з нешматлікіх старых беларускіх вайскоўцаў-змагароў, якія ўваходзілі ў кіраўніцтва Беларускай Незалежніцкай Партыі. Ягоная дасьведчанасьць у вайсковых і палітычных справах, вялікі жыцьцёвы досьвед шмат у чым дапамагалі маладым незалежнікам. Ён ня толькі вучыў іх, як трэба змагацца супраць ворага за незалежнасьць Бацькаўшчыны, але і ўласным прыкладам, самаахвярнасьцю дэманстраваў гэта. І. Гелда й загінуў як герой на сваёй баявой постані.
Нарадзіўся Іван Гелда на Сакольшчыне (Беласточчына) у 1897 годзе. У Першую сусьветную вайну ён ваяваў супраць немцаў у складзе расейскае арміі, меў афіцэрскую рангу. Пасьля захопу ўлады ў Расеі бальшавікамі, Гелда ўступае ў армію генэрала Юдзеніча й ваюе з аддзеламі Чырвонай Арміі ў Эстоніі ды на подступах да Петраграду. Калі генэрал-маёр Станіслаў Булак-Балаховіч пачаў “беларусізацыю” ў сваім войску, І. Гелда пераходзіць да яго. Разам з “бацькам” ён ваюе пасьля на Палесьсі, удзельнічае ў паходзе на Мазыр.
У міжваеннай Польшчы Іван Гелда прымае актыўны ўдзел у беларускім нацыянальна-вызвольным руху. На Беласточчыне ён быў адным з кіраўнікоў Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады, кіраваў ёю ў Сакольскім павеце. У студзені 1927 г., сярод іншых актывістаў-грамадоўцаў, Гелда быў арыштаваны польскай паліцыяй. Аднак невядома на які тэрмін зьняволеньня яго засудзілі й дзе адбываў пакараньне.
Ёсьць зьвесткі, што Іван Гелда быў сябрам падпольнай Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі. Адначасова ён працягваў трымаць кантакт з былымі актывістамі Грамады. Ацалелыя вядомыя грамадоўцы нелегальна дзеялі ўсе 30-я гады. Яны выкарыстоўвалі ў сваіх мэтах Беларускую

нацыянал-сацыялістычную партыю Акінчыца-Казлоўскага і Беларускі нацыянальны фронт а. Гадлеўскага. Грамадоўцы ўступалі ў гэтыя арганізацыі ды стваралі на месцах суполкі, і дзеялі пад шыльдаю БНСП і БНФ. Польская паліцыя хутка гэта выкрыла ды правяла арышты, разьвязаўшы частку суполак. Апошняя передваенная нарада грамадоўцаў адбылася на пачатку 1939 году ў Баранавічах. Ад Беласточчыны на яе прыехалі Васіль Лукашык, Канстанчук і Іван Гелда. Вырашалася пытаньне дзеяньня грамадоўцаў на выпадак вайны Польшчы з Нямеччынай ды плянавалася супрацьпольскае паўстаньне на Палесьсі. Аднак Гелда прыняць у ім удзелу ня змог, бо быў арыштаваны польскай паліцыяй адразу пасьля выбуху вайны. Але зьняволеньне доўжылася нядоўга – фашысты й бальшавікі імкліва акупавалі абшары былой польскай дзяржавы.
У верасьні 1939-га Гелда вымушаны быў ратаваць сваё жыцьцё і ўцякаць на польскую тэрыторыю, акупаваную немцамі, бо добра ведаў, што зробяць зь ім, былым балахоўцам, бальшавікі.
Летам 1941 году Гелда вярнуўся ў Беласток, спрабаваў зрабіць нешта дзеля Бацькаўшчыны. Аднак ягоныя памкненьні знаходзілі перашкоду з боку нямецкіх уладаў ды, наогул, нямецкай акупацыйнай палітыкі. З восені 1941-га Гелда – сябра ўправы Беларускага аб'яднаньня ў Беластоку. Але ён не парывае сувязі з былымі сябрамі па Грамадзе. Калі ўвосень 1941 году камэндант Менскае беларускае паліцыі Юльян Саковіч склікаў нараду грамадоўцаў у Менску, Гелда прыбыў на яе разам з Лукашыкам (бурмістрам Беластоку, які ў 1942 г. уцёк у Швэцыю). На нарадзе была створана падпольная "Беларуская Народная Грамада" ды быў прыняты плян далейшых дзеяньняў. І. Гелда адстойваў на нарадзе неабходнасьць супрацоўніцтва зь немцамі, каб мець на іх нейкі ўплыў ды ствараць беларускія ўзброеныя аддзелы.
Летам 1942 году Іван Гелда вэрбаваў на Беласточчыне беларускіх хлопцаў у афіцэрскую школу, якая павінна была адчыніцца ў Менску. Аднак ён не ўлічыў, што Беластоцкі "бэцырк" быў далучаны да Ўсходняй Прусіі. Таму Гелда і Уладзімер Тамашчык не атрымалі ад немцаў дазволу на адпраўку ў Менск 20 завэрбаваных асобаў.
У 1943 г. ў Беластоку паўстаў беларускі батальён (120 чалавек), камандзірам якога ў ранзе капітана быў прызначаны Гелда. Фактычна, гэта была вайсковая адзінка з

паліцыйнымі функцыямі. Увосень 1943 году ў Беласток з Украіны быў пераведзены ўкраінскі батальён (каля 200 чалавек), у якім было шмат прадстаўнікоў іншых нацыянальнасьцяў. Украінскія вайскоўцы разьмясьціліся ў адным будынку з беларусамі. Спачатку яны мелі чорную ўніформу, але нядоўга – хутка яе зьмянілі на такую ж, што насілі й беларускія жаўнеры. Украінскі батальён мусіў весьці барацьбу з партызанамі.
Аднак хутка Гелда даведаўся, што яны рабавалі насельніцтва ды ўчынялі розныя злачынствы. Адбылася тайная нарада беларускага актыву, на якім пастанавілі прасіць немцаў, каб да кожнай групы ўкраінскага батальёну, што ішла на “заданьне”, далучаць двух беларусаў. Гэта дазволіла б ведаць, што яны робяць. Немцы далі згоду. Зразумела, што ўкраінцам гэта не спадабалася, але яны вымушаны былі пагадзіцца зь “беларускім кантролем”.
У траўні 1944 году нямецкае гестапа арыштавала ў беларускім батальёне каля 20 чалавек, у тым ліку, Гелду, Міколу Грыцука, Алеся Асяцімскага, Смактуновіча, Матыса, Нігерэвіча ды іншых. Усім ім закідалася абвінавачваньне ў прыналежнасьці да Беларускай Незалежніцкай Партыі, якая, па зьвестках гестапа, пашыралася ў беларускім батальёне. Аднак на допытах ніхто з арыштаваных не прызнаўся ў сяброўстве ў БНП (на Беласточчыне БНП кіраваў якраз Іван Гелда). Тым ня менш, беларускім вайскоўцам пагражаў расстрэл і толькі імклівае адступленьне немцаў зь Беларусі выратавала іх ад сьмерці.
22-25 чэрвеня (па іншых зьвестках – на пачатку ліпеня) 1944 г. адбывалася эвакуацыя беластоцкае турмы, падчас якое вязьні былі падзеленыя немцамі на дзьве групы. Міхась Белямук успамінае, што “адзін з гестапаўцаў угледзеў Гелду і сказаў яму забіраць знаёмых хлапцоў і мужчынаў. Гелда ня ведаў, які лёс іх чакае, але інструкцыю гестапаўца выканаў, сабраў вакол сябе даволі вялікую колькасьць асобаў. Пачалі заяжджаць грузавікі, у якія грузілі людзей ды вывозілі. Групу, дзе быў Гелда, не пагружалі ў грузавікі, але адчынілі турэмную браму й адпусьцілі на волю”.
Адпачыўшы некалькі дзён, І. Гелда зьявіўся ў батальён, якім камандаваў у яго адсутнасьць Сяргей Матысік, і загадаў усім перабірацца ў Белавескую пушчу, каб пераўтварыцца ў партызанаў. Аднак ягоны загад ня быў выкананы Матысікам, які сабраў людзей і сказаў, што ён асабіста супраць

партызаншчыны. Аднак паабяцаў, што кожны жадаючы ісьці ў лес будзе добра забясьпечаны зброяй і амуніцыяй. Каля 35% асабовага складу батальёна пайшло ў Белавескую пушчу. Рэшта на чале з Матысікам выехала ў Ломжу, дзе яшчэ каля пятнаццаці чалавек былі прыцягнены Алесем Асяцімскім і Міколам Грыцуком у беларускую антысавецкую партызанку. Сам С. Матысік раіў усім адступаць, бо ня верыў у хуткую вайну Захаду з СССР, але і не перашкаджаў тым хлопцам, якія вырашылі змагацца з бальшавікамі.
Дакладна невядома ці ўдзельнічаў Іван Гелда ў Другім Усебеларускім кангрэсе ў Менску. Як бы там ні было, а ўжо ў ліпені 1944 г., як сябра БНП, ён з часткай сваіх хлопцаў едзе ва Ўсходнюю Прусію, дзе ў мястэчку Дальвіц была распачата падрыхтоўка беларускай моладзі для партызанскай дзейнасьці на Бацькаўшчыне. Гелда ў ранзе маёра Беларускае Краёвае Абароны зьяўляўся камандзірам гэтага спэцыяльнага беларускага батальёна "Дальвіц". Барыс Рагуля, які ў той час таксама быў у гэтай вайсковай адзінцы, успамінае: "Я мала ведаў маёра Гелду. Ён быў даволі высокі, здаровы, тып афіцэра – прамалінейны, праўдзівы, як што трэба сказаць. Любіў выконваць і даваць загады. Па ранзе ён быў малодшы Родзькі, але Гелда быў старэйшы векам. Гэта быў просталінейны патрыёт, афіцэр. "Загад выконваю, загад даю і ён мусіць быць выкананы".
У лістападзе 1944 г. рэшту Беластоцкага беларускага батальёну, дзякуючы намаганьням Сяргея Матысіка, немцы згадзіліся перакінуць праз Данію ў Нарвэгію. Перад адпраўкай, у Бэрліне сваіх былых падначаленых наведаў І. Гелда. Ён крытыкаваў Матысіка за тое, што ён "уцякае ад змаганьня за Беларусь". На гэта той адказаў: "Загубіць моладзь мне не дазваляе сумленьне, яе трэба зьберагчы, яна можа быць вельмі патрэбная ў будучыні". На гэтым яны й разышліся.
На пачатку лютага 1945 году маёр Іван Гелда быў выкліканы ў Бэрлін, уведзены ў склад Беларускай Цэнтральнай Рады. Батальён "Дальвіц" у гэты час ужо знаходзіўся каля Бэрліну й працягваў падрыхтоўку. У красавіку 1945-га адбылася нелегальная канферэнцыя БНП, на якой аформілася Беларуская Вайсковая Арганізацыя, якая павінна была ачоліць партызанскае змаганьне на Беларусі. У ёй браў удзел і Гелда. Калі грамадоўцы прапанавалі яму перабірацца на

Захад, ён адказаў наступнае: “Я хачу прысьвяціць усё сваё жыцьцё ўзброенай барацьбе за вызваленьне Беларусі”.
На пачатку траўня 1945 году батальён “Дальвіц” апынуўся ў Чэхіі, дзе ён быў раззброены мясцовымі паўстанцамі. Па адной з вэрсій, каманду аб здачы зброі аддаў маёр Гелда, калі Родзька ў батальёне адсутнічаў. Бо не хацеў праліваць крыві. Па другой вэрсіі, загад аддаў Родзька, калі ягоны аддзел трапіў у засаду ў адным з чэскіх мястэчак. Пасьля гэтага жаўнеры і афіцэры “Дальвіцу” разьбіліся на групы й прабіваліся ў Польшчу й на Беларусь. Дакладна невядома, калі й пры якіх абставінах трапіў у рукі чэкістаў маёр Іван Гелда. Аднак ужо ў чэрвені 1945 году ён даваў паказаньні сьледчым дзяржбясьпекі. Сьледзтва цягнулася да вясны 1946 г. Гелда праходзіў па “справе шасьці” й быў засуджаны бальшавіцкімі акупантамі да кары сьмерцю. Беларускія эміграцыйныя крыніцы паведамляюць, што славуты беларускі вайсковец быў павешаны ў Беластоку…

## ЗМАГАР ЗА ВОЛЮ НАРОДА

Адным з найбольш выдатных беларускіх нацыянальных дзеячаў падчас Другой сусьветнай вайны быў Юльян Саковіч. Арганізатар беларускіх вайсковых і паліцыйных аддзелаў, падпольных арганізацый, ён бясстрашна бараніў беларускі народ перад нямецкімі акупацыйнымі ўладамі. Ю. Саковіч імкнуўся аб’яднаць увесь беларускі нацыянальны актыў: і сацыялістаў, і нацыяналістаў, ды скіраваць іх агульныя высілкі на барацьбу за дзяржаўную незалежнасьць Беларусі.
Юльян Саковіч нарадзіўся 24 жніўня 1906 году ў фальварку Баўдыры Крэўскае воласьці Ашмянскага павету ў заможнай сялянскай сям’і. Бацька хацеў бачыць сына адукаваным і нацыянальна сьведамым ды накіраваў яго вучыцца ў Віленскую беларускую гімназію. Тут Юльян знаёміцца з падпольнымі камуністычнымі выданьнямі, уступае ў камсамол. На пачатку сьнежня 1925 г. яго арыштоўвае польская паліцыя й трымае ў турме цэлы месяц. Справа Саковіча была ўзьнята ў польскім Сойме паслом Юрыем Сабалеўскім 24 сакавіка 1926 году. Сабалеўскі прыводзіў у сваім выступленьні паказаньні Саковіча пра зьдзекі над ім польскіх паліцыянтаў: “Пасьля арыштаваньня… хочучы змусіць мяне да фальшывых паказаньняў проці маіх зьверхнікаў, агенты палітычнай паліцыі нялюдзкім спосабам

зьдзекаваліся нада мною... Білі мяне па твары, потым зьнялі гамашы і гумовымі прутамі білі ў пяты”.

Скончыўшы гімназію, Саковіч быў ужо сьведамым камуністам. “Старэйшыя таварышы”, насланыя ў Заходнюю Беларусь з БССР, вельмі актыўна працавалі сярод беларускай моладзі. Асабліва вялікую ўвагу яны надавалі беларускаму студэнцтву, як найбольш актыўнай частцы моладзі. У існуючы пры Віленскім унівэрсытэце незалежніцкі Беларускі студэнцкі саюз засылаліся камсамольцы, якія павінны былі або захапіць БСС, або яго ліквідаваць. Уступіў у Саюз і Юльян Саковіч, які вучыўся ва ўнівэрсытэце на агранома, прайшоўшы добрую школу Беларускай сялянска-работніцкай Грамады.

Спачатку камсамольцы вялі ў БСС прапагандысцкую дзейнасьць, якая не дала жаданых вынікаў. Пасьля яны распачалі “падрыўную” дзейнасьць, спрабуючы раскалоць арганізацыю. Але й тут атрымалі паразу: некаторыя студэнты-камсамольцы, у тым ліку і Саковіч, былі выключаны з Беларускага студэнцкага саюзу. У ліпені 1929 году Юльян Саковіч з сябрамі пачынае выдаваць часапіс “беларускага прагрэсіўнага студэнцтва” “Вольная думка”. Аднак аб’яднаць вакол “Вольнай думкі” значнай колькасьці студэнтаў не ўдалося, а сам часапіс спыніў сваё існаваньне на другім нумары, які выйшаў у сьнежні 1929 г. Адной з прычын гэтага стаўся арышт польскай паліцыяй Ю. Саковіча.

Паводле некаторых зьвестак, частыя арышты перашкодзілі Саковічу закончыць унівэрсытэт. Але кар’ера яго ня вельмі хвалявала. Беластоцкая газэта “Новая дарога” пісала ў 1943 годзе: “Сын багатых бацькоў, ён ніколі ня думаў аб тым, каб пайсьці на кампраміс з ненавіснай яму польскай уладай і забясьпечыць сабе спакойнае, добрае жыцьцё. Не, яго лёзунгам было дабро цэлага беларускага народу. Дзеля гэтага дабра ён працаваў, змагаўся. За гэта сядзеў ня раз у польскіх турмах. Але гэта яго не зламала. Якія толькі беларускія арганізацыі ў Вільні існавалі, ён у кожнай быў дзейным сябрам, заўсёды радасны, заўсёды з усьмешкай, поўны запалу. Усе беларусы, працуючыя разам зь ім, шанавалі яго, любілі за самахвярнасьць, за шчырую працу”.

Саковіч актыўна працуе ў Таварыстве беларускае школы (ТБШ). На пачатку 1933 году ён і яшчэ некалькі дзеячаў Таварыства былі арыштаваныя “за камуністычную дзейнасьць”. Большасьць арыштаваных была апраўданая, а Саковіч, сябра Нагляднае Рады ТБШ, атрымаў тры гады

турмы. Адбыўшы тэрмін зьняволеньня, у 1936 годзе ён зноў арыштоўваўся польскай паліцыяй.
На пачатку 1939 году ў Баранавічах на нелегальную нараду сабраліся былыя актывісты Грамады. Яны прагназавалі хуткі пачатак вайны Нямеччыны з Польшчай, і таму абмяркоўвалі сваю тактыку дзеяньняў у гэтых умовах. Быў прыняты плян антыпольскага паўстаньня на выпадак вайны, з мэтай абвяшчэньня незалежнае Заходнебеларускае рэспублікі. Юльян Саковіч удзельнічаў у гэтай нарадзе, аднак прыняць удзелу ў паўстаньні ня змог, бо быў у чарговы раз арыштаваны польскай паліцыяй.
Пачатак нямецкай агрэсіі звольніў Саковіча з канцлягера ў Бярозе-Картускай. Ён вяртаецца ў родныя мясьціны, дзе ўжо ўсталёўвалася савецкая ўлада. Здавалася, што нарэшце настаў той час, калі спраўдзіцца ўсё тое, за што ён змагаўся ўсе гэтыя гады, але настала вялікае расчараваньне. Ю. Саковіч трапляе ў турму НКВД, дзе ў яго самымі жорсткімі мэтадамі выбіваліся патрэбныя чэкістам паказаньні. Гэта быў крах рэшты ілюзій наконт “беларускага дому” ў БССР. Зьдзекі й катаваньні доўжыліся месяцамі й скончыліся 22 чэрвеня 1941 году.
Саковіч уцякае з турмы й вяртаецца ў бацькаву хату. З прыходам немцаў на яго распачынае паляваньне польская паліцыя, якая была на службе ў акупантаў. Летам 1941 г. палякамі было расстраляна або выдадзена немцам для ліквідацыі толькі ў Заходняй Беларусі да тысячы актывістаў КПЗБ, ТБШ, Грамады. Юльяну Саковічу нейкім цудам удалося вырвацца з рук польскай паліцыі й уцячы ў Менск.
Ю. Саковіч, разьвітаўшыся са сваімі камуністычнымі ілюзіямі, уключаецца ў барацьбу за дзяржаўную незалежнасьць Беларусі. Ён і шмат іншых беларускіх патрыётаў, ацалеўшых у турмах НКВД або прыехаўшых з эміграцыі, распачынаюць актыўную дзейнасьць па стварэньні беларускіх вайсковых і паліцыйных аддзелаў, грамадзкіх арганізацый і школьніцтва. Саковіч быў камэндантам паліцыі Менскае акругі, а пасьля гораду Менску. У кастрычніку 1941 году яго прызначаюць начальнікам адміністрацыйнага аддзелу Беларускае народнае самапомачы (БНС). Многія ведалі пра камуністычнае мінулае Саковіча, і ў СД на яго пасыпаліся даносы. Але немцы да былога вязьня бальшавіцкіх турмаў адносіліся з даверам. Пазьней яны ўспомняць пра гэтыя паперы, калі будуць падпісваць Саковічу сьмяротны прысуд...

Ужо ў жніўні 1941 г. Юльян Саковіч праз бурмістра Віцебска Усевалада Родзьку ўваходзіць у беларускую кансьпірацыйную дзейнасьць. У 1942 годзе ён ужо ў кіраўніцтве Беларускай Незалежніцкай Партыі, кіруе Менскім акруговым камітэтам БНП. На менскай кватэры Саковіча праходзілі канферэнцыі і зьезды БНП. Адначасова Ю. Саковіч зьяўляўся правадыром нелегальнай арганізацыі Беларуская Народная Грамада, у якую ўваходзілі былыя сябры БСРГ 1925-27 гг. Першая нарада адбылася ў Менску ўвосень 1941 г. і на ёй прысутнічалі 9 чалавек. У 1942 годзе на Палесьсі, дзякуючы грамадоўцам, удалося аб'яднаць некалькі дзесяткаў патрыятычных атрадаў і груп у Беларускую народную партызанку, камандзірам якой стаў былы савецкі афіцэр Іван Шанько.
Летам 1942 году Ю. Саковіч уваходзіць у штаб па фармаваньні вайсковых частак Беларускае самаахоны (БСА), падпісвае адпаведны заклік да беларускага народу (акрамя яго там былі подпісы І. Ермачэнкі, а. В. Гадлеўскага, Арх. Філафея, В. Іваноўскага і Ўл. Казлоўскага).
Нямецкія спэцслужбы мелі інфармацыю пра беларускую кансьпірацыю. Іх агентура не сядзела бяз працы. Бачачы ў Саковічу аднаго з кіраўнікоў Нацыянальнага Супраціву, немцы пачынаюць адсоўваць яго ад уплывовых пасад. Ад жніўня 1942-га да траўня 1943 году ён працаваў кіраўніком Самапомачы Менскае акругі. Саковіч не баяўся нямецкіх рэпрэсій і пратэставаў супраць паленьня эсэсаўцамі беларускіх вёсак і масавых забойстваў мірнага жыхарства, чым моцна настроіў супраць сябе нямецкія эсэсаўскія ўлады. У выніку, яго пазбаўляюць займаных пасад і высылаюць у Ліду на становішча акруговага старшыні БНС. Польскае падпольле апэратыўна даведалася пра прыезд Саковіча й прысудзіла яго да сьмерці.
Лідчына была апанавана польскім падпольлем і партызанкаю, якія вялі бязьлітасную барацьбу зь беларускім нацыянальным актывам. Польскія тэрарысты стралялі беларускіх вайскоўцаў, настаўнікаў і урадоўцаў упрост на вуліцах Ліды. Зброю і амуніцыю акоўцы атрымоўвалі ад нямецкіх уладаў, ды трымалі з апошнімі шчыльны кантакт. Немцы ведалі, што жывым Саковіч адтуль ня вернецца і, такім чынам, чужымі рукамі зьнішчалі аднаго з правадыроў беларускага падпольля.
Юльян Саковіч і Леанід Маракоў, брат загінуўшага ў бальшавіцкіх лягерах пісьменьніка, прыехалі ў Васілішкі, каб правесьці там беларусізацыю мясцовай адміністрацыі. 13

чэрвеня 1943 году яны наведвалі беларусаў у фальварку Гайкаўшчына і вярнуліся ў Васілішкі толькі ў абед. Тут іх ужо чакалі два тэрарысты…
Саковіч і Маракоў былі расстраляны ва ўпор недалёка ад касьцёла. Забойцы пасьпяхова схаваліся, а мясцовая паліцыя, складзеная з палякаў, нават і не зьбіралася іх шукаць. Беларускія сьледчыя выйшлі на сьлед тэрарыстаў, але немцы зрабілі ўсё магчымае, каб тыя пазьбеглі кары й пайшлі ў лес. Ільля Кіслы, у якога былі ўсе дакумэнты па расьсьледаваньні забойства, быў застрэлены на лідзкай вуліцы.
Юльян Саковіч быў пахаваны на праваслаўных могілках у Лідзе ў прысутнасьці шматлікага беларускага грамадзтва. Усе беларускія газэты зьмясьцілі нэкралёгі, прысьвечаныя яго сьветлай памяці.
“Новая дарога” пісала: “Ня стала Яго. Ён адыйшоў ад нас. Памяць аб ім застанецца вечна жыць у нашых сэрцах, у сэрцах беларускага народу. А ворагі нашы, яго забойцы, няхай ведаюць — назаўсёды прайшоў ужо час, калі яны маглі бяскарна нішчыць лепшых яго сыноў. Цяпер караючы меч нашых узброеных аддзелаў цяжка ўпадзе на іх праступніцкія галовы.
Сьпі спакойна, дарагі сябра, дарагі змагар! Мы споўнім твае запаветы! Вольная Беларусь ніколі не забудзе сваіх ахвяраў на шляху змаганьня!”

## “МЫ — БЕЛАРУСКІЯ САЛДАТЫ...”

Кастусь Шышэя быў адным з дэсантнікаў маёра Вітушкі. Пасьля таго, як ягоная група трапіла ў рукі чэкістаў, ён яшчэ нейкі час знаходзіўся на нелегальным становішчы, пакуль і яго не спасьціг такі ж лёс. Пасьля менскай “амэрыканкі” пачаліся доўгія гады бальшавіцкіх канцлягероў. Вярнуўся на Бацькаўшчыну толькі напрыканцы 50-х гадоў. Жыве ў Вільні.

**— Калі Вы ўпершыню пачулі пра Беларускую Незалежніцкую Партыю?**

— Гэта было ў Шчорсах дзесьці ў 1942 годзе. Я раз запытаўся у свайго настаўніка, беларуса Аркадзя Бузука, які быў нейкі час старшынём воласьці: “Што робіцца на сьвеце? Кругом партызаны: палякі забіваюць нас, бальшавіцкія чырвоныя таксама...” А ён гаворыць: “Трэба пачакаць. Вось я табе нешта дам”. І даў мне два “Бюлетэні БНП”. Два розныя нумары, першы і другі (а ўсяго было іх шэсьць). Даў мне й гаворыць:

“Ты праштудзіруй, а пасьля аддай мне”. Я прачытаў гэтыя бюлетэні, бачу, што ёсьць партыя такая, сур’ёзная партыя. Пісалася там, што ў Менску сабралося 20 чалавек. Што яны сабраліся й арганізавалі БНП. Я быў згодны з праграмай, якая там была надрукаваная. Калі аддаваў яму бюлетэні, Бузук сказаў: “Бяры сабе мянушку і будзем змагацца. Але нікуды ня ідзі, чакай. Што-небудзь дый будзе”.

Так я ўступіў у Беларускую Незалежніцкую Партыю. У 1943 годзе БНП ужо мела вельмі моцныя пазыцыі на Наваградчыне. Я ўжо, як сябра партыі, меў права 5 чалавек прыняць у сваю ячэйку. Гаварыў сябрам, што вось мы будзем будаваць незалежную дзяржаву й таму трэба нам гуртавацца. Інакш палякі, бальшавікі й немцы нас усіх пераб’юць... Але нічога не рабілася. Усё глуха. Б’юць усёроўна. Хаваем аднаго за другім...

**— Раскажыце, як Вы трапілі да Рагулі?**

— Працаваў я бугальтарам у маёнтку. А калі партызаны пачалі рэзаць усіх, дык я вырашыў уцячы з гэтай работы. Аднойчы я быў сьведкам, як савецкія партызаны Міцькі Дзянісенкі расстралялі Кацю Сямашку з малым дзіцем. Яна толькі замуж выйшла й нарадзіла дзіця... Ляжала зь ім на падлозе, уся ў крыві. Адной куляй забілі яе і немаўлятку... Я як паглядзеў на гэта, пайшоў і здаў свае бухгалтарскія справы. А тут якраз атрымаў павестку ў войска. Думаю: пайду, хай яна лясьне, ваша адміністрацыйная работа. Пайду, трэба ваяваць з гэтымі “партызанамі” рускімі, польскімі...

Прыходжу. А ў мяне была г. зв. “бронь” — мяне нельга было кудысь мабілізаваць. Прыходжу. Агледзелі мяне й вэрбуюць у Todt, такую будаўнічую арганізацыю. А тут падходзіць да мяне малады чалавек і кажа: “Слухай, ты бугальтарам працуеш, а ў гарцэрах (скаўтах) ня быў?” Я кажу, што быў.

— Вось, слухай, нам патрэбны камандзіры ў беларускую армію”.

— А дзе тая армія беларуская?

— Няма, але яна будзе!

Гавару: — Давай, калі беларуская армія, я згодны.

**— А Вы ня ведалі хто гэта сядзеў?**

— Ня ведаў. Пасьля ўжо даведаўся, што Рагуля. Ён быў такі ж малады, як і я. Пытаюся: “А хто камандзір?” “Мы падбярэм камандзіраў, усё будзе. Нам трэба будаваць гэтую нашую армію. Інакш усё прападзе!” Гаварыў ён якраз тое, што я думаў... Прыйшоў я ў казарму, даюць мне кніжачку на

беларускай мове “Вайсковая тэрміналёгія. Каманды”. Кажуць, каб вывучыў, бо трэба будзе муштраваць іншых...

**— Па лініі БНП была яшчэ якая праца? Паведамлялі Вам што?**

— Нічога.

**— А Барыс Рагуля ведаў, што Вы — сябра БНП?**

— Не. Як я ня ведаў, што ён быў у партыі. А я ня меў права яму гаварыць.

**— А як Вы трапілі ў “Дальвіц”?**

— Вясной 1944 году наш батальён знаходзіўся пад Докшыцамі. Адправілі нас туды змагацца з савецкімі партызанамі, але Рагуля так дамаўляўся зь немцамі, што мы стаялі ў баку, не выходзілі на вайсковыя апэрацыі... Там, дарэчы, знайшоў я 16-гадовага хлопчыка, Мішку Бычка. Ён быў сынам партызанскага повара. Партызаны адступілі, а ён заснуў на дрэве й застаўся. Забраў я яго ў батальён і так Мішка прывык да мяне. Нібыта родны бацька стаў я для яго. Ён і з дэсантам ляцеў пасьля на Беларусь, разам са мною. У групе Вітушкі.

Рагуля прывёў батальён у Наваградак. Сабраў нас на Замкавай гары, гаворыць: “Сёньня я не магу загадваць. Вы ўсе сабе камандзіры, самыя павінны вырашаць, хто хоча далей змагацца за незалежнасьць нашай Бацькаўшчыны. Хто хоча са мной — калі ласка. А хто не баіцца застацца, хто з партызанамі сувязь меў — можаце заставацца. Можа яшчэ спаткаемся. Хутка”. Зрабіў ён такую прамову й мы ўсе разышліся. Большасьць пайшла па хатах. З тых некалькіх соцень жаўнераў засталося чалавек 120. Мы й адступалі на захад...

Быў пад маім провадам вельмі нэрвовы хлопец, Валодзя Нагулевіч. Яго маці партызаны жудасна катавалі: вылупілі вочы, адрэзалі грудзі. А ён усё гэта бачыў... Перажыў такі страшэнны шок. Ніякай зброі не прызнаваў, акрамя кулямёту Дзегцярова. Колькі ў мяне зь ім было праблемаў! То сваіх абстраляе, калі на пасту стаіць, то яшчэ што... Таксама трапіў ён у “Дальвіц”, ляцеў з дэсантам.

У “Дальвіцы” Рагуля паставіў мяне старшыной усяго курса. Трэба было і абмундзіраваць, і накарміць, і вывесьці на заданьне людзей...

**— Калі Вы даведаліся, што Вас адпраўляюць на Беларусь?**

— У нас пазабіралі ўсе дакумэнты. Каб нічога ня было. Усё мы пакінулі й спалілі ў печы... Перад вылетам на Беларусь мяне

выклікаў немец Геруліс. Сказаў, што мяне запісалі ў дэсант разам зь іншымі навааградзкімі хлопцамі. Кажа, што хацеў бы, каб я застаўся. Але як я застануся, калі мае сябры ляцяць на Беларусь!.. У маёй групе было 28 чалавек. З жанчын была Вера Краскоўская й Тамара Чэрамшагіна, нашыя радысткі. Ляцеў Мікола Рулінскі, але ў яго раскруціўся парашут і ён вярнуўся назад. Быў Вітушка, Багдановіч Глеб, Гінько Янка, Шунько Міша, Конюх Вася, Мацук Саша, Куімаў Саша. Ён быў расеец, шафёр Б. Рагулі. Яго ў Лідзе бальшавікі павесілі. Я думаў, што і мяне павесяць. Як злавілі ўжо мяне, самага апошняга, я не прызнаўся, што дывэрсант. Сказаў, што з польскай АК і зусім ня ведаю расейскае мовы. Назваўся "Жукоўскім Чэславам". І хоць ты мяне забі, не прызнаваўся, што я беларус. А ў камэры я пачуў, што ў Лідзе павесілі Куімава. Ну, думаю, гэта і мая доля такая, калі мяне выкрыюць... Пасьля мяне выкрылі. Прыводзілі на вочную стаўку Мацука Сашу. А мяне ўжо пазналі. Гэтага Сашу пабілі моцна. Паказваў на мяне, а я кажу: "Я ня быў у БНП, я — паляк!..".

**— Сколькі вас сабралося пасьля дэсанту?**

— Дзевяць чалавек: я, Гінько, Мацук, Конюх, Мішка Бычок, Філя Давідчык, Вера Краскоўская, Федаровіч, Павал Шляхтун... Як дэсантаваліся, была ноч. Пражэктарамі асьвяцілі, дык стала сьветла, як днём. Уцякалі мы з усіх сіл...

**— Хто стаў камандзірам групы? Гінько?**

— Гінько не ваенны чалавек. Ён больш палітычны. Ня ведаў як стрэльбу ўзяць... Мы падзяліліся. Давідчыка з Краскоўскай мы адправілі дадому на разьведку (а там бацькі кажуць: "Што ты, сынок!". Пасадзілі іх на воз і ў НКВД завезьлі). А я застаўся нібыта за камандзіра. З палякамі ўмаўляўся я...

**— У якім месцы Вы дэсантаваліся?**

— Каля Воранава. Недалёка ад вёскі Лаўрынкі. Там мы чакалі тых, каго адправілі ў разьведку. Нас засталося чацьвёра: Конюх, Мацук, я і Гінько.

**— Як Вы ўладкаваліся ў лесе?**

— Па-featureрознаму. Дзе ў лесе былі, дзе ў гумно залезем. Халадзіна была...

**— Вы ўспаміналі пра перамовы з палякамі...**

— Спачатку я пайшоў у вёску, нібыта хацеў купіць сала. Грошы былі (немцы далі). Купіў я сала, самагону, ды пачаў з гаспадыняй полькай размову. Кажу: "Надакучыла ў лесе хадзіць. Трэба было б дзе-небудзь "прызямліцца". І ніяк не магу знайсьці партызанаў". "А пан прыйдзе ў раніцы?" —

пытаецца. — “Прыйду, а як жа. Можа пані якой цыбулі падрыхтуе?.. І яна, відаць, пайшла да акоўцаў ды расказала пра мяне.
Назаўтра я прыходжу да яе зноў. Заходзіць у хату “мадам” гадоў сарака, па выгляду інтэлігентная кабета. Паглядзела на мяне й пытаецца: “Хто вы ёсьць?” Я кажу: “А вы хто? “Ну вы прасілі сустрэчу зрабіць”. Кажу: “Так, прасіў”. “Дык можам зрабіць сустрэчу, але хто ў вас камандзір?” — “Я!” “Ну да? Чалавека старэйшага трэба. Што ж ты за камандзір?!” — “Ну ёсьць старэйшы, высокі, у акулярах. “Во, во, такога”. І назаўтра прызначыла сустрэчу.
Прыйшоў я ў лес, кажу Гіньку, што прызначана спатканьне: — усё роўна мы ня выберамся. Трэба нам зь імі якую сувязь падтрымліваць, з гэтымі акоўцамі. “Ну добра, пойдзем”, — кажа Гінько. Пайшлі. Зайшлі ў хату. Жанчына тая паглядзела на нас і павяла ў лес. Ішлі доўга. Думаю сабе — халера яе ведае, куды яна нас вядзе?! А пасьля яна нас вывела на паляну. “Вы тут пастойце”, — кажа. І пайшла кудысь у кусты.
Як я прыгледжуся: там, за кустамі, за дрэвамі шэлясьціць штосьці. Акружаныя! Гавару Янку — слухай, брат, мы ў ачапленьні! А ён стаў нейкі абыякавы. Гаворыць: “Сьмерць так сьмерць, чорт яе бяры!” А мне толькі 20 гадоў, паміраць ня надта хочацца. Нават у баю!..
Гляджу: з кустоў выходзіць польскі капітан. “Чолэм, хлопцы!” — “Чолэм, пане капітане!” — гавару. “О, так чаго ты не прыходзіш да нас?” — “Я хацеў бы, вось прашуся да вас”. “А як гэта так, што ты добра на польскай мове гаворыш?” А я кажу: — А вось мой пшэваднічонцы яшчэ лепей па-польску гаворыць, бо унівэрсытэт Варшаўскі канчаў (а палякі ўжо ведалі, што мы беларусы)”. “У чым справа?” — “Хацеў бы падружыць з вашымі хлопцамі, — кажу, — таму, што нас могуць злавіць, мы паслалі разьведку”. А яны ўсё знаюць, усё бачаць! — “Мы паслалі разьведку. У Налібоцкай пушчы стаяць нашыя атрады”, — кажу.
**— Гэта рэальна было?**
— Ашукваў! Кажу ім, што мы паслалі людзей наладзіць зь імі сувязь. А мы іх чакаем... Пагаварылі мы так. А пасьля капітан кажа, каб некага паклікалі. Прыходзіць нейкі руды дзядзька. Капітан гаворыць, што мы будзем зь ім кантактаваць. Даў яму загад. А гэты руды прыстаў да нас: “Ну хто вы такія?” Я гавару: “Мы — беларускія салдаты і з вамі будзем...” “Дык ты хочаш, каб тут была Беларусь?” — “Канешне, — гавару, — тут

жа народ беларускі кругом”. А ён тумак тумаком. “Ну і што ты думаеш, — гаворыць, — будзе дзяржава?” Гавару: “Ну якая цяпер дзяржава? Нам трэба выратавацца ад бальшавікоў. Вам і нам. А потым мы будзем дзяліць, што каму”. Ён падумаў: “Правільна, нам дзяліць няма чаго”.
Пайшлі мы зь ім. Як наш адзін салдат на пасту стаіць, дык іхныя тры. Яшчэ ня верылі нам...

**— Доўга вы былі зь імі?**

— Ну ўжо да сьнежня 1944 году. А тут такія халады пачаліся!.. Зайшлі мы ў адну хату, а там цётка аладкі пячэ ў печцы. Я гавару, давайце папросім, каб цётка нас аладкамі пачаставала. Дастаю сто рублёў. Гавару: — “Можна?” — “О, давай, цяпер сто рублёў — гэта вялікія грошы”.
Тут адзін наш глянуў: аблава ідзе — ловяць нас! Ідуць салдаты савецкія. Я гавару: “Зброю сваю падрыхтуйце! Зараджайце, будзе бяда...”

**— А палякі вас не абяззброілі?**

— Не. Усё ў нас было. Але вось чаму яны нас не папярэдзілі?.. Палякі павінны былі ведаць пра аблаву.
Стаў я каля парога, нібыта дапамагаю гаспадыні аладкі пячы. Заходзіць адзін сяржант з аўтаматам. А я на яго свой наводжу, гавару: “В чём дело?” — “Ваши документы!” Я адходжу ад дзьвярэй, гавару на сваіх: “Хлопцы, выходзьце! А вы, сяржант, ідзіце ў свой штаб, а мы ў свой”. А ён зьбялеў... А я гавару: “Не думай шумець, вось на спуск націсну й цябе няма!” Выйшлі мы з хаты й пачалі адыходзіць. Тут нашы кінуліся ўцякаць. А Гінько кінуўся зусім у іншы бок... Я адчуваю, што вось-вось усмаліць у мяне. А я ўжо метраў 70-80 адыйшоў. Бачу, што ў сяржанта задрыжэў твар... Я кінуўся за вялікі камень. Якраз той даў па мне чаргу з аўтамату ППШ. Але аўтамат гэты савецкі дрэнны — толькі першыя дзесяць куляў дакладна лятуць, а пасьля плюе... Кінуўся я за хлопцамі. А Гінька там забралі...
Беглі мы з хлопцамі ўтрох. Спыніліся. Што рабіць далей? Вечарэла. Цэлы дзень так прахадзілі. Ад аблавы ўцяклі. Залезьлі ў гумно, схаваліся ў сена, каб абагрэцца. Самы сон. Прачынаюся, чую: хлопцы нешта шэпчуцца. Што такое? Прыслухаўся. Гавораць яны, што з партызанамі яны мелі сувязь, а “гэты не здасца”. Халера, думаю, засну, а яны мяне зьвяжуць і здадуць! Я пачакаў, а пасьля паціху ўстаў і выйшаў у кусты. Там і сядзеў да раніцы. Ранкам Конюх з Мацуком усталі, пасадзіў іх дзядзька на воз і павёз здавацца...

А я пайшоў да свайго дзядзькі — лясьніка. Думаю, даведаюся, як, што там у лесе.  Трэба было мінуць Іўе, Любча. Далёка мне трэба было ісьці...

## ЛІСТЫ ПРЭЗЫДЭНТА

Зь Міхасём Зуём, сябрам Цэнтральнага Камітэту Беларускай Незалежніцкай Партыі, які жыў у далёкай Аўстраліі, я даволі доўга шукаў сувязь. Але толькі ў траўні 1994 году атрымаў першы ліст ад яго. Зуй, у той час прэзыдэнт Беларускай Цэнтральнай Рады, пісаў:

“...радасьць і надзея ўзмоцнілася ў маёй душы, што полымя жорсткіх спосабаў нашых ворагаў вырваць з душы беларусаў любоў да свабоды, волі і сваёй Радзімы... не ўдалася, паміма зьнішчэньня каля трох з паловай мільёнаў лепшых дзетак Беларусі. Беларусь жыве, бо жывуць і дзейнічаюць беларускія патрыёты, што ёсьць зарукай, што ў недалёкай будучыні Беларусь скіне з сябе ўсе пархі, якія ўсьцяж смокчуць зь яе апошнюю кроў, а Беларускія Патрыёты пабудуюць справядлівы лад у сваёй Вольнай і Незалежнай Радзіме.

...У 1944 г., па дарозе на Захад, спаткаў кіраўніка ЦК БНП капітана Ўсевалада Родзьку, які арганізаваў батальён з беларускіх патрыётаў пад назовам “Дальвіц”. Я ўступіў у яго. Там спаткаўся з маёрам Вітушкам, докт. маёрам Багдановічам, Б. Рагулем, маёрам Дзьмітрыем Касмовічам і другімі афіцэрамі.

...маёр Вітушка атрымаў намінацыю генэрала і на чале з групай сямі сяброў БНП былі скінуты на Беларусь. Мой зямляк, былы ўдзельнік польскай партызанкі... спатыкаўся з сябрамі скінутай групы, ачоленай ген. Вітушкам. Яны дагаварыліся на супрацу з польскай партызанкай. Пазьней увосень была скінутая на Беларусь другая група сяброў БНП пад кіраўніцтвам док. маёра Багдановіча. Жывучы ў Аўстраліі, атрымаў пару фотак ад сяброў з групы маёра Багдановіча, а паміж імі сядзіць маёр Багдановіч...”

Напрыканцы 1994 году з Аўстраліі прыйшлі сумныя весткі — Міхась Зуй захварэў і апынуўся ў шпіталі. Дыягназ лекараў быў бязьлітасны: рак... Знаходзячыся на парозе жыцьця й сьмерці, М. Зуй піша, на маю даўнейшую просьбу, успаміны пад назовам “Мая аўтабіяграфія”. Гэта споведзь чалавека, які, ведаючы пра блізкую сьмерць, напісаў праўдзіва пра ўсе

непрыемныя жыцьцёвыя сытуацыі (вымушаная супраца з НКВД перад вайной). Раней гэтыя ўспаміны зьявіцца не маглі, бо сталіся б сродкам у палітычнай барацьбе беларускай эміграцыі.
Вестка пра сьмерць 24 красавіка 1995 году Міхася Зуя прыйшла да мяне са спазьненьнем на месяц. Сябар Зуя Павал Гуз пісаў: "Пішу Вам гэты ліст з вялікай жальбой, якую мы ў Аўстраліі панесьлі вось у гэтым месяцы... на 86 годзе свайго зямнога жыцьця адышоў у вечнасьць наш вялікі сын беларускай зямлі Міхась Зуй. Скончаўся ён на другі дзень праваслаўнай Пасхі... харанілі яго 1.5.95 на праваслаўнай дзяльніцы ў горадзе Сыднэй з усім праваслаўным абычаем, абрад паховінаў выканаў а. Ігар Хлябіч, дзе быў гроб, накрыты бел-чырвона-белым сьцягам, украшаны яго ўзнагародамі — трыма мэдалямі БКА і БЦР.
Ушанаваць нябожчыка прыйшла вялікая грамада Сыднэю ды другіх штатаў Аўстраліі, як, напрыклад, сябры гораду Мэльбурну, нягледзячы на вялікую дарогу — аж 1000 км ад Сыднэю..."

**МІХАСЬ ЗУЙ. МАЯ АЎТАБІЯГРАФІЯ**
Я, Міхась Зуй, нарадзіўся 23-га кастрычніка 1909 г. у вёсцы Вялікае Сяло Германаўскай воласьці Дзісенскага павету Віленскага ваяводзтва. Бацька мой быў сельскі гаспадар. Ён меў каля 8-мі гектараў зямлі, а пасьля адкупіў ад брата яго частку — 8 гектараў. Да гэтага часу я пачаў хадзіць у рускую пачатковую школу ў 1917 годзе.
Праз чатыры месяцы, у сувязі з вайной Расеі зь Нямеччынай, школа перастала працаваць. У 1918-19 годзе зноў пайшоў вучыцца ў рускую школу. Праз пяць месяцаў вучобы, у сувязі з хваробай бацькі, змушаны быў пакінуць школу, ды ва ўзросьце 9-ці гадоў ехаць у поле гараць зямлю і выконваць усе гаспадарчыя работы. Ведаючы, што навука — сьвятло, якое асьвятляе жыцьцё чалавека, стараюся дзе можна здабываць яе. У 1921 годзе пяць месяцаў вучыўся ў польскай школе, чытаю кнігі, хаджу на вячэрнія курсы, што дае магчымасьць закончыць праграму польскай сямігодкі і аднагадовы курс сельскай гаспадаркі.
У 1932-ім годзе арганізуем "Кола Вясковай Моладзі" (Kolo Mlodzezy Wiejskiej). Спаткаўшыся з беларускай літаратурай, пазнаю, што я сын Беларускага Народу з слаўнай мінуўшчынай, які крыўдзіць імпэрыялістычная Масква і

Варшава. У мае шаснаццаць год даю сабе слова, што пакуль буду жыць і магчы, буду абараняць свой слаўны гісторыяй, здольны і мірны народ ад усіх крыўдзіцеляў. Заснаваўшы К. В. М., выбіраюць мяне старшынём гэтай арганізацыі, з году ў год, да 1939 году, да “вызваленьня” Заходняй Беларусі ад “гнёту” польскіх паноў.

У барацьбе Кола Вясковай Моладзі пашырае сярод беларускага насельніцтва сьведамасьць аб Беларусі, праз адыграваньне беларускіх п’есак, ды выступы беларускага мяшанага хору з беларускімі песьнямі й дапамагае бараніцца ад палянізацыі беларусаў. Адначасна даем сялянам сельскагаспадарчыя парады. У 1936 годзе еду ў Вільню на шасьцімесячныя курсы “Вясковы Унівэрсытэт Грамадзкі” (Wiejski Uniwersytet Spoleczny). Вярнуўшыся назад, абдымаю функцыю брыгадзіра па садаводзтве ў воласьці, арганізую другое К. В. М. і апякуюся ім.

За пашырэньне беларускай сьведамасьці паміж насельніцтва мае сябры перасьцерагалі мяне, што паліцыя арыштуе, прышые лату камуніста і пашле ў канцлягер “Картуз Бярозу”. Пры прыходзе саветаў у 1939 годзе савецкі пракурор назначае мяне агітатарам — растлумачваць “сталінскую канстытуцыю” і палажэньне аб выбарах у акруговых вёсках. Сумленна выконваю свае абавязкі перад народам. Пасьля такога паясьненьня сяляне разыходзяцца і мацюгом крыюць “свабоду”.

Адначасна працую актывістам, дзесяцідворнікам. У палове 1940 году капітан НКВД вызывае мяне да сябе і прапануе супрацу з НКВД ды даносіць ім думкі насельніцтва. Ад гэтага “ганаровага” і “сумленнага” абавязку адмаўляюся. Наступае ціск на мяне з пісталетам у руках на працягу чатырох з паловай гадзін. Калі яго пагрозы ня змусілі мяне падпісаць дакумант супрацы з імі, тады загаварыў да мяне па-прыяцельску: “Вы, товарищ, молодой человек и неглупый. Мне жаль губить вашу жизнь, но если я не получу от вас подписи, несмотря, что я капитан НКВД, меня начальство не погладит по головке,а моя рубаха ближе моему телу”. Я хвіліну падумаў і гавару: “Я ад малых гадоў стараўся дапамагаць усім, хто патрабаваў дапамогі, і вам таксама дапамагу”. І падпісаў дакумант НКВД.

Два разы пасьля меў у лесе спатканьне з НКВД, што дапамагло ратаваць беларусаў ад ссылкі ў Сібір і катаваньняў, хаця йграў зь небясьпекай самому трапіць туды. У верасьні 1940 г., як

сыну кулака, з цяжкасьцю ўдаецца стаць студэнтам "Сельскохозяйственного полеводческого техникума" ў Глыбокім. Перад выбухам Другой сусьветнай вайны, у 12-ць гадзінаў ночы зноў быў пакліканы да начальніка НКВД, але праз два тыдні пачалася вайна. Мяне змабілізавалі ў савецкую армію ахоўваць боепрыпасы ў Крулёўшчыне. І я вызваліўся з кіпцюроў НКВД. У сувязі з наступам немцаў бальшавікі ўзрываюць склады з боепрыпасамі і ўцякаюць на Ўсход. Дэзертую і варочаюся дамоў. Праз тыдзень часу пагражае майму жыцьцю небясьпека ад палякаў, паступіўшых на службу немцам.

Праз тыдзень часу камэндант паліцыі, паляк, пагражае мне расстрэлам за тое, што я сказаў: "Цяпер на Беларусі ёсьць нямецкая ўлада, а не польская. Сьведамыя беларусы расстрэльваюцца нямецкімі рукамі па правакацыі палякаў". Пляную ўцякаць з дому, аж прыяжджае да мяне з Глыбокага беларус Аўген Аскерка, студэнт Львоўскай палітэхнікі, і прапануе мне далучыцца да тайнай арганізацыі беларускіх патрыётаў на барацьбу з польскімі шавіністамі, а ў патрэбе заняць пост старшыні Германаўскай воласьці. Праз пару тыдняў атрымліваю намінацыю на старшыню Беларускай Народнай Самапомачы (БНС) у Германавічах, а ў лістападзе 1941 году інжынэр Іван Гінько прывёз мне ад Акруговага Камісара другую намінацыю на старшыню воласьці ў Германавічах. Трэба сказаць, што воласьць і пастарунак паліцыі былі абсаджаны польскімі шавіністамі, якія плянавалі праз подлыя даносы аддаць мяне на расстрэл нямецкай жандармэрыі.

Спадар І. Гінько дапамог мне прыняць воласьць і ад'ехаў, а я застаўся адзін сярод ненавісьнікаў. І я ня раз ад 7-ай рана да 8-ай гадзіны вечара сядзеў адзін у бюро і сумленна залагоджваў праблемы жыхароў Германаўскай воласьці, і здабываў пашану ў людзей. У гэты час запазнаўся з нямецкім баронам фон Рэке, доктарам хіміі, які дома меў уласную хімічную лябараторыю і добра валодаў расейскаю моваю. Гэта быў чалавек сумленны і ганаровы. Ён у прыватнай размове крытыкаваў нядобрыя паступкі немцаў і гаварыў: "Господин Зуй, я не могу понять, почему немцы так глупо поступают". З маіх адказаў быў задаволены. Барона адклікаюць з Германавіч, а я паволі дыпляматычна замяняю працаўнікоў воласьці палякаў — беларусамі.

Той самы камэндант паліцыі, які пару месяцаў таму пагражаў мне расстрэлам, пачаў пісаць у нямецкую жандармэрыю подлыя даносы. Даведаўшыся аб яго подлай дзейнасьці, прыгатаваўся да абароны. У тую яму, якую капаў на мяне, уваліўся ён сам. І, калі б я не ратаваў яго, быў бы, бясспрэчна, расстраляны. Спакойна, плянава замяніў палякаў-валасных працаўнікоў беларусамі, і камэндантам паліцыі паставіў таксама беларуса. Беларускі актыў з Глыбокага прапануе мне заняць пост начальніка Шаркаўскага павету. Паміма маёй нязгоды з гэтай прапановай, сытуацыя змусіла мяне пагадзіцца з актывам, і ў пачатку траўня 1942 году я атрымаў намінацыю на начальніка Шаркаўскага павету і загад безадкладна ехаць у Шаркаўшчыну і арганізаваць павятовую ўправу. Старэйшыя ўрадоўцы Шаркаўскай адміністрацыі без ахвоты дапамагалі мне арганізаваць павет.
У верасьні 1942 году тэлеграмай выклікалі мяне ў Акругу. Сем нямецкіх афіцэраў, у тым ліку СС, разлажыўшы карты Шаркаўскага павету, запыталі ў мяне, у якіх месцах ёсьць партызаны. Паказаў і вярнуўся ў Шаркаўшчыну.
Назаўтра выклікаў мяне да сябе нямецкі гаспадарчы афіцэр — кляйсляндвірт. Там ужо былі: высокай рангі афіцэр СС, камандзір акцыі, барон фон Рэке, які служыў перакладчыкам, старшыня воласьці і кляйсляндвірт. На разложанай карце Шаркаўскага павету чырвоным алоўкам падкрэсьліваюць вёскі, хутары, дзе грасуюць партызаны.
Пасьля абводзяць вялікі круг чырвоным алоўкам, уключаючы ў яго ўсе падкрэсьленыя вёскі і хутары. Як толькі выйшлі з пакою камандзір акцыі СС, кляйсляндвірт і старшыня воласьці, я пытаю барона: “Што гэта мае значыць — абведзены на карце круг чырвоным алоўкам?” Адказ: “Ваенная тайна. А паколькі я Вас добра ведаю, скажу Вам, што ўсе вёскі і хутары, каторыя знаходзяцца ў абазначаным кругу, будуць зьнішчаныя разам з насельніцтвам агнём і куляй”. Пацямнела ў маіх вачох, захісталася падлога пад маімі нагамі…
Я думаў, што не ўтрымаюся на нагах. Аднак хутка апанаваў сябе і гавару: “Спадар барон, чаму вы, немцы, хочаце зрабіць вялікае злачынства таму народу, які спаткаў вас хлебам-сольлю, сьвятымі абразамі і кветкамі? Чым ён вінаваты, што вы ня можаце абараніць яго ад начных лясных грабежнікаў, якія з аружжам у руках грабяць безабаронны народ, які так радасна прыняў вас і верыць, што яшчэ немцы хутка

зьнішчаць лясных бандытаў і забясьпечаць спакойнае жыцьцё. А немцы гэтаму мірнаму працавітаму народу, за яго прыязныя адносіны да іх хочуць адплаціць агнём і куляй. Калі немцы выканаюць, што заплянавалі, яны зробяць найбольшае злачынства беларусам, страцяць давер і пашану ад беларусаў, і на сябе наложаць перад сьветам чорную пляму жудаснага крымінальнага злачынства!” Барон, выслухаўшы мае словы, сказаў: “Вы правы, начальнік. Зачакайце, а я пайду пагавару з камандзірам акцыі”. Праз пяць хвілін зьявіўся з камандзірам, якога таксама папярэдзіў аб наступствах, калі немцы выканаюць намечаны плян. На канец нашай гутаркі камандзір акцыі СС працягвае руку і кажа: “Даю вам, начальнік, слова гонару нямецкага афіцэра, што ані адна вёска, ані адзін чалавек ня будзе забіты, калі наша армія будзе падходзіць да вёскі, а па ёй ня будуць страляць”. Ён у 100 % датрымаў дадзенае мне слова. Няраз прыходзілася заручацца галавой за сялян перад карнымі нямецкімі аддзеламі, што невыкананьне сялянамі нямецкага загаду, ня злая воля сялян, а ўзброеныя партызаны не дазвалялі беларусам выконваць яго.

Мае сябры па працы папярэджвалі мяне, што я замнога рызыкую, крытыкую немцаў, а яны за гэта расстраляюць мяне. Зімою 1943 года па прапанове Уладзіслава Рыжага ўступаю ў БНП і атрымоўваю білет на цягнік другой клясы і без абмежаваньня мог езьдзіць у гарады: Менск, Вільня, Глыбокае. Вялікі недахоп лекаў адчуў шаркаўскі шпіталь. Акруговы аддзел забесьпячэньня бальніц лекамі адмовіўся забясьпечыць нават бальніцу. Еду ў Менск, у Генэральны штаб забесьпячэньня бальніц лекамі. Дастаю 75 скрынак з мэдыкамэнтамі. На станцыі ў Глыбокім нямецкае СД арыштоўвае мяне і садзіць у турму, дзе прасядзеў цэлыя суткі.

Рана вясной 1943 году маёр Радзівонаў* прысылае ў Шаркаўшчыну палкоўніка Лазарава вэрбаваць хлопцаў у сваю армію. Кляйсляндвірт, старшыня воласьці, камэндант паліцыі і мой заступнік маюць нараду з палк. Лазаравым. Адзінагалосна пастанавілі дапамагаць Лазараву вэрбаваць хлопцаў. Пастанову гэтую зрабілі ў часе, калі я адсутнічаў. Па вароце ў павет, даведаўшыся аб шкоднай пастанове дапамагаць Лазараву ў мабілізацыі ў варожую нам армію, абругаў заступніка і сказаў: “Не дазволю, каб нашы хлопцы пралівалі сваю кроў за чужыя справы, за нашых ворагаў!”

Еду да Акругавага Камісара ў Глыбокае прасіць дапамогі зьберагчы жыцьцё беларускіх хлопцаў. Як акруговы камісар, так і камэндант нямецкай жандармэрыі, толькі парадзілі мне варочацца ў павет і глядзець за парадкам. Паколькі БНП забясьпечыла мяне білетам ехаць чыгункай, калі мне патрэбна, саджуся ў цягнік і еду ў Менск да старшыні Самапомачы др. Ермачэнкі**. Ермачэнка дамаўляецца аб спатканьні з Генэральным Камісарам Беларусі Годбэргам***. Прыходзіць аўто — едзем. Генэральны Камісар, выслухаўшы маю просьбу, дае загад Акруговаму Камісару выслаць мне ў павет распараджэньне, што ніхто ня мае права сілай вэрбаваць людзей. Прыязджаю ў мястэчка Шаркаўшчына і бачу ў скверы, разьвязаўшы торбачкі з харчамі, праходзяць каля 120 хлопцаў, якіх пад канвоем вядуць у армію Радзівонава. Даю загад свайму заступніку Лявону Шарабайку аб'явіць хлопцам, што начальнік сказаў: "У армію ніхто ня мае права сілай вэрбаваць людзей, а могуць вэрбаваць толькі дабараахвотнікаў".
Завэрбаваныя хлопцы, пачуўшы гэтую вестку, закрычалі: "Ура! Хай жыве наш начальнік!" і разышліся па дамах. Праз тыдзень а 7-ай рана прыехалі да мяне ў бюро заступнік Акруговага Камісара, маёр Радзівонаў, два афіцэры нямецкага СД і палкоўнік Лазараў. Па подлых даносах Лазарава, яны прыехалі мяне судзіць. На допыце палкоўнік Лазараў афіцыйна сказаў, што начальнік Шаркаўскага павету спадар Зуй арганізоўвае сваю армію, каб пры першай магчымасьці біць немцаў. На яго крывадушныя абвінавачваньні ў мой адрас я даў цьвёрды і рашучы адказ, што Акруговы Камісар і ўсе нямецкія афіцэры супольна з маёрам Радзівонавым прызналі мне рацыю, а палк. Лазараву далі загад пакінуць павет Шаркаўшчыны.
Вясной 1944 года, адным вечарам прыйшло да мяне на кватэру двое сялян прасіць рады, што яны маюць рабіць у іх безвыходным цяжкім становішчы. У начы рабуюць і зьдзекуюцца над імі партызаны, удзень церпяць паняверку і зьдзек ад немцаў, паліцыі і літоўцаў. Пасадзіў іх за стол, паставіў літру гарэлкі і патлумачыў, чаму так ёсьць, і што мы павінны рабіць, каб змаглі перажыць гэты цяжкі час. Назаўтра рана прыйшоў да мяне селянін і сказаў: "Начальнік, учора вечарам камандзір партызанскага атраду прыслаў да вас двух партызанаў падлажыць міну, але пасьля вашай размовы з імі, яны аддалі бомбу назад камандзіру і сказалі:

“Рабіце з намі што хочаце, але мы міну начальніку не падложым, бо ён ня служыць немцам, а бароніць нас ад усіх крыўдзіцеляў”. Каб апісаць усю барацьбу з нашымі ненавісьнікамі, трэба было б напісаць цэлую кнігу.
У красавіку 1944 году І. Гінько прыязджае да мяне і кажа: “ЦК БНП ускладае на вас абавязак падабраць сем дэлегатаў, па аднаму ад кожнай прафэсіі, ехаць у Менск на Другі Ўсебеларускі Кангрэс. Дэлегаты мусяць быць стопрацэнтныя беларусы. У выпадку канфлікту зь немцамі, каб былі здольныя, у патрэбе, аддаць сваё жыцьцё, чым здрадзіць беларускай справе. Да дня ад’езду на Кангрэс ніхто нічога не павінен ведаць”.
Напярэдадні Кангрэсу, у Менску вечарам, ЦК БНП плянаваў зацьвердзіць плян зрыву Кангрэсу, у сувязі з недаверам Прэзыдэнту Беларускае Цэнтральнае Рады Р. Астроўскаму. На думку БНП, Прэзыдэнт Астроўскі плянуе зацьвердзіць кангрэсам супрацу Беларусі зь немцамі й гэтым самым скампрамэтуе Беларускі Народ у вачох Вольных Народаў Сьвету і, каб не дапусьціць да гэтага ганебнага чыну, БНП плянуе сарваць Кангрэс, як толькі ён распачнецца. Я палічыў, што прапанаваны плян ня мудры, бо робяцца пастановы, палагаючыся на прыпусканьні, і параіў, што зрыў Кангрэсу павінен наступіць з моманту, калі Прэзыдэнт БЦР Р. Астроўскі скажа хаця адно слова, якое будзе кампрамэтаваць Беларускі Народ у вачох Вольнага Сьвету. Мая прапанова адзінагалосна прымаецца. Цяпер Другі Ўсебеларускі Кангрэс сваімі гістарычна-патрыятычнымі пастановамі знайшоў сабе пачэскае месца на бачынах беларускай гісторыі.
На другі дзень, 28-га чэрвеня 1944 году, а 2-й гадзіне па пол., наладаваўшы вазы рэчамі першай патрэбы, пасадзіўшы наверх свае сем’ї, пакідалі свой родны кут, сваю цяжка здабытую маёмасьць, накіроўваліся на Захад, перад наступам Чырвонай Арміі, якая нясла за сабой камуністычны рэжым. Перад Граевам я быў разлучаны са сваёй сям’ёй і абозам.
У Граеве спаткаўся з капітанам Усеваладам Родзькам, і, згодна яго прапановы, вырашыў уступіць у батальён “Дальвіц”.
Капітан Родзька забясьпечыў мяне дакумэнтам, які даваў мне права вэрбаваць беларусаў у батальён. На трэці дзень, з групай 26 беларусаў, выехаў цягніком на Ўсходнія Прусы ў лягер Дальвіц. Мы праходзілі тут падрыхтоўку на партызанскую дзейнасьць на Бацькаўшчыне. Нас мелі скінуць

з самалёту на Беларусь тады, калі нямецкая армія будзе зноў наступаць на Ўсход. У гэтыя мары немцаў мы абсалютна ня верылі, а наш батальён чакаў на нагоду здацца ў рукі Альянтаў, каб зьберагчы сваё жыцьцё ад бальшавікоў.
У верасьні, з мэтай разьведкі сытуацыі на Бацькаўшчыне, была спушчана з самалёта на Беларусь група з 8-мі чалавек. Пазьней, у восень, арганізавалася група больш за 30-ць асоб на чале з генэралам Вітушкам. Да гэтай групы быў уключаны і я. Напярэдадні адлёту, увечары, пасьля размовы з маёрам Родзькам, ён вырашыў пакінуць мяне ў батальёне для вэрбоўкі хлопцаў.
Пераехаўшы ў Чэхаславакію, на "Чэрну Гару" (Шварцбэрг), езьдзіў па лягерах вэрбаваць хлопцаў. У гэты час мы пільна сачылі за вынікамі вайны. Пасьля капітуляцыі Нямеччыны, вечарам, наш батальён пакінуў Чорную Гару, бяручы напрамак — прабіцца на Захад да Альянтаў. У часе адсутнасьці камандзіра Родзькі, яго заступнік, капітан Гелда, каб не праліваць крыві, даў загад жаўнерам батальёну "Дальвіц" здаць зброю чэхам. Гэта здарылася на вуліцах горада Прагі.**** Калі вярнуўся маёр Родзька ў батальён, са сьлязьмі сказаў: "Здаўшы зброю чэхам, вы зрабілі сябе безабароннай групай. Ваша жыцьцё цяпер залежыць ад волі лёсу. Дарогу на Захад адрэзалі бальшавікі, а хто трапіць ім у рукі, не мінаваць кулі. Разьбівайцеся на групы й прабівайцеся на Захад". Выдаў нам часовыя посьведкі, што мы палякі.
Нашу групу на чале са старшым лейтэнантам Будахоўскім, у ліку 26 чалавек, затрымаў аддзел савецкага войска. Забралі ад нас гадзіньнікі і ўсе каштоўнейшыя рэчы і пад канвоем адвялі ў лес, абставілі кулямётамі і сказалі: "Сядзець, а хто толькі падымецца, страляем без папярэджаньня". На мне была ўніформа беларускага лейтэнанта. Нашы канваіры, атрымаўшы загад ад вышэйшага камандаваньня, вывелі нас на дарогу і накіравалі на разьмеркавальны пункт у горад Тускаў.
Пакуль дайшоў да месца прызначэньня, свой мундзір беларускага лейтэнанта замяніў свэтрам і на допыце ў НКВД падаў няправільны адрас, схлусіў, што я быў забраны прымусова з дому на працу ў Нямеччыну. Мяне ўключылі ў "143 гвардзейскі краснаназмёнены полк". Прывялі ў прызначаныя баракі. Два месяцы праходзілі тактычныя заняткі. Праз два месяцы злучылі тры палкі разам і пехатой адправілі праз Польшчу ў Берасьце (Брэст—Літоўск), дзе мелі

пасадзіць на цягнік і адправіць на Далёкі Усход. Калі прыйшлі ў Польшчу, затрымаліся на тры дні ў 50-ці кіламетрах ад Лодзі. У часе пастою, НКВД узяла мяне на допыт.
Капітан НКВД, з недахопу патрэбных яму довадаў, адклаў допыт на заўтра. Я гэтай жа ноччу вырашыў уцякаць. Вечарам зарганізаваў на ўцёкі двух сяброў: Жабуртовіча і Кіслага. Мы здэзэртыравалі, а калі б толькі злавілі б нас — на месцы расстралялі б. Ужо былі ў пастцы, але дзякуючы вартавым, якія запальваючы загаварыліся, мы прашмыгнулі ў лес паза іх плячыма. Тут спаткаў мяне няшчасны выпадак: узьлез на высокі дуб і, праз няўважлівасьць, паламаў ногі. Сябры зацягнулі мяне ў малодзенькі густы сасоньнік, а самыя пайшлі арганізоўваць мне дапамогу. Раніцой прыйшоў да мяне паляк Грабоўскі, прынёс скібку хлеба і літар кавы, і на працягу тыдня я атрымоўваў ад яго пасілак.
Ногі пухлі, ляжаў прытаіўшыся, накрыты плышчпалаткай. Зьверху грызьлі камары, зьнізу — мурашкі. Праз тыдзень Грабоўскі кажа мне, што яму небясьпечна прыходзіць да мяне: “Я забяру цябе дадому і палажу ў паветцы”. Узваліў мяне на плечы і каля паўтара кілямэтры валок дадому. Праз тры тыдні я пачаў спрабаваць уставаць і яшчэ праз два з кіем мог зрабіць пару крокаў. Мой апякун забраў мяне пільнаваць свой сад. Праз два месяцы зрабілі мне часовы пашпарт і я, па пратэкцыі, уладкаваўся ў Варшаве сьлесарам. Перад Калядамі з недахопу фінансаў звольнілі 15% рабочых, а сярод іх і мяне. Рана вясной 1946 году дастаю працу гадоўлі фруктовых дрэўцаў у той вёсцы, дзе атрымаў першую дапамогу пасьля дэзэрцірства з савецкай арміі.
Наведваючы Варшаву, спаткаў некаторых маіх сяброў з дому, зь якімі разам працаваў у арганізацыях. Даведаўшыся ад іх адрас маёй сям'і, якая жыла на “Землях адзысканых”, еду і знаходжу матку, дзьвюх сясьцёр, брата, швагра і другіх крэўных, прыяцеляў. Варочаюся назад, разьлічваюся з працадаўцам і ўвечары 4-га сьнежня 1946 г. прыяжджаю да сваёй сям'і. Брат і швагер служылі лясьнікамі, а я дастаў працу ў бюро надлясьніцтва — весьці ўлік высечанага ляснога матэрыялу і продажу.
Роўна праз год, 4-га сьнежня 1947 году, у 12 гадзін ночы НКВД прыехала забраць мяне. Той ноччу я начаваў у швагра. Яны арыштавалі спачатку брата, але праз 20 хвілін агледзеліся, што гэта ня той, хто ім патрэбны. Вярнуліся выправіць сваю памылку, але я ўжо быў у лесе.

Праз тры дні НКВД арганізавала аблаву на мяне, але тут яны ня мелі посьпеху. Дзесяць дзён сыпаў сьнег, а я сядзеў пад елкай і змагаўся за сваё існаваньне. Пасьля дзесяці дзён, з фальшывымі дакумэнтамі, сеў у цягнік і паехаў да майго сябра, які займаў высокі пост у адміністрацыі. Падчас нямецкай акупацыі яго брат быў у партызанах. На адным ложку праспаў зь ім паўтара месяца. За гэты час спаткаў некаторых блізкіх суседзяў, якія, нягледзячы, што належалі да камуністычнай партыі, абяцалі ў патрэбе бараніць мяне перад НКВД.

За гэты час зрабіў сабе другія дакумэнты, зьмяніў прозьвішча, і пераехаў у Еліна Здруй, каля чэскай мяжы на фэрму да майго сябры Рабізы. Я чакаў тэлеграмы ад прыяцеля са Шчэціна, які абяцаў залагодзіць на “чорна” пераход польска-нямецкай мяжы. У канцы чэрвеня 1948 г. атрымаў тэлеграму: “Прыяжджай”. І 28 чэрвеня позна ўвечары паляк-праваднік, камандзір Арміі Краёвай і я перайшлі мяжу. На трэці дзень, перамагаючы перашкоды, дабраўся да амэрыканскага сэктару ў Бэрліне, дзе прабыў каля двух з паловай месяцаў. Атрымаў ад сяброў БНП Маеўскага і Ул. Сенькі білет на самалёт у лягер Ватэнштэт (ангельская зона), дзе яны жылі. Апякун уцекачоў — паляк, ангельскі падданы — даведаўся, што я праваслаўны беларус і не дазволіў мне жыць у лягеры Ватэнштэт, а скіраваў да нямецкіх уцекачоў з Усходняй Нямеччыны. Нягледзячы на гэта, я жыў разам з сябрамі ў лягеры Ватэнштэт. Тут спаткаў сяброў БНП: Хведара Ільяшэвіча, Уладзімера Сеньку, Міхася Маеўскага і Аўгена Занкавіча. Тут мы рабілі нарады ды прапановы ангельскім уладам адносна барацьбы з камунізмам. За час побыту ў лягеры (сем месяцаў) арганізаваў беларускія пастаноўкі, прымаў актыўны ўдзел у грамадзкай працы.

Пасьля размовы з ангельскім генэралам разьведкі, згодна яго прапановы, 9 кастрычніка 1949 году параплавам прыплыў у Аўстралію. Паколькі маё прозьвішча і другія дадзеныя былі не сапраўднымі ў маіх паперах, пастанавіў жыць у Аўстраліі пад уласным імем. Калі я аб'явіў афіцэру бясьпекі, што маё сапраўднае імя ёсьць іншае, чым пададзена ў дакумэнтах, ён затрымаў мяне ў лягеры Банагіла на шэсьць месяцаў. Палічыўшы, што я — “ваенны злачынец”, пачаў рабіць даведкі аб маім жыцьці й дзейнасьці на Бацькаўшчыне. Пасьля шасьці месяцаў афіцэр бясьпекі паклікаў мяне да сябе й кажа: “Ад дня нараджэньня мы праверылі ўсю вашу дзейнасьць.

Падазрэньне было памылковае, на вас ніякіх цёмных плям няма. Можаце ехаць на працу, якая вам падабаецца”. За гэты час навязаў сувязь з беларусамі, раскіданымі па ўсіх краінах сьвету. Першую працу дастаў у горадзе Альбуры на ліманаднай фабрыцы.
25-га сакавіка 1950 году сп. Клуніцкі***** арганізоўвае сьвяткаваньне Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі Актам 25-га Сакавіка 1918 г., і адначасна засноўвае Беларускае аб’яднаньне ў Новай Паўднёвай Валіі. Еду ў г. Сыднеи і прымаю ўдзел у сьвяткаваньні. Мяне выбіраюць у сябры Управы БА ў НПВ.
Варочаюся на працу ў Альбуры, а праз пару месяцаў, у сувязі з патрэбай працаваць у Беларускім Аб’яднаньні ў НП Валіі, пераяжджаю ў Сыднэй. У лістападзе 1950 года паўстае непаразуменьне Ул. Клуніцкага з сябрамі Управы БА. Выбіраюць мяне старшынёй Аб’яднаньня й па сёньняшні дзень, бяз зьмены, стаю на гэтым пасту. У 1951 годзе дамаўляюся з сябрамі Беларускага Клубу ў Мэльбурне аб злучэньні нашых арганізацыяў у адну для больш эфектыўнай грамадзкай працы.
Сябры Беларускага Клубу пераймяноўваюць Клуб на Беларускае Аб’яднаньне ў Вікторыі. Робім зьезд Мэльбурн-Сыднэй і абіраем Галоўную Управу Беларускага Аб’яднаньня ў Аўстраліі — БАуА. Лёс судзіў мне быць старшынёй і цягнуць далей цяжкую, няўдзячную працу і па сёньняшні дзень. Ад пачатку заснаваньня Аб’яднаньня была заснаваная і Рэдкалегія, якая на працягу 10-ці год выдавала часопіс “Новае жыцьцё”, навязвала сувязь з Аўстралійскімі ўрадавымі палітыкамі. Лучылася да спаўпрацы з арганізацыямі іншых нацыянальнасьцяў. Супольна арганізоўвалі мітынгі, дэманстрацыйныя паходы па вуліцах Сыднэя і на ўзаем запрашалі да сябе дэлегатаў на нацыянальныя ўрачыстасьці. Беларускае Аб’яднаньне арганізоўвае мешаны хор, які выступаў на нацыянальных сьвяткаваньнях і міжнацыянальных канцэртах, рабілі публічныя беларускія забавы і кожны год нацыянальныя сьвяткаваньні: Абвешчаньне Незалежнасьці Беларусі Актам 25-га Сакавіка 1918 г., Другі Ўсебеларускі Кангрэс, Слуцкае Паўстаньне, таксама сяброўскія вечарыны, прысьвечаныя заслужаным беларускім патрыётам, як Я. Купалу, Я. Коласу, М. Багдановічу і другім. А таксама ставіліся беларускія пастаноўкі на нацыянальных сьвяткаваньнях.

13 сьнежня 1949 году атрымоўваю рангу надлейтэнанта. За грамадзкую працу 1 лютага 1952 году Прэзыдэнт БЦРады Р. Астроўскі надае мне рангу капітана. Начальнік Галоўнага Штабу Беларускага Вызвольнага Руху 2 сьнежня 1952 году прызначае мяне інспэктарам БВРуху ў Аўстраліі. 20 студзеня 1951 году атрымоўваю прызначэньне сябра БЦР, а 10 кастрычніка 1952 году Прэзыдэнт БЦРады прызначае мяне старшынёй Дэлегатуры БЦР у Аўстраліі. На ўрачыстасьці 25 Сакавіка 1962 году беларускае грамадзтва ўручае мне прэзент (падарунак). 13 лістапада 1978 году атрымоўваю ад Прэзыдэнта БЦР рангу Генэрала.
У 1965 годзе арганізоўваю высылку беларускіх дэлегатаў на міжнародныя палітычныя канферэнцыі Сусьветнай Антыкамуністычнай лігі (ВКАЛ) і апелюю да беларусаў сьвету дапамагчы фінансава пакрываць расходы, зьвязаныя з удзелам беларускіх дэлегатаў у рэпрэзентацыі Беларусі на канферэнцыях ВАКЛ.
Дэлегаты высылаліся з Аўстраліі, Нямеччыны, Амэрыкі і Англіі. Абавязак за пакрыцьцё коштаў рэпрэзэнтацыі Беларусі ляжаў на мне. Гэта каштавала мне многа клопатаў і нэрваў, ды ўласных выдаткаў. Не шкадую. Вынік уложанай працы аказаўся задавальняючым. Ужо ў 1971 годзе Беларусь, амаль нязнаную на Захадзе, Свабодалюбівыя Народы Сьвету афіцыйна прызналі за раўнапраўную сабе сяброўку, і прынятай Рэзалюцыяй на 5-ай Канферэнцыі ВАКЛ 24-га ліпеня 1971 года зацьвярджае ёй поўнае права на дзяржаўную незалежнасьць, і адначасова прыраклі ўсебаковую дапамогу Беларускаму Народу ў барацьбе за незалежнасьць...
Але невылечная хвароба палажыла мяне ў шпіталь і спыніла ўсю маю грамадзкую дзейнасьць...
Жыве Беларусь!!!
Аўстралія, Сыднэй. Кастрычнік 1994 год.

---

* Гіль-Радзівонаў Уладзімер (1906 — 1944), падпалкоўнік Чырвонай Арміі. Паходзіць з Асіповіччыны. Улетку 1941 г. трапіў у нямецкі палон. З 1942-га — камандзір пранямецкай брыгады (“дружыны”) “Русской национальной народной армии”. У жніўні 1943 году перайшоў на бок савецкіх партызанаў. Памёр ад ранаў.
** Ермачэнка Іван (1894 — 1970), беларускі палітычны дзеяч. Нарадзіўся ў вёсцы Капачоўка Барысаўскага павету ў

сялянскай сям'і. У першую сусьветную вайну — афіцэр расейскае арміі. Консул Ураду БНР у Канстанцінопалі на пачатку 20-х гадоў. У 1920-30 гг. жыў у Празе. У кастрычніку 1941 — красавіку 1943-га — старшыня Галоўнай Рады Беларускае Народнае Самапомачы ў Менску. На эміграцыі ўваходзіў у БЦР. Памёр у Флярыдзе (ЗША).
*** Тут М. Зуй памыляецца. У гэты час генэральным камісарам Беларусі быў В. Кубэ.
**** Існуюць і іншыя трактоўкі раззбраеньня “Дальвіца”. Напрыклад, М. Рулінскі цьвердзіць, што адбылося гэта адназначна не ў Празе, а ў іншым горадзе й што загад прыйшлося аддаць не Гелдзе, а Родзьку, бо батальён быў абкружаны чэскімі партызанамі.
***** Клуніцкі Уладзімер — арганізатар першай беларускай арганізацыі ў Аўстраліі. Першы старшыня Беларускага Аб’яднаньня ў Аўстраліі. Сябра Беларускай Народнай Грамады й рэдактар грамадоўскага часопіса “Да Перамогі”. Памёр 27 жніўня 1974 году ў Сыднэі.

KAMUNIKAT.org

# СЯБРЫ БЕЛАРУСКАЙ НЕЗАЛЕЖНІЦКАЙ ПАРТЫІ

## БІЯГРАФІЧНЫ ДАВЕДНІК

**АДАМОВІЧ Антон** (1909, Менск — 1998, ЗША), беларускі літаратуразнавец, пісьменьнік. Скончыў у 1928 годзе Белпэдтэхнікум. У 1930 г. арыштаваны й высланы ў Расею. У 1938 годзе вярнуўся ў Менск, скончыў БДУ. Падчас нямецкае акупацыі — сябра Галоўнае Рады БНС, рэфэрэнт па справах прапаганды і прэсы пры генэральным камісару Беларусі, працаваў у "Беларускай газэце". Сябра БНП. На эміграцыі рэдагаваў газэты "Ведамкі", "Бацькаўшчына", часопісы "Сакавік", "Конадні". Удзельнічаў у стварэньні Мюнхенскага Інстытуту па вывучэньні СССР. З 1960 г. у ЗША. Сябра Рады БНР.

**АЛЯХНОВІЧ Францішак** (1883 — 1944), беларускі палітычны дзеяч, драматург, пісьменьнік, журналіст. Удзельнік беларускага нацыянальна-вызвольнага руху пачатку XX ст., рэпрэсаваўся маскоўскім царызмам. У 1927-33 гадох знаходзіўся ў бальшавіцкіх вязьніцах, на Салаўкох. Абменены польскім урадам на беларускага камуніста Б. Тарашкевіча. Выдаў кнігу ўспамінаў "У кіпцюрох ГПУ" (1934). Падчас Другой сусьветнай вайны рэдагаваў легальную газэту "Беларускі голас" (Вільня), увайходзіў у Цэнтральны Камітэт Беларускай Незалежніцкай Партыі, кіраваў Віленскім камітэтам БНП. Забіты ў Вільні пры нявысьветленых абставінах.

**АРЦЮШЭНКА Васіль**, сябра Замежнага сэктару БНП. У 1950-х гг. жыў у ЗША. Дэлегат 14-га Пленуму БЦР у верасьні 1954 г. у Саўт-Рывэры.

**АРЭХВА Аркадзь** (1910, Глыбоцкі пав. — ?), беларускі палітычны дзеяч. Вучыўся на юрыдычным факультэце Варшаўскага ўнівэрсытэту. У 1939-40 гадах працаваў у мясцовым Беларускім камітэце. У 1941 годзе працаваў у Менскай гарадзкой управе. З 1943 г. — судзьдзя, пракурор Менскае акругі. Дэлегат Другога Ўсебеларускага кангрэсу. На эміграцыі — сябра БЦР, Беларускага кангрэсовага камітэту.

**АСКЕРКА Аўген** (? — 1946), беларускі палітычны й вайсковы дзеяч. Да пачатку нямецка-савецкай вайны вучыўся ў Львоўскай палітэхніцы. Падчас нямецкай акупацыі быў начальнікам паліцыі ў мястэчку Ільля каля Маладэчні. Актыўны арганізатар падпольнага руху. Пасьля прыходу бальшавікоў жыў у Вільні, неўзабаве быў арыштаваны. У 1945-46 гг. сядзеў у камеры сьмяротнікаў Вялейскай турмы. Па сьведчаньню Віктара Сікоры, загінуў падчас спробы ўцёкаў падчас расстрэлу ў турме.

**БАГДАНОВІЧ Глеб** (1913 — ?), беларускі вайсковы дзеяч, доктар мэдыцыны. Актывіст беларускага студэнцкага руху ў Заходняй Беларусі. У гады вайны — сябра БНП, маёр БКА, афіцэр беларускага дэсантнага батальёну “Дальвіц”. Дэсантаваўся 17 лістапада 1944 году на Віленшчыне. Летам 1945 г. перабраўся ў Польшчу, дзе й быў арыштаваны дзяржбясьпекай. Памёр на Беларусі пасьля вяртаньня з канцлягероў.

**БАРЫСІК Іван**, лейтэнант БКА, афіцэр “Дальвіца”. Паходзіў са Слонімшчыны. Дэсантаваўся на Беларусі ў лістападзе 1944 г. Разам з групай беларускіх дэсантнікаў загінуў у баі з чэкістамі ў 1944-ым.

**БУЗУК Аркадзь**, настаўнік. Падчас нямецкай акупацыі — арганізатар падпольля БНП у Шчорсах на Наваградчыне. Летам 1944 г. выехаў на Захад.

**ВАЙТОВІЧ Андрэй**, *гл. вышэй.*

**ВАСІЛЕНЯ Аляксей** (1899, Гарадзеншчына — 1978, Сыднэй, Аўстралія), беларускі палітычны й вайсковы дзеяч, журналіст.

Меў сярэднюю асьвету. Падчас грамадзянскае вайны ў Расеі служыў у арміі генэрала Дзянікіна. На пачатку 1920-х гадоў — польскі вайсковец, служыў у Вільні ў сапёрных частках. Дзеяч Беларускай сялянска-работніцкай грамады, Таварыства беларускай школы, Беларускай каапэрацыі. Як карыкатурыст супрацоўнічаў зь віленскай газэтай “Маланка”. Удзельнік нелегальнай канферэнцыі Грамады на пачатку 1939 году ў Баранавічах. У складзе польскага войска ваяваў супраць нямецкага агрэсара ў верасьні 1939 г., трапіў у палон. Восеньню 1941 году прыбыў з Горадні ў Слонім, заняў пасаду намесьніка старшыні Беларускае Народнае Самапомачы Слонімскае акругі, а 10 лістапада 1943 г. стаў старшынём. Ствараў Беларускую самаахову ў Слоніме, быў начальнікам арганізацыйна-персанальнага аддзелу штабу Слонімскае брыгады БСА, якая была раззброеная немцамі. Капітан, а пасьля маёр Беларускае Краёвае Абароны, начальнік канцылярыі Галоўнага кіраўніцтва БКА. Сябра Беларускай Незалежніцкай Партыі. Пасьля вайны жыў у лягеры для перамешчаных асобаў у Нямеччыне. У Ватэнштэце рэдагаваў сатырычны часопіс “Сьмехам па галаве”. У 1948-49 гг. у Гамбургу, разам з С. Хмарам і М. Паньковым, выдаваў на ратататары гумарыстычную газэту “Маланка”. З 1950-х гадоў жыў у Аўстраліі.

**ЕРМАКОВІЧ В.** (мянушка “Дружны”), капітан Беларускага Краёвага Войска. У лістападзе 1943 г. быў высланы ад ЦК БНП на Ўкраіну, дзе падпісаў дэклярацыю нарады прадстаўнікоў паняволеных народаў.

**ВІТУШКА Міхал** (5.11.1907, Нясьвіж — ?), беларускі палітычны й вайсковы дзеяч, генэрал, кіраўнік Беларускага Рэзыстансу ў др. пал. 1940-50-х гг. Скончыў Клецкую і Віленскую гімназіі (1930). Вучыўся ў Пражскім унівэрсытэце і Варшаўскім політэхнічным інстытуце. Уваходзіў у кіраўніцтва Аб'яднаньня беларускіх студэнцкіх арганізацый і Асьветнага таварыства беларусаў у Варшаве. У 1939-40 гг. — начальнік савецкай міліцыі ў Нясьвіжы. У жніўні 1941 года — адзін з кіраўнікоў Беларускае самаабароны падчас сумеснай беларуска-ўкраінскай антыбальшавіцкай апэрацыі на Палесьсі. На пачатку 1942 г. увайшоў у кіраўніцтва Беларускае Народнае Самапомачы. Арганізоўваў аддзелы Беларускае самааховы на Браншчыне, Смаленшчыне й

Магілёўшчыне (1942-43), якія пасьпяхова змагаліся супраць савецкіх партызанаў. Сябра Цэнтральнага Камітэту Беларускай Незалежніцкай Партыі, маёр Беларускае Краёвае Абароны, удзельнік Другога Ўсебеларускага кангрэсу. Афіцэр беларускага дэсантнага батальёна "Дальвіц". Вярнуўся зь Нямеччыны на Беларусь і ачоліў Нацыянальны Супраціў. Старшыня ЦК БНП, галоўнакамандуючы Беларускай Вызвольнай Арміі, рэдактар падпольнага часапісу "За волю". Паводле няспраўджаных зьвестак, яшчэ нядаўна жыў на эміграцыі.

**ВЕЖАН Юрка (Жан)**, беларускі вайсковы дзеяч. Быў афіцерам польскага войска. Напярэдадні нямецка-савецкай вайны дапамагаў абвэру арганізаваць у Варшаве аддзел беларускіх парашутыстаў, які быў скінуты ў БССР. Падчас нямецкай акупацыі — сябра БНП. У 1944 годзе атрымаў загад абвэра стварыць Беларускую брыгаду на Італьянскім фронце, у Аўстрыі. Яна павінна была выклікаць дэзэрцірства беларусаў з польскай арміі генэрала Андэрса. Вежан быў прызначаны начальнікам штабу, які хутка сфармаваў. Нямецкія агенты выкрылі падрыхтоўку паўстаньня ў брыгадзе й расфарміравалі створаныя аддзелы. Кожны дзесяты жаўнер быў расстраляны. Пасьля заканчэньня вайны — на эміграцыі. У лістападзе 1965 году надрукаваў у газэце "Беларускі голас" (Таронта) артыкул пра а. Гадлеўскага й БНП "Ці правадыр нацыяналістаў?". Далейшы лёс невядомы.

**ВЫСОЦКІ Леанід**, сябра Замежнага сэктару БНП. У 1950-х жыў у ЗША. Дэлегат 14-га Пленуму БЦР 1954 г. у Саўт-Рывэры.

**ГАДЛЕЎСКІ Вінцэнт** (16.11.1888, Сьвіслацкі раён, Гарадзеншчына — 24.12.1942), каталіцкі сьвятар, кіраўнік і ідэоляг Беларускага Рэзыстансу ў 1939-42 гг. Скончыў Віленскую каталіцкую духоўную сэмінарыю (1912) і Пецярбургскую каталіцкую духоўную акадэмію (1916). У 1917 годзе — сябра Беларускага нацыянальнага камітэту, удзельнік Першага Ўсебеларускага кангрэсу. Вядомы дзеяч часоў Беларускай Народнай Рэспублікі, быў сябрам Рады БНР. Адзін з заснавальнікаў і лідэраў Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі ў Заходняй Беларусі, рэдагаваў газэту "Крыніца" Зьнявольваўся ў турму польскімі ўладамі за беларускую

патрыятычную дзейнасьць, у тым ліку і на рэлігійным палетку (1927-29). У 1936 годзе выйшаў з БХД, заснаваў нацыяналістычную арганізацыю “Беларускі Нацыянальны Фронт”, да 1939 года выдаваў газэту “Беларускі фронт”. Напрыканцы 1939 г. у Вільні заснаваў Беларускую Незалежніцкую Партыю. З 1940 г. — у Варшаве, дзе арганізоўвае легальны “Беларускі Нацыянальны Фронт”, як прыкрыцьцё падпольных структур. Піша першую праграму Беларускай Незалежніцкай Партыі. У чэрвені 1941 г. удзельнічае ў заснаваньні ў Бэрліне Беларускага Нацыянальнага Цэнтру, як правобразу будучага беларускага ўраду. Быў ініцыятарам стварэньня дывэрсійнага Першага штурмовага зьвязу, які абвэр перакінуў на Беларусь напярэдадні нямецка-савецкай вайны. З верасьня 1941 году — галоўны школьны інспэктар пры генэральным камісарыяце Беларусі, сябра Галоўнай Рады Беларускай Народнай Самапомачы. Ініцыяваў стварэньне падпольнай арганізацыі “Беларускі Народны Фронт”, якой кіраваў. Спрабаваў залажыць кіруючы цэнтар Беларускага Рэзыстансу. Арыштаваны менскім СД 24 сьнежня 1942 г. і ў той жа дзень расстраляны ў Трасьцянцы.

**ГІНЬКО Янка** (1912 — 1980-я), сябра ЦК БНП. Інжынэр па адукацыі. У другой палове 30-х гг. — удзельнік беларускага руху ў Варшаве. Падчас вайны — сябра ЦК БНП, старшыня БНС у Глыбокім, удзельнік Другога Ўсебеларускага кангрэсу, афіцэр “Дальвіцу”. Дэсантаваўся 17 лістапада 1944 году каля Ліды, трапіў у палон НКВД. Праходзіў на працэсе кіраўнікоў БНП у Менску, атрымаў 25 гадоў канцлягероў. Памёр у Маскве.

**ГІНЦ Казімер**, вучыўся ў Наваградзкай настаўніцкай сэмінарыі, уступіў у БНП. Быў арыштаваны бальшавікамі. Уцякаў з канцлягера, быў злоўлены. Здолеў выехаць у Польшчу, дзе й памёр.

**ГЕЛДА Іван**, *гл. вышэй.*

**ГРЫГАРЦЭВІЧ**, дэсантнік “Дальвіцу”, быў скінуты на Беларусь у лістападзе 1944 г.

**ГРЫГОР'ЕЎ Цімафей**, сябра Пастаўскай арганізацыі БНП. Зь лета 1944-га — у "Дальвіцы", дабраўся да Беларусі. Быў арыштаваны. Жыве на Беларусі.

**ГРЫНКЕВІЧ Станіслаў** (старшы, 1902 — 1945), беларускі палітычны дзеяч, доктар мэдыцыны. У 1930-я гады — адзін з кіраўнікоў Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі. Арыштоўваўся палякамі, бальшавікамі (уцёк з турмы) й немцамі. Падчас Другой сусьветнай вайны — сябра Беларускага нацыянальнага камітэту ў Вільні, адзін з заснавальнікаў БНП (па іншых зьвестках, кантактаваў з Арганізацыяй беларускіх нацыяналістаў). Падтрымліваў сувязь з польскім падпольлем АК, імкнуўся ўзьняць беларускі нацыянальны партызанскі рух. Арыштаваны й расстраляны НКВД.

**ГРЫНКЕВІЧ Станіслаў** (малодшы, 23.2.1913 — 18. 4. 1966, Кліўленд, ЗША), беларускі палітычны й вайсковы дзеяч. Афіцэр польскага войска. У 1939 г. трапіў у нямецкі палон. Пасьля вызваленьня працаваў у Беларускім камітэце самапомачы ў Бэрліне. У 1945 г. быў высланы Ус. Родзькам у Швайцарыю з заданьнем па лініі БНП. На эміграцыі — сябра Рады БНР.

**ГУГЕЛЬ Сьцяпан** (?, Віленшчына — 1981), беларускі вайсковы дзеяч. Напярэдадні Другой сусьветнай вайны быў працоўным эмігрантам у Францыі, вучыўся ў Бэрлінскім унівэрсытэце, дзе навязаў сувязі з нямецкай вайсковай выведкай. Пасьля падрыхтоўкі ў спэцшколе абвэру, быў скінуты перад нападам Нямеччыны на Польшчу на беларускім Палесьсі, каля Кобрыну. Меў заданьне навязаць сувязь з беларускімі антыпольскімі паўстанцамі. Трэцяга верасьня 1939 году ўвайшоў у атрад галоўнага камандзіра беларускіх паўстанцаў Тарасюка й штодзённа перадаваў па рацыі весткі абвэру. Пасьля 17 верасьня ўцякае за Буг, працягвае працаваць у спэцшколе абвэру ў Бела-Падлясцы. Уваходзіў у нелегальную БНП. У 1944 г. у Аўстрыі ствараў Беларускую брыгаду, якая была зьліквідавана немцамі. З 1949-га — у Бразыліі. Супрацоўнічаў з Саюзам былых удзельнікаў збройнай барацьбы за вызваленьне Беларусі.

**ГУЗ (ДУБРОЎСКІ) Павал** (нар. 15. 8. 1924, в. Дуброва Рэчыцкага раёну), беларускі палітычны дзеяч. Падчас нямецкай акупацыі быў у Беларускай самаахове на Гомельшчыне. У 1944 г. выехаў на Захад. Актывіст скаўцкага беларускага руху, з 1949 года — сябра БНП (прыняты ў Аўстраліі М. Зуём). Да сёньняшняга часу актыўна працуе ў беларускіх арганізацыях Аўстраліі.

**ДАВІДЧЫК Піліп**, вучыўся ў Наваградзкай настаўніцкай сэмінарыі, служыў у батальёне Б. Рагулі. Дэсантнік “Дальвіца”, вярнуўся на Беларусь, дзе быў арыштаваны. Жыў у Грузіі.

**ДАКІНЕВІЧ Язэп** (1906 — ?), беларускі вайсковы дзеяч. Афіцэр польскага войска. Падчас нямецкай акупацыі — афіцэр Беларускае Краёвае Абароны, начальнік БКА ў Слонімскай акрузе. Сябра БНП, удзельнік арганізацыйных нарадаў партыі ў Менску. З 1944 году — на эміграцыі. Далейшы лёс невядомы.

**ЖАМОЙЦІН Янка** (нар. у 28. 1. 1922), падчас нямецкай акупацыі вучыўся ў Наваградзкай настаўніцкай сэмінарыі, кіраваў СБМ у Наваградку. Быў арыштаваны дзяржбясьпекай у Польшчы. Пасьля лягераў выехаў у Польшчу, жыве ў Варшаве. Аўтар успамінаў пра свой жыцьцёвы шлях.

**ЖЫХАР Аўген** (1920-я, в. Навадруцак, Пастаўшчына — жнівень 1955), беларускі вайсковы дзеяч, паэт. Падчас нямецкай акупацыі вучыўся ў Пастаўскай настаўніцкай сэмінарыі. Як сябра Пастаўскага камітэту БНП, летам 1944 г. трапіў у дэсантны батальён “Дальвіц”. Вярнуўся на Беларусь, арганізаваў партызанскі атрад, які дзейнічаў на Пастаўшчыне й сумежных раёнах (па іншых зьвестках, Жыхар не адступаў на Захад, а да пераходу на нелегальнае становішча працаваў настаўнікам). Па некаторых зьвестках, цесна супрацоўнічаў з генэралам Вітушкам. Абкружаны чэкістамі на хутары ў сямёх кілямэтрах ад Паставаў, пасьля няроўнага бою скончыў жыцьцё самагубствам.

**ЗАНКАВІЧ Аўген** (1923 — ?), падчас нямецкай акупацыі вучыўся ў Пастаўскай настаўніцкай сэмінарыі, ачольваў СБМ у Пастаўскім павеце. Намесьнік старшыні Пастаўскага камітэту БНП. З лета 1944-га — на эміграцыі, сябра

Замежнага сэктару БНП, Беларускай Цэнтральнай Рады. Жыў у Саўт-Рывэры /ЗША/.

**ЗУЙ Міхась**, *гл. вышэй.*

**ЗЫБАЙЛА Рыгор** (15.9.1913 — 15.11.1987), сябра ЦК БНП. Настаўнік або інжынэр па адукацыі. Удзельнічаў у нямецка-польскай вайне ў верасьні 1939 году, трапіў у нямецкі палон. Пачаў супрацоўнічаць з абвэрам, увайшоў у Першы штурмовы зьвяз, які быў скінуты на Беларусь перад нападам Нямеччыны на СССР. Адзін з кіраўнікоў Беларускай Незалежніцкай Партыі, магчыма, кіраваў Слонімскім акруговым камітэтам БНП. Старшыня Слонімскай акруговай БНС у 1941-43 гг. Зь лета 1943-га — намесьнік старшыні БНС Ю. Сабалеўскага ў Менску. З сакавіка 1944 году — начальнік БКА ў Глыбоцкай акрузе, лейтэнант. Удзельнік Другога Ўсебеларускага кангрэсу. У 1944 г. быў надлейтэнантам у беларускай дывізіі Зіглінга. Разам з батальёнам гэтай дывізіі напрыканцы 1944-га перайшоў на бок францускіх партызанаў. Пасьля вайны нейкім чынам апынуўся ў руках савецкай дзяржбясьпекі. Вярнуўшыся з канцлягероў, жыў у вёсцы Яглевічы Івацэвіцкага раёну.

**ІЛЬЯШЭВІЧ Хведар** (1910, Вільня — 1948, Ватэнштэт, Зах. Нямеччына), сябра Цэнтральнага Камітэту Беларускай Незалежніцкай Партыі. Беларускі паэт, празаік, гісторык, журналіст. Магістар філязофіі (1936). Скончыў Віленскую беларускую гімназію, гістарычны факультэт Віленскага ўнівэрсытэту. Цярпеў перасьлед з боку польскіх уладаў. Аўтар некалькіх зборнікаў вершаў, прозы, гістарычных дасьледаваньняў. Падчас нямецкай акупацыі кіраваў Беларускім аб’яднаньнем у Беластоку, рэдагаваў мясцовую газэту “Новая дарога”. Уваходзіў у кіраўніцтва БНП. Удзельнічаў у Другім Усебеларускім кангрэсе. З 1944 г. жыў у Нямеччыне. Сябра Замежнага сэктару ЦК БНП. Рэдагаваў часопіс “Шляхам жыцьця” (1946-48), бюлетэнь “Апошнія весткі” (разам з Міколам Шылам), выданьні БНП. Трагічна загінуў у аўтакатастрофе.

**КАЗАК Генадзь** (1924, в. Брацянка, Наваградчына — 2-я пал. 1940-х), беларускі палітычны дзеяч. У 1945 г. уваходзіў у склад Беларускага легіёну ў Нямеччыне. Актыўны сябра БНП.

Вярнуўшыся на Бацькаўшчыну, у лістападзе 1946 году заснаваў у Наваградку “Саюз вызваленьня Беларусі”. У траўні 1947 году арыштаваны. Загінуў у канцлягерах у Карагандзінскай вобласьці.

**КАРАЛЕНКА Мікола,** журналіст. У гады нямецкай акупацыі — супрацоўнік “Беларускай газэты”. Сябра БНП. З 1944 году знаходзіўся на эміграцыі. Далейшы лёс невядомы.

**КАРОЛЬ Усевалад** (1919 — 1984), актыўны сябра БНП. Лекар па адукацыі. Падчас нямецкай акупацыі працаваў у Баранавічах. Быў арыштаваны бальшавікамі. У 1946 г. праходзіў па “справе шасьці”, калі было асуджана кіраўніцтва БНП. Пасьля вяртаньня з канцлягероў жыў у Баранавічах.

**КАСМОВІЧ Дзьмітры**, *гл. вышэй.*

**КАСЯК Іван** (1909, в. Горы Вялейскі пав. — 13. 3. 1989, ЗША), беларускі палітычны дзеяч. Вучыўся ў Віленскім унівэрсытэце, скончыў політэхнічны інстытут у Львове (1941). З кастрычніка 1941 году — загадчык аддзелу культуры Менскага акруговага аддзелу БНС. Адзін з ініцыятараў правядзеньня царкоўнага сабору ў Менску (1942) і абвяшчэньня Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы. Сябра БНП. Намесьнік прэзыдэнта БЦР у Глыбоцкай акрузе. Намесьнік старшыні Другога Ўсебеларускага кангрэсу. З канца 1940-х гг. — у ЗША. Уваходзіў у БЦР, старшыня Беларускага кангрэсовага камітэту Амэрыкі (1957-89). Аўтар дасьледаваньняў з гісторыі Беларусі.

**КОНТАЎТ Мечыслаў** (або Ўладзіслаў, ? — лістапад 1943), беларускі дзеяч. Сябра Беларускага камітэту ў Варшаве. Удзельнік Першага штурмовага зьвязу. З канца 1941 года займаў пасаду старшыні Менскага павету. Забіты савецкімі партызанамі.

**КОНЮХ Васіль**, вучыўся ў Наваградзкай настаўніцкай сэмінарыі. Дэсантнік “Дальвіцу”. Арыштаваны напрыканцы 1944 г. на Наваградчыне. Пасьля канцлягероў жыў у Расеі.

**ЛАЗАРЭВІЧ Уладзімер** (1908, Менск — 1965?), беларускі вайсковы дзеяч. Афіцэр польскай арміі. Сябра Беларускага

нацыянальнага камітэту ў Варшаве. Падчас нямецкай акупацыі — начальнік аддзела гарадзкой управы па ўліку насельніцтва. Сябра БНП. Лейтэнант БКА, афіцэр "Дальвіцу". Пасьля вайны — на эміграцыі. Скончыў жыцьцё самагубствам у Кліўлендзе(?).

**ЛАПІЦКІ Алег**, падчас нямецкай акупацыі вучыўся ў Пастаўскай настаўніцкай сэмінарыі, быў кіраўніком СБМ у Лідзе. Дэсантнік "Дальвіцу", вярнуўся на Беларусь. Быў арыштаваны. Пасьля лягераў жыў у Казахстане. Трагічна загінуў.

**ЛАТЫШОНАК Аляксандар** (1923 — ?), сябра СБМ у Паставах. Лейтэнант батальёну "Дальвіц", вярнуўся на Беларусь у складзе аддзелу маёра Родзькі. Быў арыштаваны. Памёр на Беларусі пасьля вяртаньня з канцлягераў.

**ЛУЦКЕВІЧ Лявон** (1922 — 1997), вядомы беларускі дзеяч, выпускнік Віленскай беларускай гімназіі. Падчас нямецкай акупацыі — афіцэр Беларускай Краёвай Абароны, быў у батальёне "Дальвіц". Арыштаваны ў Польшчы ў 1945 годзе. Праходзіў на працэсе над кіраўнікамі БНП ("справа шасьці", Менск, 1946 г.). Пасьля канцлягераў жыў у Вільні.

**ЛУЦКЕВІЧ Юрка** (1920 — 1992), выпускнік Віленскай беларускай гімназіі й польскай падафіцэрскай школы. Падчас нямецкай акупацыі настаўнічаў у Баранавічах. Афіцэр беларускага дэсантнага батальёну "Дальвіц". Праходзіў на працэсе над кіраўнікамі БНП. Пасьля калымскіх канцлягераў у 1957 годзе вярнуўся ў Вільню.

**МАЕЎСКІ Міхась**, сябра Замежнага сэктару БНП. У другой палове 1940-х жыў у Заходняй Нямеччыне.

**МАНУЙЛА Станіслаў**, родам з Ляхаўшчыны, падчас нямецкай акупацыі — дзеяч СБМ у Баранавічах. З 1944 г. — камандзір антыбальшавіцкага партызанскага аддзелу каля Баранавіч. Далейшы лёс невядомы.

**МАРЦІНКЕВІЧ**, настаўнік Віленскай беларускай гімназіі, кіраўнік Віленскага камітэту БНП. Быў арыштаваны бальшавікамі. Далейшы лёс невядомы.

**МАТУСЭВІЧ Алесь** (? — 1944), журналіст. Падчас нямецкай акупацыі працаваў у "Беларускай газэце" у Менску. Удзельнік арганізацыйных сходаў БНП. Праўдападобна, па заданьню ЦК БНП, увайшоў у кантакт з савецкімі партызанамі й удзельнічаў у забойстве правадыра беларускіх нацыянал-сацыялістаў Ф. Акінчыца ў Менску. Загінуў у савецкай партызанцы.

**МАЦУК Алесь**, удзельнік дэсанту "Дальвіца". Вучыўся ў Наваградзкай настаўніцкай сэмінарыі. Быў у батальёне Б. Рагулі і ў "Дальвіцы". У сьнежні 1944 году трапіў у рукі чэкістаў. Пасьля канцлягероў ссылку адбываў у Краснаярску, дзе працаваў на цагляным заводзе. Далейшы лёс невядомы.

**МАЦЮКЕВІЧ Сяргей** (1923 — 1968?), удзельнік дэсантаў "Дальвіца". Вучыўся ў Наваградзкай настаўніцкай сэмінарыі, служыў у батальёне Б. Рагулі. У лістападзе 1944 г. дэсантаваўся на Беларусі, здаўся у рукі НКВД у Дзятлаве. Працаваў на шахтах Калымы. У 60-х гадах вярнуўся на Беларусь, жыў у Казлоўшчыне (Гарадзеншчына). Памёр у Ленінградзе падчас апэрацыі (?).

**МАЦЮШОНАК Аўген** (? — 1946), падчас нямецкай акупацыі — акруговы кіраўнік Саюзу беларускае моладзі ў Глыбокім. Павешаны бальшавікамі ў Беластоку (?).

**МЕЛЯШКЕВІЧ Антон**, сябра Замежнага сэктару БНП. Жыў у ЗША.

**НАБАГЕЗ Уладзімер**, сябра Замежнага сэктару ЦК БНП. Скончыў Наваградзкую гімназію. У складзе польскага войска ў верасьні 1939-га ваяваў супраць нямецкай арміі, трапіў у палон. Пасьля вайны застаўся на эміграцыі. Жыве ў Амэрыцы.

**НОВІК Мікалай**, сябра Замежнага сэктару БНП. Удзельнік 14-га Пленуму БЦР. Жыў у ЗША.

**ПАБЯРЖЫН Язэп**, беларускі вайсковец і паэт, кіраўнік Браслаўскага (?) камітэту БНП. Быў на курсах СБМ у Менску ў красавіку 1944 г. Сядзеў у бальшавіцкіх канцлягерох, цяжка хварэў. Далейшы лёс невядомы.

**ПОПКА Юры** (1912 — 1993), беларускі палітычны й грамадзкі дзеяч, пісьменьнік, выдавец, сябра Замежнага сэктару ЦК БНП. Арганізаваў Беларускі музэй у Ляймэне (Зах. Нямеччына).

**ПРЫСТАЎКА Вячаслаў**, сябра Пастаўскага камітэту БНП. Сябра СБМ. Летам 1944-га выехаў на Захад. Быў арыштаваны бальшавікамі. Жыве на Беларусі.

**РАГУЛЯ Барыс**, *гл. вышэй.*

**РАГУЛЯ Міхась** (1916?, в. Ачукевічы Наваградзкага пав.), сябра ЦК БНП. У 1933 годзе скончыў Наваградзкую беларускую гімназію. Інжынэр па адукацыі. Вясною 1939 г. знаходзіўся ў Варшаве й уваходзіў у кіраўніцтва Асьветнага таварыства беларусаў. У ліпені 1941 году вяртаецца на Бацькаўшчыну, разам з Ус. Родзькам едзе ў Віцебск, дзе працуе ў гарадзкой управе загадчыкам аддзелу культуры й асьветы. Адзін з кіраўнікоў Беларускай Незалежніцкай Партыі (мянушка “Чорны”), куратар выдавецкай дзейнасьці партыі. Рэдагаваў падпольны “Бюлетэнь БНП”, удзельнічаў у падрыхтоўцы праграмы й статуту БНП. У Віцебску ў 1942-43 гадах рэдагаваў дадатак да газэты “Новый путь” — “Беларуская старонка”. З лета 1944 году — на эміграцыі. Сябра Замежнага сэктару ЦК БНП. Напрыканцы 1948 г. выключаны са складу Цэнтральнага Камітэту, у выніку “пераваароту”, зьдзейсьненага старшынём Замежнага сэктару ЦК БНП Дз. Касмовічам. Выехаў у ЗША. Супрацоўнічаў з Радай БНР, пасьля зь яе выйшаў, уваходзіў у Беларускі нацыянальны цэнтар. Жыве ў ЗША.

**РАМАНЧУК Сымон** (1916 — 1951?), беларускі вайсковы дзеяч. Скончыў польскую пададфіцэрскую школу. Падчас нямецкай акупацыі — начальнік пэрсанальнага бюра пры Галоўным кіраўніцтве Беларускае Краёвае Абароны. Удзельнік нарады беларускага вайсковага актыву ў Празе ў 1944 годзе. У 1945 г. арыштаваны. Зімой 1946 г. спрабаваў уцячы зь менскае “амэрыканкі”. Рыхтаваў паўстаньне ў канцлягеры на Інце. Па некаторых зьвестак, пасьля выкрыцьця плянаў паўстанцаў, быў расстраляны.

**РАЧЫЦКІ Мечыслаў**, акруговы кіраўнік СБМ у Глыбокім. Летам 1944 г. выехаў на эміграцыю. Жыў у Канадзе.

**РОДЗЬКА Ўсевалад**, *гл. вышэй.*

**РУЛІНСКІ Мікола**, *гл. вышэй.*

**РЫЖЫ-РЫСКІ Уладзіслаў** (1920-я, в. Латыголь Глыбоцкага пав. — 2. 3. 1978, Нью-Ёрк), беларускі палітычны й рэлігійны дзеяч. Падчас нямецкай акупацыі — актыўны сябра БНП. Удзельнік Другога Ўсебеларускага кангрэсу. Зь лета 1944 г. — у батальёне “Дальвіц”. Выконваў адказныя даручэньні кіраўніцтва БНП. Пасьля вайны працаваў на капальнях у Бэльгіі. У 1948 г. быў абраны старшынём Генэральнае Рады Саюзу беларусаў Бэльгіі, выдаваў часопіс “За незалежнасьць”. Пачаў займацца рэлігійнай дзейнасьцю. Заснавальнік і патрыярх Беларускай народнай праваслаўнай царквы, якая ў другой палове 1990-х гадоў пераносіла сваю дзейнасьць на Беларусь.

**САВЁНАК Лявон** (1897, Глыбоччына — 1974, ЗША), беларускі палітычны дзеяч, пісьменьнік, журналіст. Скончыў Глыбоцкую настаўніцкую сэмінарыю. З 1920 г. у Менску працаваў у газэце “Савецкая Беларусь”. У 1933 годзе быў арыштаваны НКВД й высланы ў сібірскі канцлягер. Перад вайной вярнуўся на Беларусь, працаваў настаўнікам. Падчас нямецкае акупацыі працаваў у рэдакцыі менскае “Беларускае газэты”. Быў сябрам менскага падпольля Беларускай Незалежніцкай Партыі, удзельнічаў у арганізацыйным сходзе менскай групы БНП у верасьні 1941 г. Летам 1944 году выехаў у Нямеччыну. Па вайне працаваў дырэктарам Беларускае гімназіі ў Остэргофэне (лягер ДП). Пазьней пераехаў у ЗША. Быў адным з лідэраў партыі “Аб’яднаньне беларускіх нацыянал-дэмакратаў” (Зах. Нямеччына, ЗША, другая палова 40-х — сярэдзіна 50-х гадоў). Прымаў удзел у выданьні “Абежніку Цэнтральнага Камітэту Аб’яднаньня беларускіх нацыянал-дэмакратаў”. Супрацоўнічаў з рэдакцыямі мюнхэнскай “Бацькаўшчыны” й нью-ёрцкага “Беларуса”. Адышоў ад дзейнасьці Рады БНР, уваходзіў у Камітэт незалежнае Беларусі. У 1960-я гады адышоў ад палітычнай і грамадзкай дзейнасьці, жыў на сваёй фэрме.

**САЖЫЧ Язэп** (нар. у 1917 г.), беларускі палітычны й вайсковы дзеяч, генэрал. Скончыў Наваградзкую гімназію й польскую падафіцэрскую школу. Падчас нямецкай акупацыі ствараў аддзелы Беларускай самааховы. Афіцэр БКА і сябра БНП. На эміграцыі — актыўны удзельнік нацыянальна-вызвольнага руху. У 1982-97 гадох — Старшыня Рады БНР.

**САКАЛОЎ Анатоль** (1915 — ?), беларускі палітычны й вайсковы дзеяч. Скончыў Віленскую беларускую гімназію, юрыдычны факультэт Віленскага ўнівэрсытэту. У 1938 годзе вывучаў юрыспрудэнцыю ў Варшаве. У 1941 годзе — бурмістар г. Бярэзіны. Удзельнік беларускай нацыянальнай партызанкі Ул. Шавеля на Барысаўшчыне ў 1942 годзе. Афіцэр Беларускае Краёвае Абароны, сябра БНП. Пасьля вайны жыў у Нямеччыне. Па некаторых зьвестках эміграваў у Амерыку (?), дзе яго сьлед гіне.

**САКОВІЧ Юльян**, *гл. вышэй.*

**СІКОРА Віктар**, *гл. вышэй.*

**СЕНЬКА Ўладзімер** (21. 7. 1918, Новы Сьвержань Стаўпецкага пав. — 2. 2. 1997, Нямеччына), беларускі вайсковы дзеяч. Скончыў Стаўпецкую гімназію і Віленскі ўнівэрсытэт, быў сябрам Беларускага студэнцкага саюзу. Выпускнік польскай школы афіцэрскай рэзэрвы ў Замброве (Польшча). Пры саветах ў 1940-41 гг. працаваў настаўнікам. Падчас нямецкай акупацыі быў начальнікам паліцыі Нясьвіскага павету. Пасьля вайны працаваў у разьведцы нямецкага бундэсвэру, меў рангу маёра. Рэдагаваў па-нямецку бюлетэні-штоквартальнікі для аднаго нямецкага навуковага інстытуту, а па-беларуску — газэту “Жыве Беларусь”. Сябра Замежнага сэктару БНП, а пасьля — Беларускага Вызвольнага Фронту.

**СОКАЛ-КУТЫЛОЎСКІ Антон** (1892 — 1983), беларускі вайсковы дзеяч. Камандзір Слуцкай брыгады арміі БНР, якая ў лістападзе-сьнежні 1920 году ваявала супраць Чырвонай Арміі. Пасьля прыходу ў Заходнюю Беларусь бальшавікоў арыштоўваўся НКВД, уцёк. Падчас нямецкай акупацыі — сябра БНП, школьны інспэктар у Ганцавічах (Берасьцейская вобл.). Падпалкоўнік БКА. Выданы амэрыканцамі

бальшавікам у 1945 годзе. Да 1957 года знаходзіўся ў бальшавіцкіх канцлягерох. Памёр у Польшчы.

**СТАНЮШ Кастусь**, удзельнік антыбальшавіцкай партызанскай барацьбы на Бацькаўшчыне. Сябра Замежнага сэктару БНП, кіраўнік Краёвага прадстаўніцтва партыі ў Канадзе. Быў дэлегатам 14-га Пленуму Беларускай Цэнтральнай Рады ў 1954 г.

**СЯДНЁЎ Масей** (1915 — 2001), беларускі пісьменьнік. Вучыўся ў Вышэйшым пэдагагічным інстытуце ў Менску. У 1936 годзе быў арыштаваны й высланы на Калыму. У чэрвені 1941 г. вызваліўся. З 1944 г. — на эміграцыі. Сябра Замежнага сэктару БНП. Працаваў на радыёстанцыі "Свабода". Жыў у ЗША.

**СЯНЬКЕВІЧ Аляксей** (15. 11. 1904, Новы Сьвержань — 12. 12. 1991, Саўт-Рывэр, ЗША), сябра ЦК Беларускай Незалежніцкай Партыі. Вучыўся ў Віленскай беларускай гімназіі (?). У 1930-я гады быў сябрам Беларускага інстытуту гаспадаркі й культуры, Беларускай нацыянал-сацыялістычнай партыі. Перад Другой сусьветнай вайной, пад ціскам польскіх уладаў, быў вымушаны выехаць у Нямеччыну. Кіраваў аддзелам Бэрлінскага беларускага камітэту ў Бяла-Падлясцы. На Беларусь вяртаецца ў ліпені 1941 году, працуе рэдактарам "Менскае газэты", а пасьля — "Голасу вёскі". З 1942 г. — сябра ЦК БНП, у 1943-44 гг. кіруе Менскім акруговым камітэтам партыі. У 1943 годзе, як упаўнаважаны прадстаўнік, быў высланы ЦК БНП да Старшыні Рады БНР М. Абрамчыка ў Бэрлін. З вясны 1944 году — афіцэр прапаганды Беларускае Краёвае Абароны ў Баранавічах, супрацоўнік мясцовае газэты "Пагоня". У ліпені 1944 году выехаў у Чэхію, а пасьля перабраўся ў Бэрлін. Да 1950 г. жыў у Заходняй Нямеччыне. Выехаў у ЗША, пасяліўся ў Саўт-Рывэры. Прымаў актыўны удзел у дзейнасьці Беларускае Цэнтральнае Рады, а таксама Беларускай праваслаўнай парафіі імя сьв. Эўфрасіньні Полацкай.

**ТУЛЕЙКА Міхась**, сябра БНП. Падчас нямецкай акупацыі працаваў у Баранавічах. Удзельнічаў у нарадах актыву БНП у Менску. З 1944 г. — на эміграцыі.

**ТУРАЙКЕВІЧ Павал**, здраднік. Вучыўся ў Наваградзкай настаўніцкай сэмінарыі, служыў у батальёне Б. Рагулі. Падчас аднаго з баёў трапіў у палон да савецкіх партызанаў, быў завэрбаваны чэкістамі. Як агент дзяржбясьпекі, выдаў шмат беларускіх патрыётаў — сябраў БНП. За сваю юдаву работу атрымаў ад бальшавікоў пасаду дырэктара прадпрыемства. Ужо памёр.

**ХАНЯЎКА Часлаў** (26. 5. 1909, Рыга — 2. 7. 1988, ЗША), беларускі палітычны дзеяч. Вучыўся ў Віленскай беларускай гімназіі. Інжынэр па адукацыі. Паводле В. Пануцэвіча, быў адным з ініцыятараў заснаваньня Беларускай Незалежніцкай Партыі напрыканцы 1939 г. ў Вільні. Разам з а. Гадлеўскім, перабіраецца ў 1940 годзе ў Варшаву. Тут ён працуе на працягу нямецкае акупацыі ў Беларускім нацыянальным камітэце. З 1950-х гг. жыве ў ЗША. Зьяўляўся адным з кіраўнікоў арганізацыі "Беларуска-амэрыканская дапамога" ў Нью-Ёрку. У 1962 годзе цяжка захварэў. Прэзыдэнт Рады БНР В. Жук-Грышкевіч пісаў: "Шкада, што Чэсь пісаць ня можа, бо пісаць ён мог і мае аб чым..."

**ЧЭБАТАРЭВІЧ Віктар** (1906, Новы Сьвержань — 7. 10. 1963, Нью-Ёрк), беларускі палітычны й вайсковы дзеяч. Скончыў Нясьвіскую настаўніцкую сэмінарыю. У 1940 годзе, жывучы ў акупаваных бальшавікамі Стоўбцах, падтрымліваў сувязь з беларускімі нацыяналістычнымі арганізацыямі ў Варшаве (у прыватнасьці, з Міколам Шчорсам). Летам 1941-га па польскаму даносу арыштоўваўся немцамі. Працаваў у Генэральным школьным інспэктараце. Разам з а. Гадлеўскім арганізоўвае антынямецкае падпольле. У 1944 годзе — капітан БКА, камандзір афіцэрскай школы БКА ў Менску. На эміграцыі — актыўны дзеяч прабэцээраўскага кірунку, жыў у ЗША. Супрацоўнічаў з газэтай "Беларуская трыбуна". Рэпрэзэнтаваў беларускую эміграцыю ў сусьветных антыкамуністычных арганізацыях.

**ШАВЕЛЬ Уладзімер** (1910-я — 1942?), беларускі вайсковы дзеяч. Скончыў Віленскую беларускую гімназію й юрыдычны факультэт Віленскага ўнівэрсытэту. У 1941 годзе арганізаваў аддзелы беларускае паліцыі на Меншчыне, якія пасьпяхова змагаліся з савецкімі партызанамі. Уваходзіў у Галоўную Раду

БНС. Сябра БНП. У 1942 г. арганізаваў нацыянальную партызанку на Барысаўшчыне. Загінуў ад чэкісцкай кулі(?).

**ШКЯЛЁНАК Мікалай** (1899 — 1947), беларускі палітычны дзеяч, юрыст. Актывіст Беларускага студэнцкага саюзу ў Зах. Беларусі. Паплечнік а. В. Гадлеўскага па "Беларускім Фронце" (1936-39). З 1939 г. у Бэрліне, рэдагаваў газэту "Раніца". У 1941 годзе ўдзельнічаў у стварэньні Беларускага нацыянальнага цэнтру. Адзін з кіраўнікоў Нацыянальнага Рэзыстансу, ідэоляг Беларускай Незалежніцкай Партыі, куратар аддзелу вонкавай палітыкі. У 1944-45 гг. — першы віцэ-прэзыдэнт Беларускай Цэнтральнай Рады, адзін з арганізатараў Другога Ўсебеларускага кангрэсу. Вясной 1945 г., разам з аддзелам Ус. Родзькі, перабраўся ў Польшчу з мэтай удзелу ў падпольнай барацьбе БНП. Арыштаваны й павешаны бальшавікамі.

**ШЛЯХТУН Павал**, удзельнік дэсанту "Дальвіцу", трапіў у рукі чэкістаў.

**ШУКЕЛОЙЦЬ Антон**, скончыў Віленскую беларускую гімназію. Падчас нямецкай акупацыі працаваў у Менску ў беларускай адміністрацыі, удзельнічаў у заснаваньні Менскага камітэту БНП. З лета 1944-га — на эміграцыі. Прыхільнік Рады БНР. Жыве ў Нью-Ёрку.

**ШУНЬКО Міхась** (?, в. Дальчыцкі Загор, Наваградчына — ?), удзельнік дэсанту "Дальвіцу" ў лістападзе 1944 г. Скончыў школу ў Любчы, вучыўся ў Наваградзкай настаўніцкай сэмінарыі, быў у батальёне Б. Рагулі. Уступіў у БНП. Улетку 1944-га у складзе атрада "Дальвіцу", дэсантаваўся на Беларусі. Праўдападобна, браў удзел у пасьляваеннай беларускай антысавецкай партызанцы.

**ШЧОРС Барыс** (1916? — 6. 6. 1975, Саўт-Рывэр, ЗША), беларускі вайсковы дзеяч. Падчас нямецкай акупацыі — начальнік паліцыі ў Барысаве, сябра БНП. На эміграцыі — актывіст беларускіх арганізацый, прыхільнік Беларускай Цэнтральнай Рады.

**ШЧОРС Ігар**, сябра Замежнага Сэктару ЦК БНП (мянушка “Палын”). Падчас нямецкай акупацыі арганізоўваў беларускую паліцыю ў Менску.

**ШЫШЭЯ Кастусь**, *гл. вышэй.*

**ЯЦКЕВІЧ Мікалай**, дэсантнік “Дальвіцу”. Сядзеў у бальшавіцкіх канцлягерох на Інце.

*Гэта няпоўны сьпіс сябраў Беларускай Незалежніцкай Партыі. На вялікі жаль, сёньня імёны многіх “незалежнікаў” нам яшчэ невядомы. А прыналежнасьць некаторых беларускіх дзеячаў да БНП не заўсёды можна спраўдзіць.*

KAMUNIKAT.org

# ДАКУМЭНТЫ, ЛІСТЫ, УСПАМІНЫ

## СТАТУТ БЕЛАРУСКАЙ НЕЗАЛЕЖНІЦКАЙ ПАРТЫІ

### I. Назоў

1. Арганізацыя мае назоў “Беларуская Незалежніцкая Партыя” /БНП/.

### II. Абшар дзейнасьці

2. Абшарам дзейнасьці партыі зьяўляецца Беларусь і ўсе іншыя краіны, дзе жывуць Беларусы.

### III. Мэты БНП

3. Мэтай БНП зьяўляецца здабыцьцё і забясьпечаньне на будучыню Незалежнасьці Беларусі.

### IV. Шляхі асягненьня мэтаў

4. Да свае мэты БНП ідзе праз баёвы зрыў народных масаў да збройнага змаганьня, падрыхтоўванага шляхам:

а/ згуртаваньня пад сьцягам БНП усіх актыўных беларускіх сілаў;

б/ палітычна-ідэалягічнага вышкаленьня сваіх сяброў і іхнай бязупыннай працы і дзейнасьці сярод найшырэйшых гушчаў беларускага народу;

в/ баёвага вышкаленьня сваіх сяброў;

г/ баёвага супрацоўніцтва з іншымі народамі, якія змагаюцца за сваю незалежнасьць і прызнаюць права да яе беларускаму народу.

З увагі на вышэйсказанае БНП зьяўляецца ў сучасных умовах нелегальнай партыяй.

## V. Арганізацыйная структура БНП
## Цэнтральныя органы партыі

5. Найвышэйшым кіраўнічым органам Партыі зьяўляецца Цэнтральны Камітэт /ЦК/, які паклікаецца агульным зьездам акруговых кіраўнікоў Партыі.
6. ЦК складаецца з кіраўнікоў наступных аддзелаў:
    1. Арганізацыйнага
    2. Вайсковага
    3. Прэсавага
    4. Вонкавае Сувязі
    5. Фінансавага
    6. Інфармацыйнага
    7. Экзэкутывы
7. ЦК зьяўляецца найвышэйшым судовым органам Партыі.

## Арганізацыйная сетка

8. ЦК Партыі непасрэдна падлягаюць акруговыя /на Беларусі/ і краёвыя /за межамі/ кіраўнікі.
9. Акруговым і краёвым кіраўнікам падлягаюць кіраўнікі партыйных раёнаў.
10. Асноўнай партыйнай адзінкай зьяўляецца зьвяно з кіраўніком зьвяна на чале, які падлягае раённаму партыйнаму кіраўніку.
11. Акруговыя і краёвыя кіраўнікі прызначаюцца ЦК Партыі.
12. Кіраўнікі партыйных раёнаў прызначаюцца акруговымі кіраўнікамі. Прызначэньне вымагае зацьверджаньня ЦК Партыі.
13. Кіраўнікоў зьвеньняў прызначае кіраўнік партыйнага раёну.

## Сябры

14. Сябрам партыі можа быць кожны беларус/ка/, які /якая/ мае скончаных 18 гадоў жыцьця, жадае ўступіць у Партыю, падзяляе ідэолёгію Партыі і забавязваецца падпарадкавацца арганізацыйнай дысцыпліне Партыі.
15. Прыняцьце ў Партыю папераджае кандыдацкі пэрыяд /час гэтага пэрыяду акрэсьлівае кіраўнік зьвяна/, пасьля чаго наступае прыняцьце ў партыю праз зложэньне новапрымаемым партыйнай прысягі ў прысутнасьці ўсяго зьвяна на чале з кіраўніком зьвяна.

16. Сябра БНП ня можа быць адначасна сябрай іншай палітычнай арганізацыі. Прыналежнасьць да грамадзка-культурных і спартовых арганізацыяў дазваляецца пад варункам, што аб факце прыналежнасьці будзе паведамлена вышэйстаячая інстанцыя Партыі.

## Утрата сяброўства

17. Сябрам Партыі перастаецца быць праз: а/ выключэньне з партыі органамі Партыі і б/ выхад з Партыі на ўласнае жаданьне. У выпадку б/ жадаючы выйсьці з Партыі складае на рукі непасрэднага кіраўніка заяву і да часу вырашэньня яго справы завешваецца ў абавязках і правох сябры партыі.
18. У абодвух выпадках перастаючы быць сябрай Партыі падпісвае пісьмовае забавязаньне захаваць партыйныя таямніцы.
У выпадку парушэньня дадзеных забавязаньняў караецца сьмерцю.

## VI. Фінансы

19. Фінансы Партыі складаюцца з : а/ сяброўскіх складак, б/ дабраахвотных ахвяраваньняў і в/ іншых.

## VII. Партыйныя зьезды

20. Дзеля каардынацыі дзейнасьці Партыі і кантролі працы ЦК склікаюцца партыйныя зьезды. Партыйныя зьезды могуць быць звычайныя і надзвычайныя.
21. Звычайныя партыйныя зьезды складаюцца з акруговых і краёвых кіраўнікоў БНП. Склікае зьезд ЦК Партыі раз у два гады.
22. У важных непрадбачаных выпадках ЦК можа склікаць надзвычайны зьезд акруговых і краёвых кіраўнікоў Партыі.
23. Пастановы зьезду зьяўляюцца правамоцнымі пры прыняцьці іх дзьвюма трэцімі прысутных на зьездзе дэлегатаў.
24. Першы ўсеагульны зьезд усіх сяброў скліча БНП у Вольнай, Незалежнай Беларусі.

БЕЛАРУСКАЯ НЕЗАЛЕЖНІЦКАЯ ПАРТЫЯ

*(З архіву сябры ЦК БНП Міхася Зуя)*

**П Р А Г Р А М А**
**БЕЛАРУСКАЙ НЕЗАЛЕЖНІЦКАЙ ПАРТЫІ**

## У С Т У П

У цяжкія, крывавыя дні чужацкай акупацыі здала і здае свой баёвы экзамен Беларуская Незалежніцкая Партыя. Крывёй і збройным чынам пісалася яе праграма. Зьмест яе ясны і зразумелы для кожнага сябры БНП, які складае партыйную прысягу. Там, між іншым, гаворыцца:

"За справу БНП прысягаю аддаць у кожную хвіліну жыцьцё, бо ведаю, што яе справа — гэта справа Волі і Шчасьця Беларускага Народу і Бацькаўшчыны".

Сябры БНП ішлі на змаганьне, не задумоўваючыся аб будучым грамадзкім ладзе Беларускай Дзяржавы, аб будучых палітычных, праўных ці іншых асновах дзяржаўна-палітычнага жыцьця Беларускага Народу, ведаючы, што ў сваёй Дзяржаве Беларускі Народ знойдзе найлепшыя і найдагаднейшыя формы і ўмовы для свайго ўсебаковага разьвіцьця.

Калі чырвоным зарэвам займалася неба Беларусі, калі на ростанях цікаваў і цікуе вораг, ня было часу на пісаньне праграмаў. Тым ня менш, яе пісала само жыцьцё. Беларуская Незалежніцкая Партыя кавалася ня толькі ўнутры — сяброўскай дысцыплінай, але і ідэолёгічна. Пасьля ўдару, які спаткаў Беларускі Народ у часе апошняй вайны, БНП пераможна змагаецца далей. У адозве, выдадзенай пасьля заканчэньня вайны, Беларуская Незалежніцкая Партыя заявіла аб сваім далейшым непахісным змаганьні за Незалежнасьць Беларускага Народу:

"БНП абняло кіраўніцтва ўсім беларускім народным рухам супроць бальшавізму ад Бранску да Беласточчыны і стаіць, як раней, непахісна на варце інтарэсаў Беларускага Народу. БНП сягоньня бароніць наш народ ад бальшавіцкай самаволі і зьдзеку. І калі праб'е час, павядзе наш Народ на штурм супраць аплоту тыраніі — бальшавізму. Гэты час можа хутка прыйсьці і кожны з нас павінен быць напагатове".

Галоўны засяг дзейнасьці БНП знаходзіцца на Бацькаўшчыне, дзе ў глыбокім і цяжкім падпольлі змагаецца з лютым ворагам — камунізмам. На эміграцыі-ж Партыя выконывае свае раней вызначаныя дырэктывы і тыя заданьня, якія перад ёй паставілі гістарычныя падзеі.

Згодна свайму старому прынцыпу, яна не разглашае аб сваіх дасягненьнях, а скромна, самааддана працуе на карысьць сваёй Бацькаўшчыны.
Беларуская Незалежніцкая Партыя, выдаючы гэтую праграму, заклікае усіх сяброў яшчэ шчыльней згуртавацца пад сьцягам партыі і далей ажыцьцяўляць выпісаныя на ім ідэалы. БНП заклікае ўвесь Беларускі Народ аб'яднацца вакол гэтых ідэалаў, адкідаючы ўсялякую правакацыю і дывэрсыю. БНП заклікае ўсе беларускія партыі і групы на эміграцыі безадкладна пачаць творчую працу для вызваленьня Беларусі і спыніць усялякую шкодную для беларускай справы акцыю.
Няхай жыве Вольная і Незалежная Беларусь!

ЦК Беларускай Незалежніцкай Партыі

(3-яе перапраўленае выданьне —1953—)

## Р А З Д З Е Л I.
## Мэта Беларускай Незалежніцкай Партыі.

Сваю дзейнасьць і змаганьне БНП накіроўвае на ліквідацыю сыстэмы камуністычнай дыктатуры на Беларусі і здабыцьцё поўнай незалежнасьці Беларускай Дзяржавы, у якой Беларускі Народ зможа самастойна разьвівацца палітычна, гаспадарча і духова, ствараць свой дабрабыт і выяўляць свае нацыянальна-духовыя вартасьці, уносячы сваю творчую долю ў скарбніцу агульна-людзкай культуры.

## Р А З Д З Е Л II.
## Дзяржаўны лад Беларусі.

1/. БНП імкнецца ў этнаграфічных межах Беларускага Народу стварыць Беларускую Народную Рэспубліку, у якой уся ўлада належыць Беларускаму Народу, які шляхам агульнага, роўнага, простага, тайнага і прапарцыянальнага галасаваньня выбірае свае дзяржаўна-нацыянальныя органы.
2/. На чале дзяржавы стаіць Прэзыдэнт, якога выбірае ўвесь народ на час 5 гадоў.

3/. Заканадаўчую ўладу рэпрэзэнтуе парлямант, які складаецца з дзьвюх палатаў: пасольскага прадстаўніцтва і сэнату.
4/. Выканаўчую ўладу рэпрэзэнтуе ўрад, які складаецца з міністраў на чале з прэм'ер-міністрам.
Дзяржаўна-Заканадаўчая і выканаўчая ўлада стаіць на старожы аховы дзяржавы, грамадзкага ладу і парадку.

## Р А З Д З Е Л III.
## Грамадзкі лад.

У Беларускай Дзяржаве кожны грамадзянін павінен быць поўнасьцю свабодны і роўны ў правох і абавязках. Гэта асягнецца, калі ня будзе эксплёатацыі ці паняволеньня чалавека чалавекам у якой-бы ня было галіне суадносінаў — ці то палітычнай, эканамічнай, ці якой іншай.
БНП лічыць неабходным забясьпечаньне наступных правоў грамадзяніна:
1/. Недатыкальнасьць асобы, памешканьня і прыватнай уласнасьці,
2/. свабоды сумленьня, веравызнаньня, сьветапогляду,
3/. свабода практыкі мясцовых звычаяў, традыцыяў, абрадаў,
4/. незалежнасьці сям'і ў унутранасямейных справах,
5/. свабода зьмены месца ў межах дзяржавы і выезду за граніцу,
6/. свабода месцапражываньня ў межах дзяржавы,
7/. свабода карыстаньня ўласнымі сродкамі працы,
8/. свабода распараджаньня сродкамі і прадуктамі ўласнай працы і скарыстаньня іх,
9/. свабода выбару заняткаў і прафэсыі,
10/. свабода прыватнай ініцыятывы ў дапамаговых дабраахвотных арганізацыях,
11/. аднолькавыя выбарчыя правы,
12/. тайнай перапіскі,
13/. права на бясплатную асьвету,
14/. бясплатнае абясьпечаньне інваліднасьці, сіроцтва, калецтва, старасьці.
15/. гарантыя ад прасьледу за расавыя, нацыянальныя, палітычныя, рэлігійныя пераканаканьні і розьніцы,
16/. гарантыя ад эксплёатацыі, кабалы,
17/. права на прыватную ўласнасьць,
18/. свабода апэляцыі,
19/. права спадку і завяшчаньня,

20/. роўнасьць у правох і абавязках усіх грамадзянаў бяз розьніцы пляменнага, сацыяльнага, тэрытарыяльнага паходжаньня, бяз увагі на прафэсыю, род заняткаў, асьвету, веравызнаньне, погляды і пераконаньні,
21/. гарантыя ад кары сьмерці,
22/. свабода друкаванага і вуснага слова, якое накірована на патрэбу ліквідацыі камуністычнай дыктатуры, патрэбу дзяржаўнай сувэрэннасьці Беларускага Народу і Тэрытарыяльнай цэласьці краіны.
23/. свабода саюзу для палітычнага, эканамічнага і культурнага супрацоўніцтва,
24/. свабода сходаў і маніфэстацыяў,
25/. свабода прапаганды сьветапаглядаў.

## Р А З Д З Е Л IV.
## Судаўніцтва.

Для справядлівай аховы правоў і абавязкаў грамадзяніна існуе незалежны ад органаў улады суд.
У галіне праўных адносінаў БНП лічыць неабходным правядзеньне наступных мерапрыемстваў:
1/. устанаўленьне незалежнасьці суду,
2/. устанаўленьне суду з удзелам прысяжных і правам прысутнічаньня на іх кожнаму,
3/. забязьпечаньне законам усіх правоў грамадзяніна,
4/. устанаўленьне судовага прасьледваньня за парушэньне абавязкаў грамадзяніна, правакацыю, шпіянаж, супроцьдзяржаўную дзейнасьць, дзяржаўную здраду, самасуд, эксплёатацыю, ілжывыя даносы, хабарніцтва, злоўжываньне правамі.
5/. устанаўленьне узнагарод за заслугі для народу, дзяржавы, за ўчынкі дабрадзейства, карысную і творчую працу,
6/. абавязкам кожнага грамадзяніна зьяўляецца супрацоўніцтва, выпаўненьне дзяржаўных законаў і ўстанаўленьне парадку, шанаваньне правоў іншых, паважаньне незалежнасьці краіны і народу.

## Р А З Д З Е Л V.
## Царкоўнае пытаньне.

Разумеючы, што Царква мае служыць разьвіцьцю маральна-духовых вартасьцяў чалавека, Дзяржава ня ставіць Яе ў

залежнасьць ад сябе, але, прызнаючы Яе як аснову нацыянальна-духовага быту Беларускага Народу, усебакова падтрымлівае Яе.

БНП у галіне рэлігійна-царкоўных адносінаў лічыць неабходным:

1/. свабоду веравызнаньняў,
2/. свабоду выбару адносінаў паміж Царквой і школай,
3/. Незалежнасьць Беларускай Царквы.

## Р А З Д З Е Л VI.
## Зямельнае пытаньне.

Зямля, лясы і водныя абшары зьяўляюцца ўласнасьцю грамадзтва ў асобе дзяржавы. У галіне зямельных адносінаў і разьвіцьця сельскай гаспадаркі ў Беларускай Дзяржаве БНП лічыць неабходнымі наступныя мерапрыемствы:

1/. ліквідацыю калгаснай сыстэмы і перадачу зямлі ў прыватную ўласнасьць сялянству,
2/. надзел сялян зямлёй у залежнасьці ад працоўнай сілы паасобных сем’яў,
3/. свабодны выбар сялянствам формаў землякарыстаньня — хутары, атрубы і земляўладаньня індывідуальнае і кааператыўнае,
4/. дзяржаўнае рэгуляваньне арэнды і наёмнае працы,
5/. разьвіцьцё інтэнсыўных і прадукцыйных галінаў сельскай гаспадаркі: жывёлагадоўлі, садаводзтва, агародніцтва, тэхнічных культураў, мясной і малочнай прамысловасьці, пчалярства, пераапрацоўкі сельскагаспадарчых прадуктаў, рыбацтва, лясной прамысловасьці, кармовай гаспадаркі,
6/. разьвіцьцё сельска-гаспадарчай асьветы,
7/. правядзеньне агратэхнічных мерапрыемстваў /меліярацыя, разьвіцьцё сельска-гаспадарчай тэхнікі, скарыстаньне краёвага і замежнага досьледу ў галіне сельскай гаспадаркі/,
8/. забясьпечаньне дзяржавай крэдыту для тэхнічнага ўдасканаленьня сельскай гаспадаркі,
9/. забарона перадзелу і парцэляцыі,
10/. узаканьненьне спадчыннасьці на зямельную гаспадарку,
11/. электрыфікацыя сельскай гаспадаркі,
12/. паступовае заціраньне розьніцаў паміж жыцьцём у вёсцы і горадзе.

## Р А З Д З Е Л VII.
## Прамысловасьць.

БНП лічыць неабходным у галіне прамысловасьці правесьці наступныя мерапрыемствы:

1/. ліквідацыя адносінаў дзяржаўнага і прыватнага капіталізму,

2/. ператварэньне прамысловых і рамесьніцкіх прадпрыемстваў ва ўласнасьць прадуцэнтаў,

3/. разьвіцьцё дзяржаўнай прамысловасьці, маючай на мэце агульна-народныя і дзяржаўныя заданьні /машынабудаўніцтва, электрычная прамысловасьць, сельска-гаспадарчая, транспартная, абаронная прамысловасьць/,

4/. разьвіцьцё дабываючай і апрацоўваючай прамысловасьці ў мэтах пашырэньня народнага дабрабыту,

5/. свабода выбару заняткаў і прафэсыі,

6/. свабодны выбар формы ўладаньня сродкамі прадукцыі /індывідуальнае, каапэратыўнае/,

7/. усебаковае разьвіцьцё тэхнічна-прамысловай і прафэсыйнай асьветы,

8/. устанаўленьне законадаўчых нормаў для рэгуляваньня аплаты працы і інш.

## Р А З Д З Е Л VIII.
## Пытаньне адносінаў працы.

Праца зьяўляецца ўмовай жыцьця і крыніцай багацьця, дабрабыту і культуры чалавецтва. Толькі свабодная праца робіць вартасным чалавека і ўзвышае яго да годнасьці тварца вышэйшых формаў жыцьця. Праца павінна быць так разьмеркаваная, каб кожны чалавек у грамадзтве паводле сваіх быў карысным сябрам гэтага грамадзтва і прыносіў максымальную карысьць, атрымоўваючы за працу правідловую ўзнагароду, якая-б забясьпечвала яму магчымасьць заспакаеньня ўсіх патрэбаў.

БНП лічыць неабходным у галіне адносінаў працы правесьці наступныя мерапрыемствы:

1/. права свабоднага выбару роду працы,

2/. свабоды зьмены месца працы,

3/. свабода зьмены прафэсыі,

4/. устанаўленьне нормаў аплаты за працу, якая-б забясьпечвала матэр'яльныя і культурныя патрэбы,

5/. устанаўленьне васьмігадзіннага працоўнага дня для наёмных працаўнікоў і ніжэй для шкодных здароўю відаў працы,
6/. забарона працы для малалетніх і адпаведныя віды працы для старых,
7/. забароны працы, шкоднай для здароўя жанчыны,
8/. страхаваньне ад беспрацоўя,
9/. выпаўненьне умоваў аб працы,
10/. устанаўленьне трацейскіх судоў з незаінтэрасаваных асобаў,
11/. устанаўленьне і строгае выпаўненьне санітарных умоваў працы ўва ўсіх прадпрыемствах,
12/. устанаўленьне узнагародаў за выслугу ў працы для дзяржавы і грамадзкіх справаў,
13/. узнагарода за затрыманьне пад арыштам у выпадку апраўданьня,
14/. аплата за працу звыш устаноўленага часу,
15/. дадатковая аплата за цяжкую працу і працу ў сьвяточныя дні,
16/. забарона прымусовых адлічэньняў з заработнае платы на дабраахвотныя арганізацыі,
17/. папярэджаньне аб спыненьні працы на азначаны час перад гэтым,
18/. свабода прафэсыйных і работніцкіх саюзаў,
19/. прасьледаваньне паразытызму /прастытуцыя, біржа і інш./,
20/. прызнаньне ўзнагародаў за вынаходзтвы, навуковыя працы, працы ў галіне мастацтва,
21/. забясьпечэньне на выпадак калецтва або непрацаздольнасьці,
22/. дзяржаўная дапамога хворым і непрацаздольным.

## Р А З Д З Е Л IX.
## Гандаль.

У галіне гандлю БНП лічыць неабходным правядзеньне наступных мерапрыемстваў:
1/. забясьпечэньне законам правоў чалавека на неабмяжованае распараджэньне прадуктамі ўласнай працы і прадуктамі набытымі за сродкі ўласнай працы,
2/. увядзеньне і ўстанаўленьне сталай грашовай сыстэмы і сталых фінансава-крэдытных адносінаў,

3/. бязупыннае разьвіцьцё сродкаў транспарту,
4/. замацаваньне законаў свабодных цэнаў,
5/. забарона законам спэкуляцыі,
6/. недатыкальнасьць прыватнай уласнасьці,
7/. разьвіцьцё камэрцыйнай асьветы,
8/. усямірнае разьвіцьцё гандлёвых сувязяў з іншымі краінамі.

## Р А З Д З Е Л  X.
## Транспарт.

Транспарт у Беларускай Дзяржаве мае на мэце заспакаеньне гаспадарчых і асабістых патрэбаў грамадзянаў, забясьпечэньне сувязі розных галінаў гаспадаркі, сувязі ў межах краіны і з заграніцай і абароны краіны.
У галіне транспарту БНП лічыць неабходным правядзеньне наступных мерапрыемстваў:
1/. дзяржаўная папраўка і разбудова навачасных шляхоў спалучэньня па сухаземе, водных, якія-б пакрылі густой сеткай усю Беларусь і зьвязалі ўсе часткі краю,
2/. пабудова дзяржаўных транспартных сродкаў /авіябудаўніцтва, машынабудаўніцтва, чыгункі, параплавы і г. д./,
3/. падрыхтоўка і вышкаленьне дзяржавай выкваліфікаваных транспартных працаўнікоў,
4/. адкрыцьце дзяржаўных адпаведных транспартных школаў і пашырэньне транспартнай асьветы,
5/. устанаўленьне сталых аплатаў за транспарт /тарыфа/.

## Р А З Д З Е Л  XI.
## Сувязь.

Наладжэньне і разбудова ў Беларускай Дзяржаве сувязі мае на мэце забясьпечэньне патрэбаў насельніцтва ў сувязі ў межах краіны і з заграніцай, забясьпечэньне інфармацыяй шырокага грамадзтва і дзяржаўныя патрэбы.
БНП лічыць неабходным ў галіне сувязі правесьці наступныя мерапрыемствы:
1/. арганізацыя пошты, тэлеграфу і тэлефону,
2/. арганізацыя радыёсувязі,
3/. падрыхтоўка і вышкаленьне працаўнікоў сувязі,
4/. цесная сувязь з заграніцай,

5/. устанаўленьне сталых платаў.

## Р А З Д З Е Л XII.
## Фінансы.

У галіне фінансавай палітыкі БНП лічыць неабходным правядзеньне наступных мерапрыемстваў:
1/. утварэньне сталай грашовай сыстэмы,
2/. арганізацыя таннага дзяржаўнага крэдыту,
3/. устанаўленьне падатку па прынцыпу падаходна-прагрэсыўнага падатку,
4/. устанаўленьне бяздэфіцытнага бюджэту дзяржавы,
5/. увядзеньне дзяржаўнага кантролю ў справах крэдытных апэрацыяў,
6/. дзяржаўнае вышкаленьне фінансавых спэцыялістаў,
7/. разьвіцьцё фінансавай асьветы,
8/. цесная сувязь з іншымі дзяржавамі.

## Р А З Д З Е Л XIII.
## Пытаньне нацыянальных меншасьцяў.

Нацыя ў рамках дзяржаўнай незалежнасьці мае неабмяжаваные магчымасьці разьвіваць свае творчыя сілы ў кірунку выяўленьня сваіх нацыянальных, матар'яльных і ідэалягічных вартасьцяў. Аднак, унутры аб'еднанай нацыі, захоўваючы свае нацыянальныя асаблівасьці, звычаі, традыцыі, карыстаючыся нараўні з іншымі грамадзянамі ўсімі правамі і абавязкамі, устаноўленымі законамі, могуць існаваць асобы або групы іншай нацыі.
У дачыненьні да нацыянальных меншасьцяў БНП лічыць неабходным:
1/. прызнаньне абсалютнай роўнасьці ўсіх грамадзян,
2/. забарона прапаганды нацыянальнай няроўнасьці і перавагі аднэй нацыі над другой /шавінізму/, забарона прапаганды, скіраванай на парушэньне вольнасьці грамадзянаў іншай нацыянальнасьці,
3/. асабістая аўтаномія асобаў іншых нацыяў,
4/. роўнасьць усіх перад законам,
5/. прызнаньне другога падданства,
6/. свабода жанімстваў,
7/. права карыстаньня роднай мовай у прыватных справах і перад судом,

8/. права на друк у роднай мове,
9/. права на вывучэньне сваёй мовы ў прыватным парадку і ў сваіх школах,
10/. свабода рэлігійнай практыкі,
11/. свабода выконваньня нацыянальных звычаяў і традыцый.

## Р А З Д З Е Л XIV.
## Народная асьвета.

У галіне народнай асьветы БНП лічыць неабходным правядзеньне наступных мерапрыемстваў:
1/. стварэньне аднalітай структуры школьніцтва ад найніжэйшых да вышэйшых навуковых установаў,
2/. ажыцьцяўленьне агульнага абавязку навучаньня ў засягу сярэдняй школы,
3/. увядзеньне безплатнага навучаньня,
4/. стварэньне рэальных магчымасьцяў доступу да асьветы, навукі, мастацтва, для ўсяго народу,
5/. папулярызацыя навукі, тэхнікі і мастацтва,
6/. усямерная дапамога з боку дзяржавы ў вынаходніцкай працы,
7/. усямернае дапамаганьне разьвіцьцю філязофскіх і грамадзкіх навукаў,
8/. перайманьне досьлядаў замежных краінаў і культурных абменаў зь імі,
9/. свабода навукі і навуковай працы.

## Р А З Д З Е Л XV.
## Ахова здароўя

У галіне аховы здароўя БНП лічыць неабходным правядзеньне наступных мерапрыемстваў:
1/. забясьпячэньне права на абсалютную мэдыцынскую дапамогу,
2/. стварэньне дзяржаўнай сыстэмы мэдыцынскай дапамогі,
3/. фізычнае выхаваньне ў школах,
4/. наладжаньне прадукцыі лякарстваў,
5/. вышкаленьне кадраў мэдыцынскага пэрсаналу,
6/. стварэньне санітарна-гігіенічных умоваў працы ў прадпрыемствах,
7/. права кожнага працоўнага на водпуск,

8/. права на карыстаньне курортамі і лецішчамі,
9/. разьвіцьцё турыстыкі,
10/. масавае асьвядамленьне з гігіенай і папулярнай мэдыцынай,
11/. разьвіцьцё мэдычнай асьветы,
12/. апека над маткай і дзіцём,
13/. утварэньне сеткі пунктаў першай дапамогі,
14/. забясьпячэньне хуткай дапамогай сельскіх населішчаў,
15/. арганізацыя мэдычных курсаў,
16/. удзельнічаньне ў міжнародных мерапрыемствах па ахове здароўя,
17/. цесная сувязь з заграніцай.

## Р А З Д З Е Л XVI.
## Міжнародная палітыка.

У міжнароднай палітыцы БНП лічыць неабходным у Беларускай Дзяржаве захаваньне і умацненьне добрасуседзкіх, мірных суадносінаў з іншымі краінамі і народамі, навязаньне цеснага гаспадарчага, культурнага і палітычнага супрацоўніцтва зь імі для дабра ўсёй людзкасьці і Беларускага Народу, паколькі яны прызнаюць правы Беларускага Народу на незалежнае і самастойнае разьвіцьцё у сваіх этнаграфічных межах.

У галіне міжнародных адносінаў БНП лічыць неабходным правядзеньне наступных мерапрыемстваў:
1/. устанаўленьне межаў дзяржавы /на аснове дабраахвотных умоваў і міжнароднага права/,
2/. цеснае супрацоўніцтва з іншымі дзяржавамі ў галіне транспарту, дыпляматычных, палітычных, культурных, гаспадарчых і іншых адносінаў,
3/. прызнаньне сувярэннасьці усіх дзяржаваў у сваіх этнаграфічных межах,
4/. няпрызнаньне праўнасьці ўмоваў дзяржаваў з камуністычнай уладай СССР і БССР,
5/. няпрызнаньне ніякіх забавязаньняў, узятых камуністычнай уладай і ўскладзеных на Беларускі Народ,
6/. прызнаньне недатыкальнасьці дыпляматычных прадстаўнікоў і экстэрытарыяльнасьці ўстановаў іншых дзяржаваў,
7/. свабода эміграцыі і іміграцыі,
8/. абсалютная незалежнасьць ад якой колечы другой нацыі.

## Р А З Д З Е Л XVII.
## Абарона краю.

Беларуская Армія будзе гварантаваць утрыманьне незалежнасьці дзяржавы і аховы яе тэрыторыі.

У галіне абароны краю БНП лічыць неабходным правесьці наступнае:

1/. увядзеньне агульна-вайсковага абавязку,

2/. разьвіцьцё ваеннай прамысловасьці,

3/. разьвіцьцё вайсковых школаў для падафіцэрскага і афіцэрскага складу,

4/. умагчыміць допуск да афіцэрскіх і падафіцэрскіх ступеняў усім імкнучымся, чэсным, здольным і адпаведна падрыхтаваным грамадзянам Беларусі,

5/. армія, падпарадкавана ўраду, павінна служыць абароне вольнасьці і дабрабыту Беларускага Народу, а не для яго панявольваньня, ці панявольваньня іншых народаў.

## Р А З Д З Е Л XVIII.
## Адносіны да іншых партый.

БНП прызнае роўнасьць правоў на існаваньне іншых партыяў. БНП прызнае магчымасьць утварэньня часовых блёкаў з іншымі партыямі для асягненьня пэўных заданьняў пры ўмове захаваньня поўнай самастойнасьці кожнай партыі. Аднак, у блёк БНП уваходзіць толькі пасьля пастановы ЦК БНП і паразумленьня з адпаведнымі органамі іншай партыі.

БНП змагаецца з кожнай партыяй, якая ў сваёй праграме або дзейнасьці ці тактыцы выяўляе варожыя Беларускаму Народу мэты і намеры, абапіраецца на варожыя Беларускаму Народу элементы ці зьяўляецца іх экспазытурай, або нясе з сабой дыктатуру і паняволеньне працоўнаму народу.

## Тактыка Беларускай Незалежніцкай Партыі

Для асягненьня намечаных мэтаў і заданьняў БНП стасуе адпаведную тактыку. Пад тактыкай партыя разумее тыя сродкі і мэтады дзеяньня, якія ўжываюцца для ажыцяўленьня канчатковых мэтаў партыі. БНП лічыць маральнымі і законнымі і адзіна-правідловымі тыя мэтады і сродкі, якія служаць для дабра Беларускага працоўнага Народу і якія вядуць да рэалізацыі ягоных ідэалаў. БНП лічыць, што толькі рэальная сіла можа прывесьці да ажыцяўленьня высокіх і сьвятых ідэалаў Дабра, справядлівасьці і Праўды. Дзеля гэтага БНП лічыць неабходнымі наступныя прынцыпы ў стасаваньні сродкаў да ажыцяўленьня правоў Беларускага Народу:

1/. адзіным рэальным сродкам вызваленьня Беларускага Народу з пад маскоўска-камуністычнай дыктатуры і польскага імпэрыялістычнага наступу, як кожнага іншага ёсьць нацыянальна-вызвольная рэвалюцыя і ўсенароднае збройнае змаганьне. Толькі сам Беларускі Народ вырашыць свае справы. БНП адкідае ўсялякія ідэі аб канцэпцыі і практыку чужынскага апякунства над Беларускім Народам. БНП прызнае ўсялякую матар'яльную і маральную дапамогу Беларускаму Народу ў ягонай вызвольнай барацьбе на ўмовах, якія не закранаюць гонару, волі і незалежнасьці народу, краіны і дзяржавы. БНП адкідае, як шкодныя, усялякія канцэпцыі магчымага мірнага, эвалюцыйнага ці рэфармацыйнага спосабаў здабыцьця незалежнасьці.

2/. у пэрыяд нацыянальна-вызвольнай рэвалюцыі БНП кідае ўсе свае сілы на падрыхтоўку і пасьпяховае правядзеньне ўсенароднага збройнага змаганьня і падпарадкоўвае ўсю сваю партыйную сілу заданьням гэтага змаганьня. Як сродкі для ажыцяўленьня гэтага БНП лічыць наступнае:

а/. недапушчэньне да накіраваньня народнага змаганьня варожымі сіламі ў рэчышча, супярэчнае з прыродна-гістарычнымі імкненьнямі Беларускага Народу,

б/. выяўленьне ў друку варожай палітыкі, на мітынгах, шляхам агітацыі і г. д.

в/. сабатаж і падрыўная дзейнасьць,

г/. дзейнасьць легальных і падпольных арганізацыяў,

д/. маніфэстацыі, масоўкі,

е/. партызанская дзейнасьць,

ж/. выкліканьне і кіраваньне стыхійнага народнага руху,

з/. утварэньне масавых арганізацый і кіраваньне іх дзейнасьцю,
і/. арганізаваньне тэрарыстычных групаў,
к/. тварэньне арміі,
л/. захоп улады ў мэтах тварэньня Беларускай Дзяржавы.
Усе гэтыя мерапрыемствы БНП праводзіць, захоўваючы ўсе неабходныя захады для іх пасьпяховай рэалізацыі, супроцьдзейнічае варожаму шпіянажу, правакацый, здрадзе і застасоўвае адпаведныя сродкі, каб унікнуць непатрэбных ахвяраў.
3/. для забясьпечаньня перамогі народнага змаганьня БНП імкнецца ўсімі мерамі аб'яднаць усе сілы Беларускага Народу. Толькі задзіночана, ідэйна і арганізацыйна народ можа асягнуць свае ідэалы.
У мэтах задзіночаньня сілаў Беларускага працоўнага Народу БНП лічыць неабходным наступныя спосабы дзеяньня:
а/. шырокая ўсьвядамляючая праца сярод шырокіх масаў Беларускага Народу, усьвядамленьне мэтаў і заданьняў змаганьня, выяўленьне імкненьняў і намераў ворагаў, іх тактыкі, паказаньне спосабаў барацьбы,
б/. выясьненьне шкоднасьці раз'яднаньня народу па станавых, клясавых, тэрытар'яльных, рэлігійных, прафэсыйных і іншых прыметах,
в/. змаганьне з рознымі часовымі спарыдычнымі праявамі ідэалягічных ухіленьняў ува ўлоньні беларускага грамадзтва, выклікаными варожымі элемэнтамі або тэрытар'яльнымі ці рэлігійнымі, або інакшымі асаблівасьцямі, як вынікам чужацкіх уплываў і няволі.
4/. БНП асягае свае мэты шляхам пераканаваньня. БНП, як арганізацыя самых сьведамых, здысцыплінаваных і гатовых у кожны мамэнт да дзеяньня і найбольшай самаахвярнасьці сыноў і дачок Беларускага Народу, імкнецца стацца ідэйным, палітычным і кіруючым дзейнікам у змаганьні Беларускага Народу. У гэтай мэце БНП стварае розныя масавыя арганізацыі, у якіх выхоўвае і падрыхтоўвае да барацьбы народныя сілы. БНП адкідае ўсялякія канцэпцыі кіраваньня народам прымусовымі сродкамі ці спосабамі. БНП і народ — гэта неразрыўное адно. Толькі з народам, праз народ і для народу, — вось мэтад ажыцяўленьня мэтаў БНП. БНП ідзе ў перадзе народу, у першых яго радох.
Адзіным рэальным сродкам для асягненьня сваіх мэтаў БНП лічыць масавую работу і дзеля гэтага адкідае рашуча

індывідуальны тэрор, як сродак для асягненьня гэтых мэтаў, лічачы тэрор толькі сродкам абароны.
Разумеючы, якое вялікае спусташэньне спрычыніла векавая няволя, а асабліва апошнія дзесяткі [гадоў] чужацкай акупацыі на Беларусі, БНП лічыць асабліва важным змудную штодзённую ўсьвядамляючую працу сярод беларусаў, якім чужынцы імкнуліся прышчапіць супярэчныя інтарэсам Беларускага Народу ідэёлягічныя катэгорыі і погляды. БНП прыймае Беларускі Народ такім, якім яго перадала гісторыя сучаснасьці.
Ня гледзячы на варожыя способы, Беларускі Народ астаўся адзіным. БНП усяляк паралізуе далейшыя способы раз'ядналньня Беларускага Народу, змагаецца супроць раз'еднаючых элемэнтаў, якія ўносяцца як з вонку, так і з нутры Беларускага Народу.
5/. БНП можа зьдзейсьніць свае Мэты толькі пры захаваньні ідэёлягічнага адзінства і непахіснай сталёвай дысцыпліны сваіх радоў. Таму кожны, хто ў найменьшай меры адхіляецца ад праграмы, парушае статут або недакладна выконвае загады, ня годны быць сябрам БНП.
БНП выключае ўсялякую магчымасьць утварэньня і дзеяньня ўнутры партыі груповак і фракцыяў, а таксама прыналежнасьць сябры БНП да іншых партыяў.
6/. партыя вядзе ў розных умовах способы легальнай, поўлегальнай і нелегальнай працы. На Бацькаўшчыне ў умовах сучаснай бальшавіцкай дыктатуры і ў тых краінах, дзе няма ўмоваў для свабоднай дзейнасьці арганізацыяў, БНП праводзіць працу выключна нелегальнымі способамі. У такіх краінах, дзе існуюць магчымасьці для свабоднай дзейнасьці такіх арганізацыяў, БНП вядзе легальную працу, недэканспіруючы працу партыі ў іншых краінах, дзе праца вядзецца нелегальна. У пэўных краінах магчыма праца і легальная, і нелегальная, прычым частка сілаў, якія вядуць працу нелегальна, поўнасьцю закансьпіроўваюцца.

ЦК Беларускай Незалежніцкай
Партыі.

*(З архіву сябры ЦК БНП Міхася Зуя)*

## “БЮЛЕТЭНЬ БЕЛАРУСКАЙ НЕЗАЛЕЖНІЦКАЙ ПАРТЫІ”

Падчас Другой сусьветнай вайны падпольны друк Беларускага Супраціву быў нязначным. Яго выдавецтвам займалася, практычна, толькі адна арганізацыя — Беларуская Незалежніцкая Партыя. Ці не адзіным нелегальным пэрыёдыкам быў “Бюлетэнь БНП”.

Упершыню пра “Бюлетэнь БНП” у пасьляваенны час у Беларусі напісаў Васіль Раманоўскі ў сваёй сумнавядомай кнізе “Саўдзельнікі ў злачынствах” (Менск, 1964). Ён назваў бюлетэні “бруднымі лісткамі”, якія “заклікалі беларускую моладзь і інтэлігенцыю актыўна змагацца супраць СССР, за стварэньне беларускай буржуазнай дзяржавы”.

За наступныя трыццаць гадоў “Бюлетэнь БНП” так і ня быў вывучаны гісторыкамі. Уладзімер Гуленка ў энцыкляпэдычным артыкуле, прысьвечаным БНП, згадвае пра яго, але чамусьці называе “Беларускім інфармацыйным бюлетэнем”...

“БЮЛЕТЭНЬ Беларускай Незалежніцкай Партыі”, як “орган Вызвальнага (у апошніх нумарах — Беларускага — **С. Ё**.) Сялянска-Работніцкага Руху” зьявіўся дзесьці ў другой палове 1942 году. Сябра ЦК БНП Барыс Рагуля ўспамінае, што пытаньне заснаваньня свайго друкаванага воргану кіраўніцтва партыі абмяркоўвала на сваёй нарадзе летам 1942 году: “Вырашылі выдаваць падпольны бюлетэнь і выдаваць яго раз на тры месяцы. Хацелі раз на месяц, але пасьля дэбатаў спыніліся на першым варыянце. Пастанавілі выдаваць бюлетэнь ў розных гарадох. Першы “Бюлетэнь БНП” выйшаў у Віцебску, але распаўсюджваць яго пачалі ў Наваградку”.

Месца выданьня першага нумару “Бюлетэню БНП” было выбрана невыпадкова. Менавіта ў Віцебску займаў пасаду бурмістра гораду старшыня ЦК БНП Усевалад Родзька. Тут працаваў ва ўправе і сябра ЦК БНП Міхась Рагуля (“Чорны”), які быў прызначаны рэдактарам “Бюлетэню БНП”. У Віцебску ён зьяўляўся рэдактарам і дадатку да легальнай расейскамоўнай газэты “Новый путь” — “Беларуская старонка”, які выходзіў штотыднёва з вясны 1942 году. Першы нумар падпольнага “Бюлетэню...” быў набраны на пішучай машынцы й аддрукаваны на шапірографе або ратататары. У ім былі зьмешчаны праграмныя матэрыялы

Беларускай Незалежніцкай Партыі, а таксама інфармацыя пра арганізацыйны зьезд БНП.
Адказным за выпуск другога нумару “Бюлетэню БНП” быў прызначаны Барыс Рагуля. Ён выдаў яго ў Наваградку, праўдападобна, на пачатку 1943 году накладам найменш у 500 паасобнікаў. Б. Рагуля ўспамінае: “Рассылалі “Бюлетэнь...” мы не адтуль, дзе ён друкаваўся, а з іншых гарадоў. Ужо пасьля “Бюлетэнь БНП” прыходзіў да нас... За рассылку, фактычна, адказны быў Родзька, якога, як бурмістра Віцебску, ніхто ніколі не правяраў. Да мяне прыяжджаў кур’ер і я праз яго перадаваў аддрукаваны наклад у нагаворанае месца ў Менск. Адтуль яго рассылалі...
Такім чынам я выдаў толькі адзін нумар. Не памятаю, дзе выдаваўся трэці нумар “Бюлетэню БНП”. А чацьвёрты друкаваўся ў Бэрліне Мікалаем Шкялёнкам. Шкялёнак быў адным з найлепшых ідэолягаў партыі. Акрамя таго, ён быў таксама вельмі добрым палітыкам, які прадбачыў у передапошнім “Бюлетэні...” падзел Нямеччыны на ўсходнюю й заходнюю часткі”.
Невядома па якой прычыне падчас нямецкай акупацыі на працягу 1942-44 гадоў у Беларусі выйшла ўсяго два нумары “Бюлетэню БНП”. Магчыма, кіраўніцтва партыі сутыкнулася з праблемаю адсутнасьці дастатковай тэхнічнай базы, або аддало перавагу больш апэратыўным улёткам.
Тым часам “Бюлетэні Беларускай Незалежніцкай Партыі” шырака разыйшліся па Беларусі й адыгрывалі важную прапагандысцкую ролю. У адрозьненьне ад легальнага друку, які быў пад нямецкай цэнзурай, у падпольным выданьні БНП побач з антыкамуністычнай прапагандай была й антыфашыстоўская фразэалёгія. Зразумела, што карыстаўся “Бюлетэнь...” вялікай папулярнасьцю, асабліва сярод моладзі.
БНП праводзіла прапагандысцкую работу ня толькі сярод нацыянальных партызанаў, але й савецкіх. Пісьменьнік, былы савецкі партызан, Уладзімер Калесьнік успамінаў, як трапіў яму ў рукі ў Налібоцкай пушчы “прысланы невядома кім ворган Беларускай Незалежніцкай Партыі “Бюлетэнь” *(Беларусь, 1994, № 10).* Шырака былі ахоплены ўплывам партыі й беларускія вайсковыя фармацыі, дазволеныя акупантамі.
Трэці нумар “Бюлетэню БНП” выйшаў ужо ва Ўсходняй Прусіі ў жніўні 1944 году. Выдаваўся ён пры беларускім дэсантным батальёне “Дальвіц” і праз парашутыстаў, якіх скідвалі зь

нямецкіх самалётаў, дастаўляўся ў Беларусь. Восеньню 1944 г. у Бэрліне пабачыў сьвет чацьверты нумар. Пяты, апошні "ваенны" "Бюлетэнь БНП" быў аддрукаваны ў сьнежні 1944 году альбо ў студзені 1945-га. Мікола Панькоў у сваім "Паказьніку беларускіх выданьняў на чужыне за 1945-50гг."*(Нью-Ёрк, 1952)* памылкова піша, што ў 1945 годзе выйшла пяць нумароў "Бюлетэню...". На самой справе ў апошні ваенны год мог выйсьці толькі адзін нумар — пяты.
У Нямеччыне БНП зноў пачынае аддаваць перавагу ўлёткам. Лейтэнант дывізіі "Беларусь" Аўген Усюкевіч успамінае Генадзя Казака, які распаўсюджваў улёткі БНП сярод беларускіх вайскоўцаў: "У лістоўках быў заклік за саюз з прыбалтыйскімі народамі й прапаганда супраць маскалёў і палякаў. Я яшчэ сказаў Гене, каб ён асьцярожней дзейнічаў, каб хто не выдаў яго немцам... Казак здолеў пасьля вярнуцца на Беларусь зь Нямеччыны. Зарганізаваў "Саюз Вызваленьня Беларусі" ў Наваградку. Быў арыштаваны, атрымаў 25 гадоў канцлягераў, дзе й загінуў...".
Заканчэньне Другой сусьветнай вайны стала пачаткам новага этапу Беларускага вызвольнага руху. БНП на Бацькаўшчыне пад кіраўніцтвам генэрала Міхала Вітушкі ("Канцавы", "Лось") распачала выданьне новых падпольных пэрыёдыкаў, сярод якіх галоўнае месца займаў часопіс "За Волю". На эміграцыі сябры партыі арганізаваліся ў Замежны Сэктар БНП, які ачольваў Дзьмітры Касмовіч ("Каршун"). Пасьля 3-й канферэнцыі Беларускай Незалежніцкай Партыі, якая адбылася 30 верасьня 1946 году ў Заходняй Нямеччыне, на эміграцыі быў выдадзены шосты, апошні нумар "Бюлетэню БНП". У адрозьненьне ад ранейшых нумароў, якія выходзілі на 8 балонках, ён меў іх 16. "Бюлетэнь..." зьмяшчаў партыйныя адозвы, хроніку, публіцыстыку, а таксама інфармацыю пра антыбальшавіцкі партызанскі рух на Бацькаўшчыне.
У 1949 годзе Замежны Сэктар БНП спрабаваў адрадзіць "Бюлетэнь БНП" пад іншым назовам. Былі выдадзены два нумары партыйнага бюлетэню "Праца і Воля", які зьнешнім выглядам і зьместам быў вельмі падобны да свайго папярэдніка.
На гэтым можна было б і закончыць кароткі нарыс пра "Бюлетэнь БНП", але... Беларускі эміграцыйны гісторык Вацлаў Пануцэвіч лічыў, што першы нумар "Бюлетэню..." выйшаў у 1941 годзе і, магчыма, быў "сьвежа адбіты пры ўдзеле [айца] Гадлеўскага ў Варшаве". Нібыта яго меў Усевалад

Родзька на нарадзе актыву БНП у польскай сталіцы ў канцы жніўня 1941 году *(Спадчына, 1993, № 6, б. 70).*
Я думаю, што Пануцэвіч памыліўся, пераблытаўшы два розныя выданьні. У Нацыянальным архіве захоўваецца цікавы дакумэнт — данясеньні савецкай выведкі ў Маскву пра дзейнасьць Беларускай Незалежніцкай Партыі. "У студзені месяцы 1943 года, — цытую дакумэнт, — Цэнтральны камітэт БНП выпусьціў зварот да беларускага народу і апублікаваў праграму партыі. Гэтая праграма была сфармуліравана задоўга да вайны й апублікаваная ў першым нумары бюлетэню беларускіх эмігрантаў за 1940 г. У праграме адзначаюцца прынцыпы, якія ляжаць у аснове і БНП.
Прывядзем некаторыя пункты гэтай праграмы:
"1. Мы змагаемся за незалежную суверэнную беларускую дзяржаву ў этнаграфічных межах Беларусі.
2. Мы ведаем, што найвышэйшым аўтарытэтамі сілай беларускай дзяржавы зьяўляецца арганізаваная і дысцыплінаваная беларуская нацыя. Мы змагаемсяза нацыянальную Беларускую рэспубліку. Мы супраць парламенцкага рэжыму, які падзяляе і аслабляе сілы нацыі. Супраць дыктатуры некалькіх слаёў і палітычных групіровак у народзе.
3. Мы прызнаем, што толькі адзіная палітычная партыя, якая складаецца з лепшага нацыянальнага элементу і кіруецца разумным правадыром зьяўляецца асноўнай сілай народа і дзяржавы. Мы імкнемся аб'яднаць у шэрагах БНП увесь сьведамы беларускі актыў, які апынуўся здольным носьбітам дзяржаўнага аўтарытэта Беларускай рэспублікі (гл. стар. 3 і 5 бюлетэня №1 1940 г.)" *(НАРБ, ф. 4, в. 33а, спр. 524, а. 185).*
Такім чынам, зусім магчыма, што Ўс. Родзька на Варшаўскай нарадзе ў 1941 годзе меў якраз эміграцкі бюлетэнь ад 1940 г., які выдаў айцец Вінцэнт Гадлеўскі, а не "Бюлетэнь БНП". Але гэта ўжо новая, яшчэ неразгаданая тайна, якая чакае свайго дасьледчыка.

## МЫ І "ЎЛАСАЎШЧЫНА"

Выпускаючы навагодні нумар "Бюлетэня" і няхочучы быць неактуальным сярод тых, да чыйго ведама дайшоў ужо маніфэст ген. Уласава, зразумела, што мушу тут парушыць тэму г. зв. "Едзіненьнія" ці інача "Камітэту народаў Расеі".

Тэма гэтая, дзякуючы, з аднаго боку сваёй актуальнасьці, з другога-ж добрай прапагандзе, вышкалянай на бальшавіцкіх мэтадах, сталася даволі актуальнай, а асабліва сярод Беларускага народу, які бадай адзін з першых падняў сьцяг барацьбы з бальшавізмам.
На зьмену нямецкай акупацыі прышла на нашыя землі ізноў ня менш кашмарная акупацыя бальшавіцкая, зь якой мы сяньня змагаемся ў глыбокім падпольлі і розных лясох, ня могучы супроцьставіць раўнавартаснай сілы ў адкрытым змаганьні.
Зразумела, што для нас зьяўляецца саюзьнікам кожная сіла, абапёртая на здаровых нацыянальных асновах, якая імкнецца да стварэньня самастойнага дзяржаўнага арганізму і якой у першую чаргу стаіць на перашкодзе бальшавізм.
І так, цераз супольнае змаганьне супроць бальшавізма Беларускага Краёвага Войска і Украінскай Партызанскай Арміі стварыўся натуральны беларуска-ўкраінскі саюз. Да іх далучаюцца ў супольным змаганьні іншыя народы Каўказу.
Гэты саюз паўстаў з супольна пралітай гэтымі народамі крыві, у супольным змаганьні з супольнымі ворагамі, з каждаразовымі акупантамі, бо вораг наш той, хто бязпраўна захоплівае нашыя землі і адмаўляе нам натуральнага права на незалежнасьць.
І вось, у гэтым часе паяўляецца на арэне антыбальшавіцкага змаганьня новы дзейнік у постаці ген. Уласава.
Зусім зразумелая рэч, што БНП з радасьцю прывітала вестку, што нарэшце таксама і Расейцы паднялі, трыманы ўжо намі і іншымі народамі акупованымі бальшавікамі, сьцяг змаганьня з чырвонаю заразаю.
Паколькі ген. Уласаў стаіць на чыстым і здаровым нацыянальна-расейскім грунце, БНП, як беларуская нацыяналістычная арганізацыя, ня можа і ніколі ня будзе выступаць проціў яго. Але навучаныя на прыкладзе немцаў, якія ішлі супроць бальшавікоў “за вольную Беларусь і Украіну”, што і між іншым і ген. Уласаў ставіць сабе за заданьне, падыходзіць да ўсялякага роду “асвабаджэньняў” з пэўнай засьцярогай.
БНП у супольным змаганьні з бальшавізмам не адкідае такога паважнага саюзьніка, якім ёсьць Расейскі народ і ідзе супольна зь ім з такою мэтаю, каб разьбіць зьненавіджаны бальшавізм і на яго развалінах будаваць Незалежную

Беларусь, разумеючы, што і Расейцы маюць адносна свайго народу тую самую мэту.
Але БНП, як арганізацыя, якая ўзяла на сябе адказнасьць за лёсы і будучыню Беларускага Народу, чутка стаіць на варце самым назовам акрэсьленай ідэі і гатова ўступіць у крывавае змаганьне з найбліжэйшым нават саюзьнікам, калі ён пасягне на нашыя народныя правы, на нашае нацыянальнае я, на нашу Незалежнасьць.

**Д.**

*Бюлетэнь БНП, № 5, сьнежань 1944 г.*

## Ад ЦК Б. Н. П.

Мінуў адзін з шматлікіх гадоў гісторыі Беларусі. І здавалася-бы на першы пагляд, што гэты год, як кожны зь мінулых, год змаганьня за адвечныя ідэалы, год вечных надзеяў, чаканьняў, духовых уздымаў і вечных расчараваньняў.
Але не! Гэты год розьніцца ад усіх іншых. Ён зьяўляецца годам вялікіх надзеяў і годам адраджэньня веры ў народзе ў собскія сілы.
Гэта год у якім даканаўся вялікі псыхічны пераварот у шырокіх масах Беларускага Народу, бо ў гэтым годзе, больш як у іншым, пераканаўся наш народ, што адно толькі ёсьць бязумоўна пэўным у вялікім змаганьні за незалежнасьць — гэта собскія сілы і дзеля таго падняў ён зноў сьцяг адвечнага змаганьня, арганізуючы **БЕЛАРУСКАЕ КРАЁВАЕ ВОЙСКА,** вырасшае з нашага паўстанчага руху на родных загонах.
Беларускае Краёвае Войска, гэта доказ здаровай народнай думкі і вера ў свае сілы.
Таму сяньня, уступаючы ў новы год нашае эры, уступаем у новы этап нашага змаганьня.
Мы, партыйцы, уступаем у яго з пераканаНьнем, што створанае намі Беларускае Краёвае Войска, узгадованае на нашых ідэалах безкампраміснага змаганьня з усімі акупантамі нашай зямлі, ёсьць фактам дакананым і гэта дадае нам сілы і жалезнай вытрымаласьці ў нашым вялікім змаганьні.
Ад імені Партыі ЦК вітаю Вас, змагары БКВ, з Новым Годам і жадаю, каб Вы ўлілі ў свае рады ўсіх тых, хто яшчэ да гэтай пары блудзіць на раздарожжы, шукаючы надарэмна чужацкіх саюзьнікаў у змаганьні за нашыя народныя ідэалы.

Вітаю Вас, браты, загнаныя вайной на чужыя землі і жадаю Вам усім у гэтым Новым годзе мець шчасьце прыступіць да змаганьня, але ўжо не за чужыя нам інтарэсы, а за нашую **М А Ц І — Незалежную Беларусь.**
Вітаю Вас, сябры БНП, жаўнеры штурмовых аддзелаў і ўсіх тых, хто зьяднаўся пад сьцягам БНП з адною думкай: здабыць **Незалежную Беларусь**, або зьгінуць у змаганьні за Яе.
І вітаю Цябе, Беларускі Народ, з Новым Годам і запэўняю Цябе, што сыны Твае уступаюць у яго з цьвёрдым пераканаsuccessor, што год гэты, калі ня будзе годам аканчальнай перамогі, то прынамсі годам, у якім ужо выразна зарысуецца Твая Вольная Постаць, годам вялікага прагрэсу ў змаганьні за Незалежнасьць!
Няхай жыве Беларускі Народ!
Няхай жыве Беларускае Краёвае Войска!
Няхай жыве Незалежная Беларусь і Яе Змагары!

**Канцавы**

*Бюлетэнь БНП, № 5, сьнежань 1944 г.*

**ІНСТРУКЦЫЯ**
**АБ КАРЫСТАНЬНІ І ПЕРАХОЎВАНЬНІ "БЮЛЕТЭНЮ"**

1. Пільнуй, каб не трапіў "Бюлетэнь" у рукі ворага.
2. Ніколі не пакідай у няпэўным месцы.
3. Як найменей насі пры сабе.
4. Прачытай сам, дай прачытаць свайму добраму знаёмаму — сьведамаму беларускаму патрыёту, які ня здрадзіць і забяры назад.
5. Матар'ял выкарыстоўвай у гутарках з сябрамі, але будзь пры гэтым асьцярожны.
6. Перадавай іншым толькі ў "чатыры вочы", бяз прысутнасьці каго-небудзь трэцяга.
7. Аб загінуўшым экзэмпляры дакладай як найхутчэй таму, ад каго атрымаў.

## БЕЛАРУСКАЯ МОЛАДЗЬ

Беларуская моладзь праходзіць яшчэ больш цяжкую і крыжовую дарогу, чымся ўвесь Беларускі народ.

На яе душы адыйгрываецца ў найбольш яркай форме ўся агіда і крывадушнасьць нашых ворагаў.

Не патрэбна шмат аргументаў, каб даказаць, колькі крыўды мусела перанесьці нашая моладзь пад польскай акупацыяй Заходняй Беларусі і зьдзек маральны на ўсіх адрэзках маладое душы у паняволеньні камсамолу.

Ня зрокся надзеі паняволеньня душы нашай моладзі і коратка трывалы акупант нашай Бацькаўшчыны — гітляроўская Нямеччына.

Немцы добра ведалі, што моладзь ёсьць будучыня беларускага народу і хочучы спыніць яе нацыянальны ўздым, накінулі маладой арганізацыі бязхрэбетнае і халуйскае кіраўніцтва ў асобе Ганька. Гэтым самым думалі яны, што пры помачы бяздушнага інструмэнту, якім быў у нямецкіх руках Ганько, удасца выкарыстаць маладую беларускую сілу для сваіх мэтаў.

Аднак здаровая ў сваіх асновах нашая моладзь хутка адшрыфтавала гэтыя подлыя намеры. Ёй ня трудна было пераканацца, што вызначаны ім немцамі кіраўнік гэта нікчэмны “эрзац” і яна хутка знайшла сабе правадыроў вырасшых зь яе радоў.

І так, памятаючы яшчэ польскія экспэрымэнты з гарцэрствам, бальшавіцкія з камсамолам і пераживаючыя апошнія нямецкія  і зноў савецкія, дайшла да перакананьня, што кожны чужынец імкнецца да аднаго: забіць духова беларускую моладзь, каб лягчэй апанаваць народ. Але як-бы ня імкнуліся да гэтага нашыя ворагі, ім ня ўдасца асягнуць сваёй мэты, бо Беларуская Моладзь нацыянальна ўжо сьпелая.

І яна зразумела, якую адказнасьць на сваіх плячах нясе, яна пераканалася, што ад яе залежыць будучыня Беларусі і таму ня мае права прадаць сябе і сваёй душы чужынцам.

І сяньня загнаная сілай у рады Чырвонай Арміі з аднаго боку, а з другога кінутая ў нямецкія лягеры і фабрыкі, страціўшы ўсё ім дарагое: Бацькаўшчыну і сямью, ня страціла аднаго - гэта І Д Э І. Ня страціла адвечнага імкненьня да сонца і свабоды, да незалежнага жыцьця ў Вольнай Бацькаўшчыне! Наш народ маючы такую моладзь можа быць спакойны за сваю будучыню.

Вы, маладыя арляняты, падняліся ў прастору па СОНЦА. Дык не дазвольце чужынцам зламаць Вам крыльле!

Трымайце цьвёрда штандар незалежнасьці ў сваіх маладых руках! З Вамі народ! З Вамі Беларуская Незалежніцкая Партыя!
Гуртуйцеся каля ЯЕ! Пашырайце ЯЕ ідэю, бо ідэя БНП - ідэя народу!

**Каладзей**

*Бюлетэнь БНП,№ 5, сьнежань 1944 г.*

## ДА БЕЛАРУСКІХ ВАЙСКОВЫХ ФАРМАЦЫЯЎ У НЯМЕЧЧЫНЕ, БЕЛАРУСКІХ РАБОТНІКАЎ І ПАЛІТЫЧНАЙ ЭМІГРАЦЫІ

Апошнія падзеі на ўсходзе могуць у найбліжэйшай будучыні пацягнуць за сабой вялікія зьмены ў укладзе Эўропы. Судзячы з хаатычнага адступлення немцаў, трэба спадзявацца развалу Нямеччыны. Астаецца другі вораг, які ўжо акупаваў нашу Бацькаўшчыну і выціскае зь яе апошнія жыцьцёвыя сокі, каб зьдзейсьніць сваю мару — даканаць сусьветнае рэвалюцыі — б а л ь ш а в і з м.
У сувязі з гэтым трэба лічыцца з наступнымі магчымасьцямі:
1. Нямеччына капітулюе на рэч Англіі і Амерыкі і зь іх згодай кадае ўсе свае сілы супраць бальшавікоў, каб адбіць занятыя імі нямецкія тэрыторыі.
2. Капітуляцыя Нямеччыны на рэч бальшавікоў, стварэньне нямецка-камуністычнага ўраду і супольна змагацца супроць Англіі і Амэрыкі.
3. Змаганьне Нямеччыны аж да аканчальнай перамогі саюзьнікаў і падзел яе паміж імі.
У выпадку першым загадваю: гуртавацца ўсім Беларусам у вайсковыя адзінкі, каб стварыць паважную сілу, зь якой мусіла б лічыцца Англія ў змаганьні з бальшавізмам.
У выпадку другім усім Беларусам грозіць выдача нямецкім камуністычным урадам бальшавікам і як рэзультат гэтага, павольнае кананьне ў савецкіх лагерах. Бальшавікі не палічацца нават і з “остамі”, якія перажылі столькі зьдзеку, голаду і непасільнай працы для справы нямецкіх катаў, бо яны лічаць усіх Беларусаў, якія даўжэйшы час прабывалі ў

Нямеччыне, за “пераўзгадованых” немцамі на некарысьць бальшавікоў. У сувязі з гэтым загадваю:

а/ усім беларускім вайсковым фармацыям прабірацца партызанскім спосабам на Бацькаўшчыну і там лучыць у рады Беларускага Краёвага Войска, і далей змагацца за наш ідэал — Н Е З А Л Е Ж Н А С Ь Ц Ь.

б/ работнікам палітычнае эміграцыі, карыстаючы з мамэнту хаосу, узбройвацца і групамі выходзіць з Нямеччыны на Беларусь, дзе ёсьць нашая аснаўная вайсковая база.

в/ гэтаму загаду не падлягаюць беларусы старэйшыя як 50 год, ці зусім слабыя здароўем.

У выпадку трэцім: пункты а. і б. як у другім; да пункту в: імкнуцца дастацца за дэмакрацыйную лінію англа-бальшавіцкую, г. з. за лінію, якая адзеліць Нямеччыну на сферу ўплываў бальшавікоў і Англа-амерыканцаў.

Работнікі і палітычныя эмігранты, абнятыя арганізацыйнай сеткай БНП, паступаюць пад кіраўніцтвам партыйных кіраўнікоў як у пункце а/; Не абнятыя БНП арганізуюць самастойна малыя групы ў сіле 5-10 чалавек і дзейнічаюць, як у пункце а/ і б/.

Прыпамінаю, што надыходзіць вялікі гістарычны мамэнт новага ўкладу сіл у Эўропе, які выкарыстаць для нашай Бацькаўшчыны і дзеля спаўненьня нашых ідэалаў ёсць нашым ідэалам.

Раней ці пазьней дойдзе да канфлікту паміж англа-амэрыканцамі і бальшавікамі, якія пагражаюць зьнішчэньнем усяму цывілізаванаму сьвету. А мы не павінны траціць халоднай крыві і спакойна прыгатоўвацца і чакаць на гэты мамэнт. Мы, Беларусы, паставілі ваё жыцьцё на адну карту: або здабыць н е з а л е ж н а с ь ц ь, або загінуць у змаганьні за Яе. Ані бальшавікі, ані немцы Яе нам не дадуць!

Дык зь верай у лепшую будучыню!

Наша пара надыходзіць!

Няхай жыве Незалежная Б Е Л А Р У С Ь

**Д У Б О В Ы**

Кіраўнік Вайскові ўпоўнаважаны

ад ЦК БНП на Нямеччыну

*Бюлетэнь БНП, № 5, сьнежань 1944 г.*

## КЛІЧЫ БЕЛАРУСКАЙ НЕЗАЛЕЖНІЦКАЙ ПАРТЫІ

Мы змагаемся супроць кожнага, хто нясе няволю нашаму народу!
Далоў чырвонага акупанта!
Сьмерць бальшавізму!
Памятайма аб магілах загінуўшых за волю і незалежнасьць Беларусі!

*Бюлетэнь БНП, № 6, 1946 г.*

## НА БАЯВЫХ СТАНОВІШЧАХ

Апошнія камунікаты аб дзейнасьці партызанцкіх аддзелаў у Беларусі адзначаюць узнаўленьне акцыі Аддзелу с[ябры] Караля ў ваколіцах Браслаўя, дзе ён асабліва актыўна праводзіў акцыю ў лютым-маі 1945 году, маючы ў сваім Аддзеле да 500 жаўнераў. Ён вынішчаў агентаў НКВД, пераважна па сельсаветах, быў для іх сталай пагрозай. НКВД і бальшавіцкія партыйныя работнікі распаўсюджвалі чуткі, што быццам гэты Аддзел ужо зьнішчаны. Аддзел, аднак, панёсшы значныя страты, перакінуўся ў сумежныя раёны Дзісьненшчыны. Толькі ў апошнім часе ізноў узнавіў акцыю ў Браслаўшчыне. З ім навязана лучнасьць.
Ня спыняецца і пашыраецца партызанскі рух у Слонімшчыне. Аддзел, які дзейнічае ў гэтым раёне, налічвае да 200 жаўнераў. Частыя аблавы, арганізаваныя НКВД, дасюль не далі ніякіх значных рэзультатаў. З апошніх большых сутычак адзначаны бой у ваколіцах Казлоўшчыны. Страты Аддзелу выносілі 8 забітых, трох захоплена жывымі. Да гэтага часу яны знаходзяцца ў турме ў Менску. З савецкага боку забіта да 20-ці чалавек. Аддзел здабыў 3 кулямёты, 17 аўтаматаў і іншую зброю. Аддзел адыйшоў у ваколіцы Зэльвы, дзе ўвайшоў у сувязь з Аддзелам Л. [у ліку да 150 чалавек]. Супольнымі сіламі было апанавана мястэчка Азерніца, дзе выбіты аддзел НКВД. Аддзел сябры ЦК БНП Ваўка, прабіваючыся ў глыб Беларусі, натрапіў на моцныя савецкія сілы і змушаны быў уступіць з імі ў бой. С[ябра] Воўк, моцна ранены, з групай сяброў захоплены савецкімі сіламі. Аддзел адыйшоў у напрамку Налібокаў, дзе навязаў лучнасьць з с. Канцавым.

Адзначана дзейнасьць партызанцкага аддзелу с[ябры] Алега ў Вялейшчыне, якая праводзілася паасобнымі групамі Аддзелу ў ваколіцах Кабыльнікаў, Мядзелу, Нарачы і Ілы. Ня спыняе дзейнасьць партызанцкі Аддзел палк. Г. на абшары Меншчыны і Случчыны.
На Палесьсі паасобныя партызанцкія групы раскіданы ў многіх мясцовасьцях і карыстаючыся падтрыманьнем насельніцтва, знаходзяцца блізу вёсак. Сувязь з імі прыпадковая. Шмат паасобных групаў дзейнічае сумесна з УПА.
У зімныя месяцы партызанская дзейнасьць значна сьціхла ў сувязі з цяжкімі ўмовамі.

**Інформ.**

*Бюлетэнь БНП, № 6, 1946 г.*

## III КАНФЭРЭНЦЫЯ БЕЛАРУСКАЙ НЕЗАЛЕЖНІЦКАЙ ПАРТЫІ

30 верасьня 1946 году адбылася III Канфэрэнцыя Беларускай Незалежніцкай Партыі.
Пасьля доўгіх высілкаў навязаньня сувязяў з партыйнымі зьвеньнямі партыі на Бацькаўшчыне і ў замежжы, ЦК Партыі удалося сабраць на нараду дэлегатаў паасобных партыйных асяродкаў.
На канфэрэнцыі была дадзена ацэнка міжнароднага палітычнага палажэньня, абгавораны галоўныя мамэнты Беларускага вызвольнага руху ў Беларусі і за рубяжом і намечаны канкрэтныя заданьні паасобных аддзелаў БНП на найбліжэйшы час. З заслуханых справаздачаў адзначаны сталы рост БНП на Бацькаўшчыне, якая захоўвае [неразборліва] пазыцыі партызанскага руху і шырыцца ў падпольлі.
Пастаноўлена разгарнуць шырэй працу сябрамі партыі у тых краінах, дзе яшчэ ня існуюць арганізацыі БНП.
На канфэрэнцыі распрацована становішча БНП да розных [неразборліва] беларускіх палітычных угрупаваньняў, якое пастаноўлена давесьці да ведама ўсіх сяброў БНП.
Асаблівая ўвага на Канфэрэнцыі была зьвернута на працу сярод вайскоўцаў. Вайсковаму Аддзелу былі пастаўлены

канкрэтныя заданьні ў гэтай галіне. [неразборліва] …зьвязаныя з працай Аддзелу Вайсковай Сувязі.
Пастановы Канфэрэнцыі даручана праводзіць у жыцьцё паасобным аддзелам БНП.

*Бюлетэнь БНП, № 6, 1946 г.*

## З ЖЫЦЬЦЯ ПАРТЫІ

### ВЫПІСКА З ПРАТАКОЛУ № 3

Паседжаньне Цэнтральнага Камітэту (замежны сэктар) Беларускай Незалежніцкай Партыі ў складзе 6 чалавек пры прысутнасьці 2 краёвых кіраўнікоў партыі і сябры ЦК партыі на Бацькаўшчыне. 19 сьнежня 1948 году.
Па першаму пункту парадку дня слухалі: унутрыпартыйны стан БНП на эміграцыі — даклад сябры ЦК партыі Коласа і сябры зам. сэктара партыі Савы, які прадставіў унутранае палажэньне ў ЦК БНП. У выніку ваенных падзеяў 1944 году частка сяброў БНП была змушана апынуцца за межамі Бацькаўшчыны, дзе стварылі замежны сэктар БНП. На працягу пэўнага часу некаторыя сябры ЦК без ведама ЦК і ў тайне ад партыі супрацоўнічалі ў шэрагах іншых палітычных колаў, што ўваходзіць у супярэчнасьць з агульнапартыйнымі прынцыпамі і зьяўляецца выступленьнем супраць * 16 Статуту БНП, на аснове якога даныя сябры падлягаюць выдаленьню з радоў БНП. Ненармальнасьць і шкоднасьць такога стану сьцьвердзіў дэлегат ЦК з Бацькаўшчыны. Пастанавілі:
1. заслухаўшы даклад сб. Савы і прыняўшы пад увагу занятае становішча дэлегата ЦК з Беларусі, выключыць наступных сяброў ЦК з радоў БНП: 1. Барыса Рагулю, 2. Міхася Рагулю, 3. Уладзімера Набагеза, падаючы да ведама ўсім сябром партыі.
2. Пацьвердзіць рэзалюцыю, прапанаваную дакладчыкамі (прынята аднагалосна).

**ПРАЦА і ВОЛЯ** (орган Беларускай Незалежніцкай Партыі), № 1 студзень 1949 г.

## Р Э З А Л Ю Ц Ы Я
**Цэнтральнага Камітэту /замежны сэктар/ Беларускай Незалежніцкай Партыі аб унутрыпартыйным стане на эміграцыі:**

Упартае змаганьне супроць маскоўска-бальшавіцкіх й нямецка-гітлераўскіх акупантаў за вольнасьць і незалежнасьць Беларусі ў гады 2-ой сусьветнай вайны і разуменьне ім неабходнасьці абʼеднаных і арганізаваных дзеяньняў пацягнула за сабою стварэньне перадавой часткі яго — Беларускай Незалежніцкай Партыі. Правідловасьць праграмы і тактыкі партыі спрычынілася да хуткага колькаснага росту яе шэрагаў і да набыцьця ёю высокага аўтарытэту сярод шырокіх колаў беларускага грамадзтва. Гэты стан і аўтарытэт партыі ня толькі не паслабелі з канцом вайны, але яшчэ больш узмоцніліся: працяг змаганьня беларускага народу на бацькаўшчыне пад кіраўніцтвам Беларускай Незалежніцкай Партыі супроць маскоўска-бальшавіцкіх акупантаў спрычыніўся да далейшага ўнутранога ўзмацненьня партыі і адначасна павялічэньню яе аўтарытэту сярод беларускага народу. Гэта знайшло сваё выражэньне ў далейшым росьце шэрагаў партыі на Бацькаўшчыне і на эміграцыі, і ў стварэньні на эміграцыі замежнага сэктару партыі начале з Цэнтральным Камітэтам, у сьціслай сувязі між партыяй на Бацькаўшчыне і яе часткай на эміграцыі.

На грунце гэтага і ўва ўмовах вымушанага нелегальнага існаваньня і дзейнасьці партыі, у апошні год выявіліся хваробныя зьявішчы:

па-першае: высокі аўтарытэт партыі прычыніўся да таго, што частка беларускага грамадзтва прышла да памылковага перавялічэньня становішча партыі, да прызнаньня яе за адзіную партыю Беларускага Народу. Гэта знайшло сваё асабліва яскравае выражэньне ў пастановах чацьвёртага зьезду Саюзу Беларусаў у Бэльгіі, якая між іншым гаворыць:

“5. Уважаць за адзіную нацыянальную народную партыю — “Беларускую Незалежніцкую Партыю”. Як сапраўдную народную, абапертую на беларускія масы ў краі і пастаўленую ад пачатку свайго заснаваньня на канкрэтным шляху вызвольна-рэвалюцыйнага змаганьня за ажыцьцяўленьне беларускіх дзяржаўных мэтаў” (апублікавана ў газэце “Бацькаўшчына” № 11 (14), 11 красавіка 1948 г.).

Замежны сэктар ЦК партыі ў поўнай згодзе з Цэнтральным Камітэтам Партыі прызнае, што іменна таму, што Беларуская

Незалежніцкая Партыя ад самага пачатку абаперта на беларускія масы ў краі і стаіць на шляху ажыцьцяўленьня беларускіх дзяржаўных мэтаў спосабам рэвалюцыйнага змаганьня з удзелам усяго народу (а не загаворшчыцкім спосабам групкі нейкіх "шчыра-патрыятычна настроеных"), іменна таму, яна (Беларуская Незалежніцкая Партыя) ніколі не стаяла і не стаіць на пункце гледжаньня сваёй манапольнай аднапартыйнасьці ў беларускім грамадзтве, стоячы ад пачатку на прынцыпе дэмакратызму, які ўключае ў сябе як абапертасьць партыі на масах, так і права на існаваньне ўсякай іншай беларускай партыі.

Па-другое: у супроцьлежнасьці пераацэнкі становішча партыі, элемэнты, частка з якіх вызначылася ў гады вайны тым, што палявала на беларускі актыў, супрацоўнічаючы з немцамі, згуртаваўшыся на эміграцыі ў "крывіцкую (беларускую) Нацыянал-дэмакратычную партыю", абвесьціўшую ў сваёй праграме "партыйнасьць адзінае партыі" нейкіх "шчыра-патрыятычна настроеных" ("Бацькаўшчына" № 1 (4), 25 студзеня 1948 г.), павялі і надалей барацьбу супроць Беларускай Незалежніцкай Партыі. Ня маючы змогі на далейшае вынішчэньне сяброў БНП, яны перайшлі да тактыкі маральнага ганьбаваньня ўсяе Беларускае Незалежніцкае Партыі і да спробаў спляміць яе ў ваччу беларускага грамадзтва. Так, роўна цераз тыдзень пасьля надрукаваньня рэзалюцыі зьезду Саюзу Беларусаў ў Бэльгіі, а менавіта 18 красавіка 1948 г. яны для выпраўленьня свае памылкі надрукавалі ў той-жа сваёй газэце "Бацькаўшчына" наступнае: (што да аўтарытэту БНП)

..."некаторыя чытачы пытаюцца ў нас, ці падзяляем мы такое становішча, занятае зьездам беларусаў ў Бэльгіі... Чытачы гэтыя мяркуюць, што мы, магчыма, манімося таксама падтрымаць і фармаваны гэным зьездам аўтарытэт БНП, ці мо' маўкліва, прынамсі, падтрымліваем яго ўжо"...

і далей (што да паходжаньня БНП, яе грамадзкае масавае базы і яе прыроды):

..."пры нядаўнім спатканьні з ...гітлераўскім таталітарызмам-нацызмам, асабліва на першых часох, выявілася была тая цяга да "партыйнага жыцьця" сярод ніжэйшых падонкаў грамадзтва, нястрымлівае імкненьне калі не пралезьці ў самую гітлераўскую партыю... вытварыць нейкую сваю"... Характарызуючы гэта, як "моцны смурод плыткага кар'ерызму і шкурніцтва", а годнасьць партыйца, як сымбаль

“прайдзісьвета, кар’ерыста, шкурніка, варацілы, грамілы... і ганьбу для чалавека сумленнага” (“Бацькаўшчына” № 12 (15), 18 красавіка 1948 г.).

Такое па-панскі агіднае становішча да Беларускай Незалежніцкай Партыі і як да “ніжэйшых падонкаў грамадзтва” і выліцце на сяброў Беларускай Незалежніцкай Партыі такой гразі і маральнай абразы з боку крывіцкай групоўкі. Цэнтральны Камітэт БНП ўважае за зусім зразумелае зьявішча і лічыць, што гэта выклікана іменна тым, што БНП ёсьць “сапраўдная, народная, абапертая на беларускія масы ў Краі і пастаўленая ад пачатку свайго заснаваньня на канкрэтным шляху вызвольна-рэвалюцыйнага змаганьня за ажыцьцяўленьне беларускіх дзяржаўных мэтаў” (з рэзалюцыі Зьезду Беларусаў у Бэльгіі), і што яна (БНП) злажыла ў гераічнай барацьбе за вольнасьць і незалежнасьць Беларусі найбольшую колькасьць ахвяраў. ЦК БНП уважаў-бы за слабасьць партыі калі-б яна выклікала да сябе сымпатыю з боку крывіцкай групоўкі.

па-трэцяе: цяжкія ўмовы сучаснага нелегальнага існаваньня і змаганьня Беларускай Незалежніцкай Партыі ды такое нястрыманае цкаваньне яе з боку яе ворагаў прывяло да таго, што прыстаўшыя ў свой час да яе і пралезшыя нават у яе кіруючыя ворганы Рагуля Барыс, Рагуля Міхась і Уладзімер Набагез (у якасьці сябраў ЦК), няздольныя да працы ў цяжкіх умовах і кіруючыся заўсёды матывамі асабістай кар’еры, ня гледзячы на іх асьвядомленасьць адносна па-панскі агіднага становішча да БНП з боку крывіцкай групоўкі, перабеглі якраз у тойсамы лягер крывіцкае групоўкі, якая побач з усімі сябрамі БНП ставілася і да іх-жа , як да “ніжэйшых падонкаў грамадзтва” ды цкавала як “шкурнікаў, прайдзісьветаў, кар’ерыстаў, варацілаў, грамілаў) і да г. пад.

ЦК БНП, кіруючыся * 16 Статуту БНП, лічыць зусім правідловым выключэньне Рагулі Барыса,Рагулі Міхася і Набагеза Уладзімера з шэрагаў партыі (пратакол № 3 ад дня 18-19 сьнежня 1948 г.), як згубіўшых ня толькі годнасьць сябры Беларускай Незалежніцкай Партыі, але і ўсякае пачуцьце чалавечага гонару, спляміўшых сябе маральна, як сапраўдных кар’ерыстаў. ЦК партыі лічыць, што выбыцьце іх з партыі толькі ўзмацняе самую партыю, яе аўтарытэт, яе баёвую здольнасьць.

па-чацьвертае: з тых-жа кар’ерскіх матываў, “ад’ютантам і целахраніцелем” сп. Абрамчыка, ды каб апраўдаць як-небудзь

сваю перабежку, Рагуля Барыс сумесна з Рагуляй Міхасём і Набагезам Уладзімерам адначасна абвесьцілі сябе “Беларускай Незалежніцкай Партыяй” і тым далі повад крывіцкай групоўцы, той самай групоўцы, якая 18 красавіка 1948 г. абвясьціла Беларускую Незалежніцкую Партыю “па ніжэйшыя падонкі грамадзтва”, праз дзесяць месяцаў пазьней абвесьціць прыналежнасьць Беларускай Незалежніцкай Партыі да свайго задзіночаньня, гаворачы:
“Беларускі Нацыянальны Цэнтр... аб’ядноўвае ня толькі Беларускую Нацыянал-дэмакратычную партыю (крывіцкую), (беларускую) Нац.- Дэм. Партыю ЦК) і Беларускую Незалежніцкую Партыю, але і старую Беларускую Хрысьціянска-Дэмакратычную Партыю ды Усекрывіцкае Незалежніцкае Задзіночаньне Дэмакратычнае... якія ў рамах БНЦ маюць поўную свабоду разьвіцьця сваіх назаўсёды з сабою згодных ідэалёгіяў” (“Бацькаўшчына” № 1 (45) 2 студзеня 1949 г.).
ЦК БНП уважае, што крывіцкая групоўка выкарыстоўвае кар’ерызм перабежчыкаў дзеля таго, каб дэз’ар’ентаваць сяброў БНП і беларускую грамадзкасьць і адначасна далей пляміць Беларускую Незалежніцкую Партыю ўжо не імёнамі “ніжэйшых падонкаў грамадзтва”, “шкурнікаў, прайдзісьветаў, варацілаў, грамілаў і т. пад.”, а нібы фактам самадалучэньня БНП да крывіцкай групоўкі, бо ў сапраўднасьці ЦК БНП і сябры ніколі ня лічылі і ня лічаць сваю ідэалёгію згоднай з крывіцкай ідэалёгіяй, ніколі не ўваходзілі ў ніякія арганізацыйныя сувязі з крывіцкай групоўкай, або “Беларускім Нацыянальным Цэнтрам”, ці “Крывіцкай (Бел.) Нац. - Дэм. Партыяй і інш.
Выходзячы з усяго гэтага, ЦК Партыі (замежны сэктар) ухваляе:
1. падкрэсьліць сваю нязьменную падпарадкаванасьць ЦК на Бацькаўшчыне, сваю вернасьць праграме і Статуту Партыі, якія не маюць нічога супольнага з ідэалёгіяй крывіцкай групоўкі і яе арганізацыйнымі прынцыпамі і свае прынцыпы дэмакратычнага супрацоўніцтва з партыямі беларускага народу. Прасіць сб. Коласа паведаміць аб гэтым ЦК Партыі.
2. даручыць краёвым кіраўнікам партыі: сб. Явару і Гарбузу ў Нямеччыне, сб. Чорту ў Англіі і сб. Пералазу ў Францыі ды сб. Стругану ў Бэльгіі і давесьці гэтую пастанову да ведама ўсіх сяброў БНП.

3. увядзеньне ў склад ЦК (замежны Сэктар) сб. Явара і Гарбуза (краёвых кіраўнікоў) паставіць на зацьверджаньне агульнага зьезду акруговых кіраўнікоў партыі (* 5 Статуту).
4. папярэдзіць краёвыя і акруговыя арганізацыі партыі аб магчымасьці далейшых спробаў афэнзывы крывіцкае групоўкі ў справе БНП прычым ня выключана магчымасьць ужываньня ёю любых мэтадаў і загадаў, асабліва спосабам засылкі ў шэрагі БНП сваіх сяброў з мэтай унутранага падзелу партыі.
5. З мэтай умацаваньня ўнутрыпартыйных сувязяў і шэрагаў сяброў БНП падрыхтаваць выпуск партыйнага воргану пад назовам “Праца і Воля”.
6. Даручыць сб. Коласу апублікаваць гэтую рэзалюцыю дзеля таго, каб пазбавіць ворагаў партыі магчымасьці фальшаваць сапраўдны стан рэчаў.
7. Адначасна апублікаваць пастанову ЦК БНП ад дн. 17-19 сьнежня 1948 г.

Сакратар ЦК БНП

(замежны сэктар)

(--) Явар

*ПРАЦА і ВОЛЯ, № 1 студзень 1949.*

## КАМУНІКАТ БЕЛАРУСКАЙ НЕЗАЛЕЖНІЦКАЙ ПАРТЫІ

У сувязі з зацемкай у “Беларускім Слове” № 1 аб міжпартыйнай канфэрэнцыі, якая быццам мела месца ў Міхэльсдорфе, замежны сэктар ЦК БНП паведамляе, што ён не даваў нікому з сваіх сяброў мандату на рэпрэзэнтаваньне Беларускай Незалежніцкай Партыі на вышэй успомненай канфэрэнцыі.

**ЦК БНП — Замежны Сэктар**

*Бацькаўшчына (Мюнхэн), № 3 (47), 23 студзеня 1949.*

## ЛІСТ СЯБРЫ ЦК БНП

Глыбокапаважаны спадар рэдактар!

У газэце "Бацькаўшчына" (№ 3 ад 23 студзеня 1949 г.) зьмешчаны Камунікат Замежнага Сэктару ЦК Беларускае Незалежніцкае Партыі, у якім адзначаецца, што Замежны Сэктар не даваў нікому мандату на рэпрэзэнтацыю БНП на Міжпартыйнай Канфэрэнцыі ў Міхельсдорфе. Паколькі я разам з іншымі сябрамі БНП прыймаў актыўны ўдзел у працы гэтай Канфэрэнцыі, дазвольце праз Вашую высокашаноўную газэту давесьці да агульнага ведама наступнае:

паперша, лічу што ўдзел у працы **Міжпартыйнай** Канфэрэнцыі, якая ставіла перад сабой адзіную мэту — кансалідацыю ўсіх нашых партыйных сілаў на эміграцыі для сумеснае барацьбы за Вольную і Незалежную Беларусь, гармануе з праграмай БНП. Адначасна лічу недапушчальным зьмяшчэньне Камунікату Замежнага Сэктару ЦК БНП на старонках **партыйнага** органу, які тройчы абразіў Сьвятую Памяць сябры ЦК БНП Хведара Ільляшэвіча.

падругое, сьцьвярджаю, што дагэтуль я асабіста не атрымаў ні аднаго ліста ад сяброў ЦК БНП, які б запярэчыў той удзел у працы Канфэрэнцыі. На падставе гэтага раблю выснаў, што сябра, які ўзначальвае Замежны Сэктар ЦК БНП спрабуе, ня маючы на гэта ніякага права, падмяніць сабой ЦК БНП.

патрэцяе, выразы ў Камунікаце накшталт "канфэрэнцыя, якая быццам мела мейсца" або "зацемка", надаюць яму суб'ектыўны, залежны ад некага характар, зусім неўласьцівы нашай Беларускай Незалежніцкай Партыі. Прыпушчаю, што Камунікат гэты зьяўляецца фікцыяй.

Застаюся з пашанай да ўсіх сябраў БНП на чужыне і на Бацькаўшчыне, сябра ЦК БНП **Палын**.

*Беларускае Слова (Міхельсдорф), № 4, 5 лютага 1949.*

## ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

Паважаны спадар Рэдактар!

Таму, што ў "Рэзалюцыі Цэнтральнага Камітэту (замежны сэктар) Беларускай Незалежніцкай Партыі аб унутрыпартыйным стане на эміграцыі", надрукаванай у №1 часапісу "Праца і Воля", які заве сябе "органам БНП", зьмешчаны шэраг закідаў ў дачыненьні да мяне, маючых на мэце бясчэсьціць маё імя, як сябры гэтае партыі і чалавека

наагул, гэтым ветліва прашу падаць да агульнага ведама праз Вашу газэту наступнае маё асьветчаньне ў гэтай справе:

1. Няпраўдай зьяўляецца, што ў паседжаньні Цэнтральнага Камітэту (замежны сэктар) Беларускай Незалежніцкай Партыі дня 18-19 сьнежня 1948 г. (аб якім гаворыць вышэй успомненая рэзалюцыя) ўзялі ўдзел 6 сябраў ЦК БНП (замежны сэктар).

Затое праўдай зьяўляецца, што пасьля выезду з Эўропы аднаго і сьмерці другога — сябры ЦК БНП, замежны сэктар яго складаецца фактычна з 5 асобаў, за якіх у вышэй успомненым паседжаньні ўзялі ўдзел толькі 2 асобы. Рэшта 4 асобы, аб якіх гаворыцца ў камунікаце, гэта звычайныя сябры партыі, не ўваходзячыя ў склад яе ЦК.

2. Няпраўдай зьяўляецца, што кіруючыся матывамі асабістай кар'еры я "прыстаў у свой час да партыі і пралез нават у яе кіраўнічыя ворганы (у якасці сябры ЦК)".

Затое праўдай зьяўляецца, што ўлетку 1942 году ў Менску я браў удзел у нелегальным арганізацыйным зьездзе Беларускай Незалежніцкай Партыі, актыўна супрацоўнічаў пры ўкладаньні праграмы і статуту яе і, пад партыйным псэўдонімам "Чорны", зьяўляўся сябрам Цэнтральнага Камітэту партыі ад першага дня яе заснаваньня да апошняга часу, маючы ў непасрэдным падпаракаваньні выдавецтва партыйнага органу "Бюлетэнь".

3. Няпраўдай зьяўляецца, што я перайшоў у "крывіцкую групоўку".

Затое праўдай зьяўляецца, што як сябра ЦК БНП, я займаў і займаю няпрыхільнае становішча што да тактыкі Беларускае Нацыянал-Дэмакратычнае Партыі (маё выступленьне на зьездзе Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Остэргофэне вясною 1948г.).

Праўдай, аднак, зьяўляецца і тое, што, ня гледзячы на разыходжаньні праграмнага й тактычнага характару, якія розьняць нас ад іншых партыяў, а маючы наўвеце першую і галоўную мэту нашага змаганьня — незалежнасьць Беларусі, мы, як сябры ЦК БНП, увайшлі згодна з прынцыпам "роўныя з роўнымі" ў кантакт з тымі зь іх, якія ня толькі на словах, але ў сваёй дзейнасьці працуюць для дасягненьня гэтае мэты. Таму адзін з нас ад імя БНП увайшоў у міжпартыйную каардынацыйную арганізацыю — Беларускі Нацыянальны Цэнтр. Гэта згодна зрэштай з пастановамі 3-яй канфэрэнцыі БНП з дня 30 верасьня 1946 г., якая падкрэсьлівае патрэбу

супрацоўніцтва зь іншымі палітычнымі групамі (глядзі “Бюлетэнь №6 — “Дзьве тактыкі”).
4. Няпраўдай зьяўляецца, што я, з двума другімі сябрамі ЦК БНП (замежны сэктар), “абвясьцілі сябе Беларускай Незалежніцкай Партыяй”.
Затое праўдай зьяўляецца, што, складаючы большасьць у ЦК БНП — замежны сэктар (3 на агульную колькасьць 5 сяброў), мы мелі поўнае права выступаць ад імя партыі і займаць тое ж іншае становішча ў пытаньнях палітычна-грамадзкага характару.
5. Няпраўдай зьяўляецца, што супрацоўніцтва БНП (якое ажыцьцяўляецца праз сяброў яе ЦК) зь іншымі палітычнымі групоўкамі, пярэчыць агульнапартыйным прынцыпам і зьяўляецца выступленьнем супраць *16 Статуту партыі.
Затое праўдай зьяўляецца, што Статут БНП забараняе звычайным сябрам яе належыць да іншых партыяў ці палітычных групаў.

**Інж. Рагуля Міхась**

*Бацькаўшчына, 9 сакавіка 1949 г.*

## ПРЭЗЫДЭНЦКІ СЬЦЯГ БНР

### “Уздымем яго высока — або ён прыкрые нас!”
### (з успамінаў)

Па сьмерці Прэзыдэнта БНР Васіля Захаркі ў сакавіку 1943 г. было ясна, што ягонае памешканьне будзе прафанавана ўраднікамі гітлераўскай службы бясьпечнасьці або, у найлепшым выпадку, нямецкім служкам Ермачэнкам. Таму сябрамі беларускага нацыянальнага актыву была зарганізаваная апека над усімі дарагімі памяткамі па вялікім Нябожчыку й ягонай працы, як Прэзыдэнта БНР. У ліку гэтых дарагіх сэрцу кажнага беларуса памятак быў архіў БНР і прэзыдэнтаў сьцяг.
Мне выпала на долю даручэньне Прэзыдыюму Рады БНР перахоўваць якраз гэны сьцяг. Перахоўваўся ён некалькі дзесяткаў кілёмэтраў ад Бэрліна з гледзішча на небясьпеку паветраных налётаў на нямецкую сталіцу.
Вясна 1945 г. Хуткімі крокамі набліжаўся ведамы й ясны эпілёг вайны. Ці далей змагу перахоўваць дарагую

нацыянальную памятку, — ставалася для мяне з кажным днём болей і болей сумліўна.
Яшчэ ўлетку 1944 г. увязаўся я ў актыўнае супрацоўніцтва з БНП, асабліва зь некаторымі сябрамі ЦК гэтае партыі.
Адзін із сяброў ЦК БНП прыгатаўляўся із сваім аддзелам да змаганьня за волю народу й беларускую дзяржаўнасьць на Бацькаўшчыне. Для мяне было назначана іншае заданьне. Гэтаму сябру было пастаноўлена перадаць гэтую сьвятую памятку.
Сталася гэта ў першых днях сакавіка 1945 г. у Бэрліне, у дзялянцы Шарлётэнбург, у гатэлі “Гамбургэр Гоф” застаў я сябру камандзіра Р[одзьку] у прысутнасьці сьв. п. маёра Гелды ды аднаго ад’ютанта-абсальвэнта Віленскай беларускай гімназіі, прозьвішча якога сяньня не прыпамінаю.
Выясьніўшы мэту свайго прыбыцьця, я выняў з партфэля нашую нацыянальную сьвятасьць — бел-чырвона-белы сьцяг Прэзыдэнта Захаркі. Усхапіліся зь месца маладыя арлы-жаўнеры. З адпаведнай дзеля пашаны паставай стаўшы на калені, узяў з маіх рук сябра камандзір сьцяг, пацалаваў яго і з павагай і моцай прысягі выказаў гэткія словы: “Уздымем яго высока, або ён пакрые нас!”
Дарогай падпольнай вандроўкі пайшоў сьцяг Прэзыдэнта БНР на Бацькаўшчыну, каб там быць сьветкам і ўдзельнікам крывавай долі свайго народу.
Ня ведаю сяньня ягонае долі, ані энтузыястычных юнакоў, якія яго туды панесьлі. Адно толькі пэўна — не аднаго ён ужо там прыкрыў... Але й не адныя рукі ўздымаюць яго што раз вышэй, аж пакуль не абдыме некалі трыумфальным павевам усяе нашае, ужо вольнае Бацькаўшчыны.
Прайшлі гады... На твае рукі сябра камандзір, складаў я сваю прысягу — “Здабуду незалежную Беларусь, або ў змаганьні злажу сваё жыцьцё!”. Сяньня здалёк пасылаю другую частку гэтае прысягі: “Наш сьцяг дзяржаўны Беларускай Народнай Рэспублікі ўздыму высока, або хай ён прыкрые мяне!”

**С. Каладзей***, сябра БНП.

*Бацькаўшчына (Мюнхэн), № 8 (52), 25 сакавіка 1949 г.*

** Пад гэтым псэўданімам, праўдападобна, схаваўся Станіслаў Грынкевіч (малодшы).*

**ПРАТАКОЛ**

**чарговага паседжаньня ЦК БНП з дня 23 студзеня 1950 г. у Ватэнштэце. На паседжаньні былі прысутнымі: Сава, Сокал, Валошка, Явар і Крапіва. На сакратара паседжаньня быў пакліканы Крапіва.**

Была прынята наступная павестка дня:

1. Мэтады працы ЦК і сяброў ЦК /дакл. Валошка/.
2. Мерапрыемствы па арганізацыйнаму ўмацаваньню шэрагаў партыі /дакл. Сава/.
3. Чарговыя задачы працы сярод моладзі /дакл. Валошка/.
4. Аб вайсковай працы /дакл. Явар/.
5. Аб дзейнасьці Беларускага Міжпартыйнага Каардынацыйнага Камітэту і газэты “Беларускае Слова” /дакл. Явар/.
6. Аб мерапрыемствах у сувязі з перасяленьнем лягеру “АБЦ” /дакл. Явар/.
7. Рознае: а/ Зацьверджаньне тэхнічнага сакратара ЦК; б/ Аб чарговым паседжаньні ЦК; в/ Выпуск чарговага нумару партыйнага часапісу; г/ Падрыхтоўка да сьвяткаваньня 25 сакавіка.

Пункт першы: дакл. Валошка сказаў, што тут ідзе перадусім аб унутранай працы ЦК, што павінна быць цеснае супрацоўніцтва паміж сябрамі ЦК і ў першую чаргу павінна быць сумленнае адношаньне да ўзятых на сябе абавязкаў.
Пункт другі: была прынята наступная пастанова:

**Пастанова**
**Цэнтральнага Камітэту Беларускай Незалежніцкай Партыі аб арганізацыйным умацаваньні шэрагаў партыі.**
Разьвіцьцё і арганізаванасьць масавага нацыянальна-вызвольніцкага руху беларускага народу за апошняе дзесяцігодзьдзе знайшло сваё выражэньне і афармленьне ў стварэньні Беларускай Незалежніцкай Партыі, у посьпехах яе кіраўніцтва гэтым рухам і ў колькасным росьце яе ўласных шэрагаў. Асаблівай хуткасьці колькасны рост партыі набыў у часе другой сусьветнай вайны і працягваецца ў пасьляваенныя годы. Гэта выражае сабою сьцісласьць партыі з беларускім народам і сьведчыць аб правідловасьці яе ідэйных і арганізацыйных прынцыпаў, на каторых яна будуецца і аб яе аўтарытэтнасьці ў масах беларускага народу. Партыя выйшла з ваеннага і пасьляваеннага

агульнапалітычнага крызісу ідэйна і арганізацыйна непахіснай і прадаўжае змаганьне за незалежнасьць вольнасьць Беларусі і беларускага народу з цьвёрдай верай у ажыццяўленьне гэтай яе аснаўной мэты.
Гэты колькасны рост шэрагаў партыі, з аднаго боку, і адыход з яе шэрагаў выпадковых і хісткіх элемэнтаў, расчараваных вынікамі другой сусьветнай вайны што да зьдзейсьненьня незалежнасьці Беларусі, з другога боку, — ставіць перад партыяй заданьне — правясьці неабходныя мерапрыемствы, накіраваныя на арганізацыйнае ўмацаваньне сваіх шэрагаў з тым, каб партыя магла быць здольнай і заўсёды гатовай выканаць тыя заданьні, якія стаяць перад ёю ў сучаснай і прышлай барацьбе беларускага народу за сваю нацыянальную і сацыяльную вольнасьць.
Выходзячы з гэтага Цэнтральны Камітэт пастанаўляе:
1/. Правясьці агульную рэгістрацыю сяброў партыі. Канчатковым тэрмінам рэгістрацыі ўстанавіць 1-га чэрвеня 1950 г. Рэгістрацыя павінна праводзіцца ў пяцёрках па форме паводле фармуляра, які далучаецца. Рэгістрацыйныя сьпіскі перасылаюцца па партыйнай інстанцыі ў Цэнтральны Камітэт.
2/. Правясьці выдачу партыйных білетаў усім зарэгістраваным сябром партыі. Зацьвердзіць форму партбілета /форма дадаецца/. Выдачу партбілетаў распачаць зараз-жа па сканчэньні рэгістрацыі і скончыць у працягу месяца. Партыйныя білеты запаўняюцца на кожнага сябру партыі ў Цэнтральным Камітэце і выдаюцца на рукі па прыналежнасьці пад расьпіску праз краёвых кіраўнікоў.
3/. Увясьці для кожнага сябры партыі абавязковыя месячныя партыйныя ўнёскі. Вялічыню партыйных унёскаў устанавіць у разьмеры 2 проценты ад прыбытку /заработнай платы, прыбытку гаспадаркі, гандлёвай прыбылі і т. п./. Скарыстаньне сумаў партыйных унёскаў устанавіць згодна статуту.
4/. Лічыць неабходным стварэньне краёвых партыйных камітэтаў, якія выбіраюцца канфэрэнцыяй кіраўнікоў пяцёрак, і стварэньне ў камітэтах як мінімум арганізацыйнага і культурна-прасьветнага адзьдзелаў.
5/. увясьці ў абавязковую форму партыйнай працы — правядзеньне ў пяцёрках партыйных сходаў, якія праводзіць ня менш аднаго разу ў месяц з абгаварэньнем пытаньняў міжнароднай палітыкі, стану і заданьняў вызвольніцкай

барацьбы беларускага народу, партыйнай палітыкі і канкрэтнай партыйнай працы і інш., лічыць гэтую форму працы асноўнай школай партыйнага і палітычнага выхаваньня сяброў партыі.
6/. Паставіць за заданьне партыйным адзьдзелам /камітэтам, пяцёркам/ увясьці сталую плянавую партыйную працу з азначэньнем у плянах задач і формаў працы на вядомы прышлы час /на месяц, на тры месяцы і т. д./.
7/. Прапанаваць партыйным адзьдзелам /камітэтам, пяцёркам/ увясьці ў сябе сталы найпрасьцейшы вучот пазапартыйнага /прадстаўляючага партыйны інтэрэс/ асяродзьдзя і вучот праробленай працы.
8/. Устанавіць пісьмовую справаздачнасьць партыйных адзьдзелаў, якая дасылаецца адзін раз у тры месяцы ў вышэйшую партыйную інстанцыю. Лічыць неабходным як мінімум уключэньне ў справаздачнасьць данных: а/. Колькаснага складу партыйнага адзьдзелу; б/. Рост партыі /даныя аб прыйме ў партыю/ і выбыцьцё з партыі і перамяшчэньне сябраў партыі; в/. Ведамасьці аб праведзенай партыйнай працы; г/. Асабліва цікавыя падзеі і здарэньні ў партыйнай арганізацыі і ва ўмовах працы; д/. Праца ў грамадзкіх арганізацыях /маладзёжных, вайсковых, жаноцкіх, прафэсыянальных і іншых/.

Пункт трэці — была прынята наступная пастанова:

**Пастанова**
**Цэнтральнага Камітэту Беларускай Незалежніцкай Партыі аб стане і чарговых заданьнях беларускага маладзёжнага руху.**

Разьвіцьцё і характар беларускага маладзёжнага руху ў значнай ступені азначае сабою ўвесь лёс Беларускага вызвольніцкага руху. Толькі маладзёжны рух, накіраваны па правідловаму шляху ўзгадаваньня і выхаваньня беларускай моладзі зьяўляецца адной з вырашальных умоваў посьпеху ўсяе далейшае, сучаснае і будучае вызвольніцкае барацьбы Беларускага народу; толькі правідловая ўзгадаваная і выхаваная беларуская моладзь здольна нясьці сьцягі вызвольніцкай барацьбы, быць крыніцай для папаўненьня шэрагаў змагароў за беларускую справу і рэзэрватам партыі.
За мінулае дзесяцігодзьдзе Беларускі маладзёжны рух меў значныя дасягненьні і посьпехі: а/. ён набыў характар

масавага руху, ахапіўшы сабою дзесяткі тысяч беларускай моладзі і ўцягнуўшы яе ў агульны фронт вызвольніцкага змаганьня Беларускага народу; б/. праз Саюз Беларускай Моладзі набыў духу і характару глыбокага нацыянальнага — беларускага патрыятызму, любові да свайго народу і бацькаўшчыны; в/. праз Саюз Беларускай Моладзі і Беларускі Скаўтынг набыў вялікі вопыт і практыку арганізацыі моладзі іх узгадаваў кадры арганізатараў яе; г/. праз Беларускі Скаўтынг садзейнічаў папулярызацыі Беларускай справы ў сусьветным маштабе і справе супрацоўніцтва беларускай грамадзкасьці з грамадзкасьцю іншых дэмакратычных народаў; д/. актыўна садзейнічаў пераадоленьню вуніяцкага крывіцызму ў шэрагах беларускага вызвольніцкага руху; е/. надаў беларускай моладзі перакананьня і веры ў сілу еднасьці ў справах грамадзкай дзейнасьці.

Поруч з гэтымі дасягненьнямі і посьпехамі за апошнія часы ў Беларускім маладзёжным руху азначыліся паважныя недахопы і хібы: а/. вымушанае ўмовамі часу, неабходнае і таму дачасна правідловае пераключэньне маладзёжнага руху з Саюзу Беларускай Моладзі на Скаўтынг і УМСА зьбіла беларускі маладзёжны рух арганізацыйна і ідэйна на шлях шкоднага для паняволенага народу інтэрнацыяналізму, які падпарадкуе яго пануючым нацыям, і паставіла беларускі маладзёжны рух пад пагрозу адрыву яго ад нацыянальна-беларускіх заданьняў і пазбавіла яго здольнасьці выхаваньня беларускай моладзі ў духу нацыянальна-беларускага патрыятызму, ідзі сувэрэннасьці свайго народу і веры ў свае ўласныя сілы; б/. гэтае пераключэньне заблытала беларускі маладзёжны рух маральна і палітычна ў супярэчнасьці, якая выражаецца ў супярэчнасьці, якая выражаецца ў супярэчнасьці між нацыянальна-патрыятычным дэвізам “Бог і Бацькаўшчына” і інтэрнацыяналістскім пастулятам “Скаўт скаўту — брат”, а гэта апошні ў сваю чаргу пазбаўляе беларускую моладзь пачуцьця розьніцы між моладзьдзю дэмакратычных народаў і моладзьдзю, якая выхоўваецца ў духу імпэрыялістычнага, калянізатарскага і анэксіяністскага захопніцтва Беларусі і частак яе тэрыторыі, словам розьніцы між прыхільнікамі і праціўнікамі Беларускай нацыянальна-дзяржаўніцкай незалежнасьці; в/. пад узьдзеяньнем скаўцкага інтэрнацыяналістычнага выхаваньня ўнутры беларускага маладзёжнага руху яскрава азначылася тэндэнцыя адрыву беларускай моладзі ад беларускага

вызвольніцкага змаганьня, што знайшло сваё выражэньне ў нясьведамым спачуваньні і прызнаньні часткаю беларускай моладзі адчынена варожай прапаганды выслабаненьня беларускага маладзёжнага руху ад ідэйнага і арганізацыйнага ўплыву і кіраўніцтва з боку беларускага старэйшага пакаленьня, што ў істоце азначае імкненьне адарваць беларускую моладзь ад мінуўшчыны беларускага народу, ад выхаваньня яе на беларускай гісторыі і пазбавіць беларускую моладзь здольнасьці да пераняцьця традыцыяў мінулай і сучаснай вызвольніцкай барацьбы беларускага народу, а разам пазбавіць сучасную моладзь магчымасьці передачы гэтых традыцыяў пазьнейшаму пакаленьню моладзі і такім чынам прадаць забыцьцю ўсю мінуўшчыну беларускага народу і бацькаўшчыны; г/. выхаваньне моладзі праз Скаўтынг і УМСА набывае характар пераважна дзіцячай забавы і гульні з вонкавай прыродай і любаваньня адцягненай ад жыцьця так званай агульначалавечай маральлю, а падчас цягне моладзь на шлях прыключэнчаскага авантурызму і разьвівае элемэнт крывадушша і гэтым умысна, ці нясьведама адгароджвае беларускую моладзь ад заданьняў грамадзкага яе выхаваньня і тым пагражае зрабіць беларускі маладзёжны рух няздольным да выхаваньня з асяродзьдзя беларускай моладзі нацыянальна-беларускіх дзеячоў і кіраўнікоў змаганьня беларускага народу за сваю нацыянальную і сацыяльную вольнасьць; д/. у выніку частка актыву беларускай моладзі адыйшла ад удзелу ў маладзёжным руху ў ягоных сучасных формах, а значыць наагул ад удзелу ў Беларускім маладзёжным руху; е/. урэшце пазбаўленьне эміграцыйнай моладзі магчымасьці гуртавацца навет у скаўцкія, значыць фармальна-нацыянальныя аб'еднаньні ў краінах часовага эміграцыйнага пасяленьня пазбаўляе беларускую моладзь усякай формы арганізацыі. Усё гэта пагражае спыненьнем наогул Беларускага маладзёжнага руху ў агульным вызвольніцкім змаганьні беларускага народу.

У сучасны пэрыяд упартага і вырашальнага змаганьня Беларускага народу за сваю нацыянальную і сацыяльную вольнасьць задачамі зьяўляюцца: па-першае, захаваньне і замацаваньне арганізацыйнай еднасьці Беларускай моладзі і, па-другое, перабудаваньне беларускага маладзёжнага руху ў такім напрамку, каб зрабіць яго складовай часткай агульнага фронту вызвольніцкай барацьбы беларускага народу, значыць у напрамку выхаваньня беларускай моладзі ў духу

нацыянальна-беларускага патрыятызму, пераняцьця моладзьдзю традыцыяў вызвольніцкага змаганьня беларускага народу, авалодваньня ёю заданьнямі, формамі і мэтадамі гэтай барацьбы, прывіцьця моладзі высокіх маральных якасьцяў дзеяньня на дабро і карысьць для свайго народу, самаахвярнасьці ў барацьбе за ягоную вольнасьць, уменьня адрозьніваць праціўнікаў ад прыхільнікаў беларускага народу ў ягонай вызвольніцкай барацьбе.

Толькі выхаваная ў такім духу беларуская моладзь здольна быць сапраўдным змагаром за беларускую справу, выгадоўваць у сабе кадры арганізатараў і кіраўнікоў беларускай вызвольнай барацьбы і служыць крыніцай для папаўненьня шэрагаў партыі.

Выпаўненьне гэтых заданьняў апіраецца на дасягненьні і посьпехі, якія зрабіў Беларускі маладзёжны рух за дзесяцігодзьдзе, на здаровыя якасьці і высокія здольнасьці беларускай моладзі, набытыя ёю ў гэтым маладзёжным руху.

Выходзячы з усяго гэтага Цэнтральны Камітэт Беларускай Незалежніцкай Партыі пастанаўляе:

1/. Поруч з Беларускім Скаўтынгам, існаваньне і дзейнасьць якога застаецца і надалей патрэбнай, лічыць неабходным утварыць Беларускі Саюз Моладзі, прызнаючы яго асноўнай формай беларускага маладзёжнага руху.

2/. Прапанаваць сябрам і арганізацыям партыі — у мясцох іхняй дзейнасьці неадкладна распачаць працу па ўтварэньню адзьдзелаў Беларускага Саюзу Моладзі, узгадняючы пытаньне з іншымі беларускімі партыйнымі і з грамадзкімі арганізацыямі і ажыцьцяўляючы кіраўніцтва Саюзам.

3/. Лічыць неабходным, каб сябры Беларускага Саюзу Моладзі ўваходзілі адначасна ў арганізацыі скаўтынгу і накіроўвалі ягоную выхаваўчую і ўзгадаваўчую дзейнасьць у напрамку выкананьня агульных заданьняў Беларускага маладзёжнага руху.

4/. Прызначэньне асобы на Галоўнага Кіраўніка Беларускага Саюзу Моладзі ўзгадніць з цэнтральнымі органамі іншых беларускіх партыяў, і прызначэньне асобаў на Краінных Галоўных Кіраўнікоў Саюзу даручыць краёвым кіраўнікам партыі, якім узгадніць пытаньне з мясцовымі арганізацыямі іншых беларускіх партыяў.

5/. Даручыць сябру Сокалу ў найхутчэйшым часе апрацаваць праект Статуту Беларускага Саюзу Моладзі з тым, каб к дню 25 сакавіка ўзгадніць, зацьвердзіць і разаслаць яго ўсім мясцовым і краінным кіраўнікам і арганізацыям партыі. У

адносінах асобных статутных устанаўленьняў лічыць мэтазгодным: а/. ва ўнутраным будаўніцтве Саюзу ўстанавіць прынцып цэнтралізму; б/. сяброўскія ўнёскі не павінны перавышаць аднаго працанту ўсіх прыбыткаў сябры Саюзу; в/. сьцягам Саюзу і ягоных адзьдзелаў мусіць быць толькі нацыянальна-беларускі бел-чырвона-белы сьцяг з надпісам БСМ і эмблемай адзьдзелу Саюзу; г/. яскрава азначыць зьдзейсьненьне нацыянальна-дзяржаўнай незалежнасьці Беларусі і сацыяльнай вольнасьці Беларускага народу як мэты існаваньня і дзейнасьці Саюзу.
6/. Зьместам выхаваньня ў шэрагах Саюзу павінна стаць: а/. нацыянальна-патрыятычнае выхаваньне моладзі і на гістарычнай мінуўшчыне, гісторыі і героіцы вызвольніцкага змаганьня беларускагша народу, беларускай прыродзе і сучасным змаганьні; б/. нацыянальна-культурная асьвета і творчасьць /літаратурная, музычная, мастацкая, тэатральная, прыродаведчая і г. д./; в/. грамадзкае, сацыяльнае, дзяржаўнае і вайсковае выхаваньне моладзі; г/. маладзёжныя забавы і гульні з шырокім скарыстаньнем матэрыялу скаўтынгу. Адначасна лічыць карысным разьвіцьцё свабоднай ініцыятывы моладзі ў справе формаў і мэтадаў выхаваўчай працы.
7/. Лічыць патрэбным стварэньне культурных асяродзьдзяў Саюзу і мэтазгодным выданьне саюзных органаў друку.
8/. Існаваньне і дзейнасьць адзьдзелаў Беларускага Саюзу Моладзі можа быць легальным, або нелегальным у залежнасьці ад мясцовых умоваў.

Пункт чацьверты. Па гэтаму пытаньню пастаноўлена:
1/. Прыняць збройны ўдзел у барацьбе супроць СССР на выпадак вайны як апоры камунізма і расейскага імпэрыялізма.
2/. Дабіцца ад аліянтаў прызнаць часовы эміграцыйны ўрад, а Беларусь за самастойную дзяржаву, часова акупованую праз СССР.
3/. Дабіцца перадачы палонных беларусаў у рукі беларускага тымчасовага ўраду.
4/. З прыходам на Беларусь стварыць збройныя сілы.
5/. Фармавацца ў тых краінах, дзе засьцігне вайна.
6/. Уступаць у Беларускі Саюз Вайскоўцаў, як адзіную форму вайсковае арганізацыі.
7/. Здабываць вайсковую асьвету.

8/. Узяць на ўчот усіх вайскоўцаў — сяброў БНП.
9/. Выдаць як найхутчэй страявы статут.
10/. БНП палітычна прызнае БЦР як адзіны адказны беларускі орган якому павінна падпарадкавацца ў збройным змаганьні.

Пункт пяты. Сябра Сокал сказаў, што на першае арганізацыйнае паседжаньне БМКК ад ЦК БНП ніхто ня быў афіцыяльна дэлегованы, аднак мясцовыя сябры партыі Ігар Шчорс і М. Сяднёў прымалі ўдзел у працы зьезду. Пасьля ад ЦК БНП быў вызначаны як сталы дэлегат на паседжаньні БМКК М. Зуй, які, ня здаўшы нікому справаздачы з свае там дзейнасьці, выехаў у Аўстралію. БМКК асабліваe дзейнасьці не праяўляў і ня гледзячы на тое, што на зьезьдзе было пастаноўлена, што паседжаньні будуць адбывацца кожны месяц, усё-ж, як з усяго было відаць, калі яны і адбываліся, дык вельмі нерэгулярна.
Пастанова: 1/. Ад Беларускай Незалежніцкай Партыі дэлегаваць у БМКК як сталага прадстаўніка Ігара Шчорса.
Апошнім часам далося заўважыць, што ў газэце “Беларускае Слова” друкуецца слабы і мала ідэйны матэрыял і ёсьць поўным, што з фінансавых недахопаў журналістычных сілаў, яно будзе змушана ў хуткім часе спыніць свой далейшы выхад з гэтай прычыны была прынята наступная пастанова:
1/. Газэту “Беларускае слова” перанесьлі ў ЗША, як працяг з Нямеччыны.

Пункт шосты. Сп. Явар сказаў, што калі будзе вывезены лягер — яшчэ ня ведама, аднак ужо зроблены стараньні, каб беларусаў не расьцярушвалі па розных лягерох, а перавязьлі адзінаю маналітнаю масаю ў новы асяродак.

Пункт сёмы.
1/. На тэхнічнага сакратара ЦК быў пакліканы Крапіва.
2/. Чарговае паседжаньне ЦК мае адбыцца да 31. 1. 50 г.
3/. Сабраць матэрыялы і як найхутчэй выдаць партыйны нумар.
4/. На 25 Сакавіка паслаць ад ЦК БНП прывітаньні ва ўсе краіны, дзе ёсьць беларускія арганізацыі. У дакладзе трэба дакладна падаць сапраўдны акт 25 сакавіка і ўстаноўчую грамату з 9 сакавіка 1918 г.
Сакратар

**CENTRALNY KAMITET BIELARUSKAJ NIEZALEZNICKAJ PARTYI**

# А Д О З В А

**Цэнтральнага Камітэту Беларускай Незалежніцкай Партыі**

**да ўсіх сяброў БНП, грамадзкасьці й моладзі.**

Дарагія сябры, грамадзяне й моладзь!

Беларуская Незалежніцкая Партыя, стаючы на варце беларускага нацыянальнага гонару й выступаючы за кансалідацыю ўсіх актыўных беларускіх сілаў для супольнага змаганьня за вызваленьне Беларусі з пад бальшавіцкага панаваньня й здабыцьця Яе незалежнасьці, з пільнай увагай сочыць за дзейнасьцяй тых ці іншых палітычных групаў, шукаючы з імі сувязі, супрацоўнічаючы з імі, або змагаючыся супроць іх, калі яны дзейнічаюць на шкоду беларускаму вызвольнаму руху, або, калі яны паніжаюць беларускі нацыянальны гонар.

Не тэорэтычнымі разважаньнямі, а штодзённай упорыстай працай, БНП рашуча й бязупынна йдзе да свае мэты — вызваленьня Беларусі аб бальшавіцкае тыраніі.

Калі на палітычнай беларускай арэне выплываюць нейкія непаразуменьні, Беларуская Незалежніцкая Партыя выразна й рашуча займае сваё становішча, кляйміць, у разе патрэбы, ворага ды дае ясны погляд на актуальныя балючыя справы.

Выпускаючы гэтую адозву, ЦК БНП хоча насьветліць становішча ў справе "звароту", выданага ў Лянгэнфэльдзе дня 18 лютага г. г. былым начальнікам Галоўнага Штабу Беларускага Вызвольнага Руху — Людвікам Зарэчным.

Тэма гэтая ёсьць сягодня патолькі актуальныя, паколькі яе распрапагандоўвае сваімі "зваротамі" Л. Зарэчны.

З незалежных ад нас прычынаў, мы, разам з выбранай беларускім народам Беларускай Цэнтральнай Радай на чале з яе Прэзыдэнтам праф. Р. Астроўскім, змушаны былі пакінуць нашую Бацькаўшчыну, расцярушыўшыся пасьля па ўсяму сьвету.

На зьмену Гітляроўскае акупацыі прыйшла акупацыя бальшавіцкая; але, ня гледзячы на крывавы бальшавіцкі тэрор, беларускі народ не паддаўся. Пад кіраўніцтвам Беларускай Незалежніцкай Партыі ён стварыў на Бацькаўшчыне беларускае Краёвае Войска, якім камандуе адзін з лідараў БНП — генерал Вітушка. Войска гэтае адкрыта

й падпольна, але бязупынна й рашуча змагаецца ўсімі даступнымі яму срэдствамі супроць бальшавіцкай тыраніі.
У гэтым змаганьні на Бацькаўшчыне мы йдзем шчыльнымі радамі з Украінскай Паўстанчай Арміяй, з паўстанцамі Літвы, Латвіі, Эстоніі, Югаславіі, Румыніі ды іншымі паняволенымі народамі.
Наш народ на Бацькаўшчыне, сцэментаваны БНП ў адну дружную сямью, ускладае на нас — беларускую палітычную эміграцыю — вялікія заданьні. Ён заклікае сваіх братоў на чужыне згуртавацца таксама ў адну цесную сямью, каб лягчэй было выканаць свой абавязак перад Бацькаўшчынай.
Заданьні-ж нашыя наступныя:
1. годна рэпрэзэнтаваць свой народ перад вольным Захадам,
2. правільна й усебакова насьвятліць нядолю беларускага народу,
3. бязьлітасна кляйміць камуністычную тыранію,
4. усімі сіламі старацца атрымаць ня толькі маральнае, але й практычнае падтрыманьне, вольнага пакуль што, дэмакратычнага сьвету для рэалізацыі ідэі вызваленьня паняволеных бальшавікамі народаў.
Нашым легітымным рэпрэзантацыйным цэнтрам ёсьць Беларуская Цэнтральная Рада на чале з яе Прэзыдэнтам — вялікім і заслужаным беларускім патрыётам — праф. Радаславам Астроўскім.
Нажаль, сярод нашае эміграцыі знайходзяцца людзі, якія, дзякуючы ці то сваёй хвараблівай амбіцыі, ці то з нейкіх іншых меркаваньняў, ня хочуць падпарадкавацца гэтаму адзінаму легітымнаму прадстаўніцтву, выбранаму ўсім беларускім народам. Яны разьбіваюць згодную беларускую сям'ю і гэтым дзеюць супроць інтарэсаў беларускага народу.
Апошнімі часамі такой разьбівальніцкай і шкоднай для беларускае справы працаю заняўся хворы, відаць, на "фюрэрства" /а можа й на што горшае?/ Зарэчны.
Паявіўся ён з нябыцця ў 1952 годзе. БНП з радасьцяй вітала стварэньне братняй вайсковай арганізацыі ды ўсюды даручала сваім сябром супрацоўнічаць і падтрымліваць БВР, аднак, да асобы Зарэчнага БНП ставілася з засьцярогаю з прычыны ягоных кардынальных памылак у працы.
Апошняе-ж яго выступленьне з сваім пунктам 4-тым "звароту", дзе ён заклікае стварыць новы незалежны палітычна-вайсковы цэнтр, ёсьць акцыяй антыграмадзкай, накіраванай на разьбіцьцё беларускае грамады, аб'яднанае

навакол легітымнага беларускага палітычнага цэнтру, выбранага ў 1944 г. на Бацькаўшчыне 2-гім Усебеларускім Кангрэсам.
Апрача таго, увесь “зварот” Зарэчнага выразна сьведчыць аб ём, як аб асобе неэтычнай і непачытальнай, якой справы асабістыя бліжэйшыя ад спраў беларускіх.
Дарагія сябры, грамадзяне й Вы, маладыя Арляняты!
Да Вас, да Вашага нацыянальнага, нясплямленага сумленьня зварочваемся мы — старыя змагары за лепшую долю нашае Бацькаўшчыны.
Вы, маладыя Арляняты, падняліся высока да сонца, хочучы здабыць Волю, Незалежнасьць і Шчасьце для беларускага народу! Дык не пазвольце зламаць Вашыя маладыя крыльлі! Не дайце сябе ашукаць розным лжэ-патрыётам і дэмагогам, якія сваё нацыянальнае сумленьне або “прапілі”, або яго зусім ня мелі!
Чын Зарэчнага мы выразна й рашуча асуджваем і кляймім як варожую дзейгнасьць супроць адзінства нашага народу!
Партыйныя сябры замежжа!
Трымайце моцна сьцяг незалежнасьці, сьцяг гонару свайго народу ў сваіх моцных руках!
Памятайце, што Вы зьяўляецца найлепшымі беларускімі сынамі, якія ў цяжкіх умовах складалі і цяпер складаеце на Бацькаўшчыне экзамен вернасьці беларускаму народу!
Памятайце, што наш шлях на Беларусь вядзе праз змаганьне, ахвярнасьць ды — перадусім — праз еднасьць!
Проч з разбівальніцкай палітыкай!
Дзе-б Вы ня былі, супроцьдзейнічайце акцыі варожых элемэнтаў сярод беларусаў, не дапушчайце да паслабленьня нацыянальнага антыбальшавіцкага фронту, не давайце разьбіваць нацыянальную еднасьць ды сьмела кляйміце ворага!
На Вас ляжыць абавязак стаяць на варце інтарэсаў беларускага народу!
Гуртуйцеся навакол Партыі ды пашырайце яе ідэю, бо-ж ідэя Беларускай Незалежніцкай Партыі — ідэя Народу!

Сакавік 1954 г. Кіраўнік
ЦК БНП.
Нямеччына. /
замежны сэктар / Каршун

**ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ**
**БЕЛАРУСКАЙ НЕЗАЛЕЖНІЦКАЙ**
**ПАРТЫІ**
дня 25 ліпеня 1954 г.
№ 175/54/V.

Галоўнай Управе
Хрысьціянскага Аб’еднаньня
Беларускіх Работнікаў у Вялікай
Брытаніі —

Старшыні Галоўнай Управы
Гасп. Сураваму Барысу - Лёндан.

Дарагія Суродзічы!
Цэнтральны Камітэт Беларускай Незалежніцкай Парыі запазнаўся з Вашымі здаровымі і патрыятычнымі думкамі, якія былі надрукованы ў Вашым месячніку “Аб’еднаньне” № 1 (50) за чэрвень 1954 г. Шчыра іх падтрымоўвае і цешыцца, што Вы і надалей можна трымаецеся вызначанага воляй нашага народу нацыянальнага кірунку, шчыльнай грамадой падтрымоўваеце Беларускую Цэнтральную Раду, як адзінае легітымнае Прадстаўніцтва Сувэрэнных Правоў Беларускага Народу і Краю, на чале зь яе Прэзыдэнтам Праф. Р. Астроўскага.
У сучасны момант мы ўсе перажываем цяжкія хвіліны, выклікаактыя паўсталым закалотам у радох БЦР, які змусіў Прэзыдэнта БЦР з дн. 1-га чэрвеня г. г. злажыць на рукі Прэзыдыюма БЦР свае ўпаўнаважаньня і абавязкі Прэзыдэнта БЦР і гэтым змусіць Прэзыдыюм БЦР склікаць 14-ты Пленум БЦР.
У гэту хвіліну, калі на парадку дня 14-га Пленуму БЦР, які маецца адбыцца 4-га верасьня 1954-га г., стаіць выбар Прэзыдэнта Беларускай Цэнтральнай Рады, мы павінны выказаць сваю поўную палітычную дасьпеласьць і задэманстраваць перад Вольным Захадам сваё нацыянальнае адзінства і сілу. Мы павінны ў гэтым выпадку выказаць максімум зразуменьня, ахвярнасьці і добрае волі.
Наш народ на Бацькаўшчыне ня можа свабодна выказацца, аднак даў нам правы выказаць яго волю. На 14-тым Пленуме БЦР мы павінны задэманстраваць гэту волю выказаную праз

вусны дэлегатаў II-га Усебеларускага Кангрэсу і аднадумна перавыбраць на Прэзыдэнта БЦР — Праф. Р. Астроўскага.
Наш Беларускі актыў, сябры БЦР ў Амэрыцы, павінны правесьці супольныя перадпленарныя нарады, адкінуць па гэтаму пытаньню ўсе спрэчнасьці і на 14-тым Пленуму задэманстраваць перад усім Сьветам наш адзіны нацыянальны фронт, аб'еднаны вакол БЦР. Мы, сваімі рэзалюцыямі і пастановамі перасланымі на рукі Прэзыдыюму і Калегіі БЦР, выкажам і нашу волю, што мы не жадаем іншага Прэзыдэнта, а толькі Праф. Р. Астроўскага, якога мы падтрымоўваем у ягонай працы для дабра нашага народу.
Недапушчаючы да публічнага разнабою на 14-тым Пленуме, а скансалідаваўшы свае сілы ў адзіны фронт аб'еднаны навокал БЦР мы не дапусьцім да развалу БЦР і павінны выйсьці з гэтага закалоту не аслабленымі, а ўзмацованымі для дабра агульнай справы.

З шчырым прывітаньнем —

Ж Ы В Е Б Е Л А Р У С Ь !

За Цэнтральны Камітэт
Беларускай Незалежніцкай Партыі —
Каршун
Кіраўнік Партыі.
(Замежны Сэктар)

Адрас:
Дзімітры Касмовіч,
Stuttgart, Bad Cannstat,
Steinhaldenfeld,
Zuckerbergstr. 125 / 11.
Germany.

**Цэнтральны Камітэт**
**Беларускай Незалежніцкай**
**Партыі**
дня 27 ліпеня 1954 году.
№ 198/ 54.

## Да ўсіх краёвых прадстаўнікоў БНП, сяброў партыі і да ўсяе беларускай эміграцыі.

У сувязі з непаразуменьнем у радох Беларускай Цэнтральнай Радзе, а таксама з прычыны абдыкацыі Прэзыдэнта БЦР, Праф. Р. Астроўскага, беларуская эміграцыя перажывае цяжкі крызіс.

Дня 4-га верасьня г. г. у Саўтс Рівэр /СШПА/ зьбіраецца гістарычны 14-ты пленум БЦР, на парадку дня якога стаіць выбар Прэзыдэнта Беларускай Цэнтральнай Рады.

На гэтым 14-тым пленуме БЦР мы павінны задэманстраваць перад усім сьветам народную волю, выказаную праз вусны дэлегатаў 2-га Усебеларускага Кангрэсу ды аднадумна перавыбраць Прэзыдэнтам Беларускай Цэнтральнай Рады — Праф. Р. Астроўскага.

Усе нашыя нутраныя непаразуменьні мы зможам вырашыць пасьля дэмакратычным шляхам, а ў гэтым выпадку мы павінны адкінуць усе нашыя спрэчкі, выказаць найбольш зразуменьня, ахвярнасьці і добрае волі.

Недапушчаючы да публічнага разнабою на 14-тым пленуме, а скансалідаваўшы свае сілы ў адзіным нацыянальным фронце, аб’яднаным навакал БЦР, мы не дапусьцім да развалу БЦР, а выйдзем з гэтага закалоту не аслабленымі, а ўзмоцненымі для дабра агульнае справы.

У сувязі з вышэйшым, даручаецца ўсім Краёвым Прадстаўнікам Беларускай Незалежніцкай Партыі надалей праводзіць сярод беларускай эміграцыі найшырэйшую кансалідацыйную акцыю, абнятую інструкцыямі Цэнтральнага Камітэту Б. Н. П., разасланымі да ўсіх Краёвых Прадстаўнікоў Беларускай Незалежніцкай Партыі.

Ж Ы В Е   Б Е Л А Р У С Ь !

За Цэнтральны Камітэт Беларускай Незалежніцкай Партыі:
/ - / К а р ш у н
Нямеччына. Кіраўнік Замежнага Сэктару Б. Н. П.

## ДА СУМЛЕНЬНЯ

Мінула ўжо 10 год, як новая беларуская эміграцыя, пад прымусам чырвонай небясьпекі, пакінула свой родны край. Мы ўсе памятаем, аднак, дакладна які шырокі нацыянальны ўздым агарнуў усю Беларусь пасьля яе вызваленьня з пад бальшавіцкага зьдзеку. Усе мы тады кінуліся на адбудову свае бацькаўшчыны. Кожнаму, хто хацеў ды чуўся беларусам, хапала працы. Усе працавалі згодна і карысна. Кожны-ж хацеў даць для свайго народу і свайго краю як мага найбольш і як мага найлепш.

Праца была цяжкая, бо добрыя і шчырыя пачынаньні беларускай інтэлігенцыі, беларускага актыву і ўсяго беларускага народу чужацкая ўлада тармазіла, хочучы іх выкарыстаць у іншым напрамку. Аднак, ня гледзячы на гэта, беларускі актыў самааддана вырываў для адбудовы свае бацькаўшчыны усё, што мог і як мог.

Па ўсяму краю — ад Бранску да Берасьця і ад Пскоўшчыны да Чарнігаўшчыны ўзварухнуўся беларускі народ, разгарэлася ў беларускіх сэрцах нацыянальнае полымя, разгарнулася шырокая культурна-асьветная, грамадзка-нацыянальная ды рэлігійная праца.

У далёкім Бранску трох адважных беларускіх змагароў: Астроўскі, Вітушка і Касмовіч патрапілі ў кароткі час разбудзіць беларускія сэрцы ды дадаць ім упэўненасьць і веру ў лепшую будучыню.

Прыгожы старадаўні манумэнт — Смаленскі праваслаўны Сабор — пасьля шматгадовае паняверкі ізноў атрымаў свайго архіпастара — Епіскапа Сьцяпана (Сеўбо). На пячатках Смаленскае акругі ізноў закрасавалі старыя беларускія напісы.

У пасівеўшым старэнькім Полацку ізноў адазваліся гістарычныя званы з царквы Сьв. Еўфрасіньні Полацкай.

Каля прыгожага Гомельскага замку пачала зьбірацца ізноў беларуская моладзь, пачуліся прыгожыя беларускія мэлёдыі.

У слаўным старадаўным Віцебску, дзякуючы нястомнай самаахвярнай працы Усевалода Родзькі і Міхася Рагулі, шырока разгарнулася беларуская нацыянальная праца ў усіх кірунках.
Разьбітая і спаленая вайною Орша, ня гледзячы на цяжкія страты, не заставалася ў хвасьце нацыянальнае адбудовы.
Не мала заслуг і працы палажылі г.г. С. Станкевіч, Барыс Шчорс і Іван Наронскі ў старым беларускім горадзе — Барысаве, заснаваным у XII стагодзьдзі Полацкім князем Барысам, сынам Усяслава Чарадзея. Горад гэты, які гасьціў у 1708 годзе Швэдзкага караля Карла 12-га, а ў 1812 годзе Напалеона, сыграўшы яму хаўтурны марш, не адступіў у нацыянальна- культурным жыцьці ад іншых беларускіх гарадоў.
Здушаныя, нацыянальна і культурна зьнішчаныя польскімі акупацыйнымі ўладамі, гарады: Нясьвіж — сьведка россквіту і заняпаду беларускай сьведамасьці, Баранавічы, Стоўпцы, Навагрудак, Горадня, Берасьце, Слуцак, Пінск, Беласток, Слонім ды шмат, шмат іншых беларускіх гарадоў раптам расцьвілі і зазьзялі сваім поўным нацыянальным хараством.
Старадаўняя Вільня, якая ня раз бачыла веліч і славу свае бацькаўшчыны, ня гледзячы на цяжкія ўмовы, зноў ажыла ў згодным літоўска-беларускім высілку.
На чале-ж усіх гарадоў, даючы ім прыклад, сілу і веру ў лепшую будучыню, стаяў сталічны горад МЕНСК — збамбардаваны, спалены амаль дашчэнту, але моцны, пэўны і непераможны ў сваім беларускім духу.
Тут сабраліся найлепшыя беларускія духовыя, культурна-мастацкія і нацыянальныя сілы.
Тут сваімі духовымі і рэлігійнымі словамі, поўнымі гарачае любові да бацькаўшчыны, Архіепіскап Магілёўскі і Мсьціслаўскі — Філафей прызываў да любові, самаадданасьці і вернасьці веры сваіх дзядоў, да рэлігійнага і нацыянальнага беларускага жыцьця. Тут час ад часу, у Менскіх сьвятынях маліўся таксама і беларускі Епіскап Афанасі. Сюды заглядаў часам з далёкае Варшавы і Др. М. Шчорс ды іншыя беларускія нацыянальна-палітычныя дзеячы.
Беларуская опэра і тэатр сваімі мілагучнымі творамі: “Кветка Шчасьця”, “Лясное Возера”, “Купальле” ды іншымі выяўлялі хараство і багацьце беларускай душы...
Ня стрымаў гэтага нацыянальнага ўздыму ані бальшавіцкі тэрор, ахвярай якога палі праф. В. Іваноўскі, Казлоўскі ды

інш. беларускія патрыёты, ані тэрор польскіх бандаў, якія крывавымі расправамі імкнуліся спыніць беларускі адраджэнскі рух, ад кулі якіх згінулі: сябра ЦК БНП — Ю. Саковіч, судзьдзя Гуль, пісьменьнік Маракоў ды іншыя сьведамыя беларускія сілы.
Але заслабыя былі нашыя ворагі ў сваёй бязсільнай злосьці! Усе іх патугі разьбіваліся аб магутны і непераможны, беларускі вызвольны дух!
Нашая моладзь, загартаваная ў бурах і пажарах, як тыя маладыя арляняты, паднялася высока да зор — да ідэалу Незалежнасьці! Яна мела даволі патрыятычнага чуцьця, сьвядома ідучы да мэты адраджэньня свае бацькаўшчыны.
Народ наш, вуснамі гэтых маладых арлянятаў, адказваў нашым сьмяротным ворагам наступнымі словамі юнацкай песьні:

“Няхай нас ня страшаць чырвоныя каты,
Бо мы на крывавы тэрор
Паўстанем сьцяною — хлапцы і дзяўчаты,
Каб даць ім належны адпор!”

Гэты непераможны дух яшчэ гарыць у сэрцы кожнага юнака і юначкі, беларуса і беларускі, клічучы іх да чыну, да няўпыннае барацьбы за вызваленьне свае дарагое бацькаўшчыны!
Побач культурна-нацыянальнага ўздыму, разгарнулася і беларускае вайсковае змаганьне за вольнасьць і незалежнасьць Беларусі.
Найлепшы беларускі вайсковы актыў адразу зразумеў, што Вольнасьць і Незалежнасьць ніякаму народу не даюцца, а здабываюцца самім народам у змаганьні сваёю собскаю крывёю.
Тады, вось, і паўстала тайная, моцная, вайсковая арганізацыя — Беларуская Незалежніцкая Партыя, заданьнем якой было змаганьне супроць ворагаў Беларусі і беларускага народу, бяз розьніцы хто яны і адкуль яны прыходзяць.
Партыя выбрала сваёю эмблемаю Крыж Ярылы. Гэта сімвал пакуты і перамогі. Ён азначаў, што на шляху змаганьня за бацькаўшчыну патрэбна шмат цярпеньня, самаахвярнасьці і крыві, але разам з гэтым ён сьведчыць, што з намі вера, праўда і перамога!
Беларуская Незалежніцкая Партыя шырака ахапіла арганізацыйна беларускі вайсковы актыў. Ад далёкага Бранску, дзе ў густых і непраходных лясох змагаліся з бальшавіцкімі бандамі ўзброеныя аддзелы, кіраваныя сябрамі

БНП, да Берасьця і Пінску, дзе ў вязкіх балотах давалі адпор чырвонаму ворагу Беларусі бясстрашныя беларускія змагары.
Ахопленыя сеткай БНП, мужна змагаліся слаўныя жаўнеры ў Смаленшчыне, Магілёўшчыне, Наваградчыне, Віленшчыне, Беласточчыне, Піншчыне, Глыбоччыне ды іншых акругах Беларусі.
Змагаліся і складалі прысягу “змагацца, не шкадуючы жыцьця, да перамогі і вызваленьня бацькаўшчыны”.
Прысягі не зламалі, а ЦК БНП, не зважаючы на цяжкія абставіны, не пакінуў сваіх змагароў, а рэарганізаваўшы і ўмацаваўшы свае рады, вядзе і далей гэтую няроўную і цяжкую барацьбу за праўду, волю і незалежнасьць, у надзеі на падтрыманьне яе ў адпаведны час вольным некамуністычным Захадам!
Беларускае вызвольнае змаганьне дайшло, як ведама, да кульмінацыйнага пункту ў 1944 годзе, калі, на агульнае жаданьне беларускага народу, была арганізавана Беларуская Краёвая Абарона.
Кожны беларус знайшоў сабе адпаведнае месца ў гэтым шырокім вызвольным змаганьні супроць крывавага бальшавізму.
Згода і аднадумнасьць панавала сярод беларускай сям’і, аб чым найлепш сьведчаць падзеі II Усебеларускага Кангрэсу, які быў склікаты дзякуючы моцнай волі і самааданай працы Прэзыдэнта Беларускай Цэнтральнай Рады праф. Радаслава Астроўскага, пры дапамозе найлепшага беларускага актыву, які разумеў важнасьць гістарычных падзеяў.
Ня гледзячы на цяжкія ваенныя падзеі, ня гледзячы на бязупыннае бамбардаваньне, партызанскія міны ды бандыцкія засады, беларускі народ згодна і дружна цягнуўся на фурманках, пехатою ды іншымі сродкамі ў сэрца Беларусі — Менск на II-гі Усебеларускі Кангрэс. Тады ня было падзелу на “крывічоў” і “зарубежнікаў”, “заходнікаў” і “усходнікаў”, а была адна згодная сям’я беларусаў!
Як прыгожа, як прыемна, як магутна і міла было беларускаму сэрцу глядзець на згоднае прадстаўніцтва шматмільённага беларускага народу, рэпрэзэнтаванае 1039 дэлегатамі Кангрэсу, якія сабраліся з усіх канцоў Беларусі!
Панавала поўная згода, аднадумнасьць, павага, супрацоўніцтва і зразуменьне важнасьці гістарычнай хвіліны. Аднадумна была ратыфікавана народная воля мінулых

пакаленьняў да незалежнага, суверэннага дзяржаўнага жыцьця.
Але чырвоны вораг быў яшчэ моцны. Ён заліў Беларусь сваімі чырвонымі ордамі, а мы, маючы нагоду вырвацца з кіпцюроў гэтага бальшавіцкага тырана, змушаны былі вандраваць па за межы бацькаўшчыны, прыракаючы адначасна, не шкадуючы свайго жыцьця, далей працягваць барацьбу за вызваленьне свайго краю з пад бальшавіцкае навалы...
Загляньма-ж цяпер у сваё сумленьне. Ці дастойна мы выконваем свой абавязак перад народам? Ці згодны і аднадумны мы ў сваіх высілках? Ці ідзём шляхам так аднадумна вызначаным усім нашым народам?
Перадусім Вы, сябры непераможнае, здысцыплінаванае Беларускай Незалежніцкай Партыі? Вы, якія, дзякуючы сваёй энэргіі, працавітасьці і адданасьці беларускай справе, павінны заняць ключовыя пазыцыі ў беларускім эміграцыйным жыцьці і вызвольным змаганьні за Бацькаўшчыну. Ці трымаецеся Вы цесна і згодна аднэй сям'і? Ці пануе ў Вас далей разумная дысцыпліна? Ці даеце належны прыклад беларускай, расьцярушанай па ўсім сьвеце, эміграцыі? Ці не заглохла ў Вас нацыянальнае сумленьне пад уплывам розных вонкавых абставін? Ці Вы дастойна рэпрэзэнтуеце свае партыйныя ідэалы і ці ня ганьбіце чыстага, несплямленага гонару партыі?
Дык азірніцеся на свае паступкі, паслухайце голасу свайго сумленьня, а калі яно ў Вас прыстыла, ускалыхнеце яго, растапеце да белага накалу, бо яно павінна застацца такім жа чулым і адданым бацькаўшчыне, якім яно было раней, калі Вы бяз прымусу змагаліся і аддавалі сваю кроў за Беларусь. Няхай жа крыж Ярылы Вам і надалей паказвае дарогу для рэалізацыі народных ідэалаў!
А ты, пазапартыйны беларускі актыве, што ў найцяжэйшую хвіліну змаганьня за свае незалежніцкія ідэалы так спантанічна і згодна ішоў з намі нага ў ногу? Ці ты дастойна рэпрэзэнтуеш беларускую эміграцыю, ці наадварот: сваім падзелам на розныя плыні і "цэнтры" толькі дэз'арыентуеш эмігранцкія масы?
Прыпомні-ж тыя хвіліны, калі ты лятуцеў быць за межамі крывавага бальшавіцкага тэрору, каб у вольным сьвеце крычаць аб савецкім зьдзеку над нявіннымі людзьмі ды працаваць і змагацца за вызваленьне свае бацькаўшчыны!
Прыпомніце і Вы, старэйшыя сыны Беларусі, якімі гарачымі, патрыятычнымі словамі на бацькаўшчыне Вы прызывалі да

дружнае адбудовы нашага нацыянальна-дзяржаўнага жыцьця! Прызывалі да еднасьці і веры ў лепшую, шчасьлівую будучыню. Запытайце і Вы сваё сумленьне, ці і далей Вы також інтэнсыўна, адналіта, пазытыўна і карысна вядзеце сваю працу?
А Вы, беларусы, якія зышлі з простага і яснага шляху, што далі ашукацца розным "тэстамэнтовым". Азірнецеся навакол сябе, кіньце вокам у сваю душу! Ці не разьбіваеце Вы собскімі рукамі гістарычны скарб беларускага народу? Ці Вы ня бурыце тое, што самі будавалі, за што лілася кроў вашых братоў? Сваім расколам, сваімі асабістымі хваравлівымі амбіцыямі Вы ўносіце закалот і падзел беларускай эміграцыі. Дарма, што Вы прыкрываецеся сваею адданасьцяй і любоўю да бацькаўшчыны! Той, хто не шануе свае гістарычнае мінуўшчыны, не шануе пралітай крыві лепшых сыноў Беларусі, хто не шануе ўсёй цяжкай працы праробленай усім беларускім народам, той не шануе перадусім самога сябе! Няма веры такому, бо ён заўтра можа выракчыся ўсяго таго, што рабіў учора!
Запытайце сваё сумленьне ці патрэбны Вам тэстамэнты? — Не! наш народ не сканаў і... не сканае! Ён жыве, змагаецца і верыць, што прыйдзе час ягонага вызваленьня! Тады Ён, як маладая краска, ці прыгожая веснавая рунь, зазьзяе і закрасуе ў вольным сьвеце, сярод вольных народаў!
Дык адкіньма ўсялякія "тэстамэнты" і іх тварцоў, бо-ж яны вядуць не да вызваленьня, а па бездарожжу да скананьня і здрады...
Адкіньма також думку аб тварэньні нейкіх, бліжэй не акрэсьленых, "цэнтраў", якія быццам імкнуцца аб'яднаць усю беларускую эміграцыю, а ў сапраўднасьці служаць толькі для заспакаеньня хваравлівых амбіцыяў паасобных адзінак ды разьбіваюць беларускую еднасьць!
Даволі блукацца па бездарожжу, шукаючы лепшай дарогі да вызваленьня свайго краю і народу! Дарога гэтая — простая, шлях яе аднадумна і згодна вызначыў і дакладна акрэсьліў увесь беларускі народ на ІІ-гім Усебеларускім Кангрэсе!
Усе-ж тыя, што адышлі ад грамадзкага жыцьця, або адарваліся ад аднаго цэлага ды пайшлі самапасам, няхай таксама спытаюць сваё сумленьне, ці яны добра робяць, ці ня крывяць сваёю душою ды сваёю пасыўнасьцяй або абасобленасьцяй, ці ня шкодзяць беларускай справе?

Няхай жа цудоўныя званы — успаміны слаўных згодных мінулых дзён ачысьцяць і ўзмоцняць нашае нацыянальнае сумленьне ў змаганьні за вольную і незалежную Беларусь! Дык,

"Біце ў сэрцы іх — біце мячамі!
Не давайце чужынцамі быць!
Хай пачуюць, як сэрца начамі
Аб радзімай старонцы баліць!"

**Сябра БНП**

*Беларускае Слова (Зах. Нямеччына), № 6 (20), 1954 г.*

## ДАРАГІЯ ПАРТЫЙНЫЯ СЯБРЫ, УСЕ БЕЛАРУСЫ НА БАЦЬКАЎШЧЫНЕ І НА ЭМІГРАЦЫІ !

Беларуская Незалежніцкая Партыя вітае ўсіх Вас з 37-мі ўгодкамі абвяшчэньня Незалежнай Беларускай Рэспублікі.
Крывавы Бальшавіцкі тыран патаптаў нашу Вольнасьць, акупаваў нашу тэрыторыю. Аднак ідэі Незалежнасьці ён ня мог здушыць у грудзёх беларускага народу.
ДАРАГІЯ ПАРТЫЙНЫЯ СЯБРЫ НА БАЦЬКАЎШЧЫНЕ!
Хоць моцны і люты ёсьць вораг з якім Вы змагаецеся, але Ваша мэта ёсьць сьвятая. У гэтым цяжкім змаганьні Вы маеце падтрыманьне Вольнага Сьвету.
Трымайце моцна ў сваіх пэўных руках сьцяг Вольнасьці, сьцяг Незалежнасьці беларускага народу. — В Ы Т Р Ы В А Й Ц Е !
Вы-ж, дарагія сябры замежжа, гуртуйцеся навокал Партыі і памятайце аб тых абавязках, якія на Вас узлажыла Партыя.
Бязьлітасна і ўсюды змагайцеся з камунізмам. Ідзіце пэўна да сваёй мэты - зьнішчэньня бальшавізму і вызваленьня свайго шматпакутнага народу.
Хай гэты несьмяротны, жывы агонь у вашых грудзёх незгасае, хай ён разгарыцца ў вялікае полымя, якое сваёй сілай зьнішчыць грознага ворага і вызваліць з нядолі наш народ.
Слава змагарам, якія злажылі сваё жыцьцё за вызваленьне Бацькаўшчыны!
Слава гэроям і багатырам з радоў БНП, якія змагаюцца за Вольнасьць і Незалежнасьць Беларусі!

Слава ўсяму Беларускаму Народу, які ня схіліў галавы перад лютым ворагам!
ЖЫВЕ ВОЛЬНАЯ І НЕЗАЛЕЖНАЯ БЕЛАРУСЬ.

**Цэнтральны Камітэт Беларускай Незалежніцкай Партыі**

Сакавік, 1955 г.
Нямеччына.

## АД ЦК БНП

Шматлікія пісьмы, якія ў апошні час надыходзяць з усіх канцоў беларускага рассяленьня ў ЦК БНП, сьведчаць, што нацыянальнае сумленьне сяброў БНП — чыстае! Сябры БНП для справы вызваленьня свайго народу з пад бальшавіцкай тыраніі нясуць і гатовы надалей нясьці найцяжэйшыя ахвяры.
Сябры з Канады пішуць: "... нашыя канадыйскія хлапцы і дзяўчаты пэўныя і нацыянальна сьвядомыя. Яны зьяўляюцца сьмяротнымі ворагамі акупантаў Беларусі — бальшавікоў — і ў патрэбную хвіліну, аб'яднаныя і кіраваныя БНП пойдуць вызваляць Беларусь.
З далёкае Аргентыны пішуць: "Можаце на нас лічыць. Мы знаходзімся далёка ад Бацькаўшчыны, але яе нядоля — нашая нядоля, а яе шчасьце — нашае шчасьце".
Моцныя духам, кіраваныя пэўнаю рукою сябра ЦК БНП гасп. М. Зуя, сябры з Аўстраліі пішуць: "...мы гатовы на найвялікшыя ахвяры, каб здабыць вольнасьць і незалежнасьць для нашае бацькаўшчыны, у імя чаго мы ўжо пралівалі сваю кроў і аддавалі сваё жыцьцё. Няпэўнага элемэнту ў нас няма — ён адыйшоў сам. Загад Бацькаўшчыны і партыі з гонарам выканаем".
Сябры з Нямеччыны заяўляюць: "...Мы трымаем моцна ў сваіх пэўных руках сьцяг змаганьня і ня зыйдзем з шляху, вызначанага народам і партыяй, шляху, палітага крывёю найлепшых нашых сяброў. Будзем змагацца да часу, пакуль бальшавіцкі тыран ня будзе зьнішчаны, а нашая Бацькаўшчына ня будзе вольнаю і незалежнаю".
У сучасны мамэнт, калі ў адказ на гвалтоўную атаку бальшавікоў, на цэлым сьвеце адбываецца перастаноўка сілаў і ўмацаваньне антыбальшавіцкіх пазіцыяў Вольнага Сьвету, калі набліжаецца магчыма апошняя фаза дзьвух супярэчных сілаў — вольнасьці і няволі, веры і безбожжа, калі на

гарызонце гэтага змаганьня зьзяе ўжо зорка вольнасьці і незалежнасьці, мы, сябры загартаванай у баёх партыі БНП, яшчэ больш зорка павінны сачыць за міжнароднымі падзеямі. Яны вымагаюць ад нас моцнай узаемнай кансалідацыі, аб'яднаньня ды вернасьці незалежніцкім ідэалам, якім мы служым!

*Беларускае Слова (Заходняя Нямеччына), № 1-2 (23-24), студзень-люты 1955.*

KAMUNIKAT.org